Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЛЮТАГА 2008 г.
СЕРАДА
№ 23 (26136)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ва ўрадзе

Інавацыі — на максімальнай хуткасці

Сёлета ўраду неабходна забяспечыць павелічэнне валавога ўнутранага прадукту на 11 працэнтаў. «Планы напружаныя, — зазначыў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім разглядаліся вынікі рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця ў 2007 годзе і задачы па яе рэалізацыі ў 2008-м, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. — З улікам гэтага аб'екты 2008 года неабходна ўвесці не пазней, чым у 2-3-ім квартале, а работу па падрыхтоўцы аб'ектаў 2009—2010 гадоў максімальна перанесці і закончыць іх у 2008—2009 гадах». Для краіны сёння галоўная задача, лічыць Сяргей Сідорскі, — будаваць новыя прадпрыемствы, адкрываць новыя вытворчасці з тым, каб атрымліваць дадатковую прадукцыю на такіх аб'ектах.

На думку прэм'ера, ёсць усе падставы для таго, каб у наступным годзе ўжо выйсці на выкананне Дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця на 2007—2010 гады. А затым, атрымаўшы новыя магутнасці, неабходна ўзмацніць праграму новымі аб'ектамі. Размова ідзе аб прадпрыемствах перапрацоўчай, малочнай галін, аб буйных прамысловых вытворчасцях.

Паводле справаздачы старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Уладзіміра Мацюшкова, да 2010 года павінна быць узведзена 1302 аб'екты інавацыйнай праграмы, у тым ліку 173 — першага ўзроўню (новыя вытворчасці), 274 — другога (новыя вытворчасці на аснове дзеючых), 753 — трэцяга (мадэрнізацыя дзеючых вытворчасцяў). Між іншым, у пераважнай большасці праектаў будуць выкарыстоўвацца айчынныя тэхналогіі. Што датычыцца праведзенай работы летась, то ў эксплуатацыю было ўведзена 195 аб'ектаў: 20 — першага ўзроўню, 56 — другога і 119 — трэцяга. На праектную магутнасць было ўведзена 37 вытворчасцяў, асвоены 183 новыя віды навукова-тэхнічнай прадукцыі. Што важна — у ходзе рэалізацыі праграмы было створана больш за 3500 працоўных месцаў. У цэлым у рамках рэалізацыі праграмы выпушчана прадукцыі на 1 трыльён 27 мільярдаў рублёў.

Аднак у ходзе абмеркавання праграмы высветлілася, што не ўсё ідзе так гладка, як таго хацелася б. У прыватнасці, паводле даных Уладзіміра Мацюшкова, 22 запланаваныя аб'екты так і не былі ўведзены ў 2007 годзе. Агучваючы асноўныя прычыны гэтага, старшыня ДКНТ узгадаў недахопы ў фінансаванні, нізкі ўзровень распрацоўкі праектаў і іх вяртанне на дапрацоўку, працягласць працэдуры тэндараў, а таксама зрыў паставак абсталявання. У сваю чаргу Сяргей Сідорскі, улічыўшы справаздачы шэрагу кіраўнікоў міністэрстваў і ўстаноў, рэгіёнаў, заўважыў, што запланаваныя летась аб'екты можна было закрыць усе, а не шукаць прычыны пэўных недапрацовак. Ён таксама падтрымаў меркаванне Камітэта дзяржкантролю наконт таго, што адказныя асобы, якія не выконваюць свае абавязкі па канкрэтнай праграме, павінны несці за гэта адказнасць. «Калі гэта грубае невыкананне ўказаў Прэзідэнта — трэба адказваць», — зазначыў прэм'ер. Акрамя таго, ён запатрабаваў стварыць сістэму манітарынгу выканання праграмы інавацыйнага развіцця.

Акрамя таго, паводле слоў Сяргея Сідорскага, сёння вельмі важна праводзіць у краіне работу па каапэрацыі. Буйныя прадпрыемствы, напрыклад, МТЗ, Гомсельмаш, могуць перанесці частку абсталявання ў малыя і сярэднія гарады і выпускаць там дэталі, вузлы і т.п., карацей, тое, што затратна на асноўным прадпрыемстве. Такім чынам, зазначыў кіраўнік урада, будзе атрымана дабаўленая вартасць, а выдаткі, якія ёсць на буйных прадпрыемствах, будуць зніжаны, павялічыцца рэнтабельнасць прадукцыі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ці гэта люты?

Сярэднясутачная тэмпература першых дзён лютага склала каля нуля, што на 4—9 градусаў вышэй за кліматычную норму, паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У сераду чакаюцца невялікія ападкі ў выглядзе дажджу. Тэмпература паветра 1—7 цяпла. У чацвер і пятніцу пад уплывам атмасферных франтоў пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ў ноч на 7 лютага будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 0 — плюс 5 градусаў, 8 лютага на працягу сутак каля нуля.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у выхадныя пад уплывам павышанага ціску чакаецца пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да 8 марозу, а ўдзень — ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. Месцамі будзе туман.

Сяргей КУРКАЧ.

У Беларусі першая палавіна лютага, паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, чакаецца больш цёплая, чым звычайна, а другая халаднейшая.

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

Паводле яе слоў, тэмпература паветра ў цэлым за люты будзе на 1—2 градусы вышэйшая, у асноўным за кошт першай палавіны месяца.

Калі для першых дзён лютага норма — 6-7 градусаў марозу, то фактычна ў першыя чысла месяца яна была блізкая да нуля.

Такое надвор'е фарміруюць заходнія вятры, якія ўстойліва выносяць з Атлантычнага акіяна цёплае паветра. Не чакаецца рэзкіх змяненняў у характары надвор'я і на гэтым тыдні. Па-ранейшаму Атлантыка будзе адпраўляць на ўсход цыкланічныя віхры, якія будуць перашкаджаць пранікненню ў паўднёвыя шыроты холаду Арктыкі.

Уначы 9 лютага тэмпература паветра складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, днём будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Тэмпература паветра 10 лютага яшчэ крыху панізіцца. Уначы будзе ад 2 да 8 градусаў марозу, днём — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Атмасферны ціск будзе вагацца, але рэзкіх перападаў не чакаецца.

Студзень, паводле ацэнкі спецыялістаў Гідраметэацэнтра, быў таксама на 3—5 градусаў цяплейшы, чым звычайна. Колькасць ападкаў была блізкая да нормы. Толькі па захадзе Гродзенскай і Брэсцкай абласцей іх колькасць у 1-2 разы перавышала месячную норму.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

УДЗЕЛЬНІКАМІ ВЫСТАЎКІ «КНІГІ БЕЛАРУСІ-2008» БУДУЦЬ 20 КРАІН

Аб гэтым паведаміла начальнік упраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Беларусі Алена Паўлава.

Гэты кірмаш — рэкордны па колькасці краін, упершыню ў ім будуць прадстаўлены выдаўцы з Казахстана, Таджыкістана, Венесуэлы і Швейцарыі. Упершыню ўваход на выстаўку будзе бясплатны.

БЕЛТА.

СЯРОД ПАЦЯРПЕЛЫХ У ВЫНІКУ ВЫБУХУ Ў ЖЫЛЫМ ДОМЕ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ НЯМА

Аб гэтым паведамляе следчае ўпраўленне Следчага камітэта пры пракуратуры Расіі па Санкт-Пецярбургу. Раней шэраг СМІ распаўсюдзілі інфармацыю, што ў памяшканні, дзе адбыўся выбух, пражывалі рабочыя з Беларусі.

Выбух у падсобным памяшканні 10-павярховага дома прагрымеў раніцай. У выніку пацярпелі тры чалавекі, адзін з якіх ад атрыманых траўмаў памёр у бальніцы. Паводле папярэдніх даных, прычынай выбуху стала баявая наступальная граната РГЛ-5 расійскай вытворчасці, якую прынёс з сабой адзін з пацярпелых.

ЗАГІНУЛІ ТРЫ ЧАЛАВЕКІ

На трасе «Мінск — Гродна» вечарам 4 лютага пры сутыкненні «Лінкольна» з «Пежо» загінулі тры чалавекі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Аварыя адбылася на ўчастку дарогі каля вёскі Цыбары Лідскага раёна. Вадзіцель лімузіна выехаў на сустрэчную паласу. У выніку сутыкнення вадзіцелі двух транспартных сродкаў загінулі на месцы. Дачка вадзіцеля «Пежо» памерла па дарозе ў бальніцу. Трое пасажыраў лімузіна з цяжкімі траўмамі дастаўлены ў медустанову. Машына выкарыстоўвалася для абслугоўвання ўрачыстасцяў.

ГРЭЧАСКІЯ ЗАКАНАДАЎЦЫ МОДЫ ШЫЮЦЬ ШУБЫ З ГРОДЗЕНСКАЙ НОРКІ

Азёрская зверагаспадарка ПУП «Белкаапгандаль» (Гродзенскі раён) мае намер у гэтым годзе рэалізаваць каля 108 тыс. шкурак норкі, што амаль на 25 працэнтаў больш, чым у 2007-м. Прыблізная выручка прадпрыемства ад продажу футра складзе Br7 млрд. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў начальнік зверагаспадаркі Уладзімір Шышко.

У грэчаскім горадзе Касторыя, дзе працуюць з футрам ужо 700 гадоў, з гродзенскай норкі шыюць шубы і пакрывалы, якія карыстаюцца попытам. Напрыклад, у краінах ЕС норкавыя шубы (у адпаведнасці з прайсам) разыходзяцца па цане 3—3,5 тыс. еўра.

У ПАГОНІ... ЗА ЛАВАЙ ПАДСУДНЫХ?

Вось які выпадак адбыўся ў Рагачоўскім раёне. У райцэнтры хуліган забіў аднаго маладога хлопца, таварышы якога вырашылі самастойна знайсці яго і пакараць. Яны сталі дзяжурыць на дарогах, па якіх павінен быў праехаць забойца.

На досвітку «самадзейныя оперы» заўважылі на аўтамагістралі Рагачоў — Доўск аўтамабіль, які быў такі ж, як і ў злачынцы. Сумненняў у іх не ўзнікла: у ім забойца! Таму вадзіцелю далі знак спыніцца, але той ударыў па газах. Пачалася пагоня, у ходзе якой адзін з хлопцаў адкрыў агонь па аўтамабілі з пісталета, а затым і паляўнічага ружжа, пашкодзіўшы багажнік. Машына, у якой знаходзіўся малады чалавек і дзяўчына, уляцела ў Рагачоў, і вадзіцель аб усім расказаў міліцыі, і тая затрымала праследавальнікаў, якія ўсё пераблыталі. Пазней яна сама затрымала сапраўднага забойцу, а «стралок» апынуўся на лаве падсудных і быў адпраўлены ў калонію ўзмоцненага рэжыму на сем з паловай гадоў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

СМЯРОТНЫ ПРЫГАВОР ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў ВЫКАНАННЕ Ў АДНОСІНАХ ДА 3 ЛІДАРАЎ «МАРОЗАЎСКАЙ» БАНДЫ

«Смяротны прыгавор у адносінах да 3 лідараў «марозаўскай» злачыннай арганізацыі — Сяргея Марозава, Валерыя Гарбатага і Ігара Данчанкі — прыведзены ў выкананне», — паведамілі ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

КРЫЖ У БАГАЖЫ

У Нацыянальным аэрапорце «Мінск» беларускія мытнікі затрымалі партыю каштоўных прадметаў.

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, падчас афармлення рэйса «Мінск—Франкфурт» у багажы аднаго з пасажыраў, грамадзяніна Беларусі, былі знойдзены 105 калекцыйных манет. У багажы другога пасажыра, таксама нашага суайчынніка, які праходзіў праз «зялёны калідор», тым не менш быў знойдзены старадаўні царкоўны крыж.

ЗЛАВІЛІ «ЛАБІСТА»

Чарговы чыноўнік «пагарэў» на нядобрасумленным тэндары.

Паводле звестак прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры, намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама спадар Г. «прадаўся» за 18 мільёнаў рублёў аднаму таварыству з абмежаванай адказнасцю. За гэтыя грошы чыноўнік абяцаў фірме пралабіраваць кантракт на рэканструкцыю Андрэеўскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот. Намеснік старшыні райвыканкама даваў незаконныя распараджэнні дырэктару школы і старшыні тэндарнай камісіі заключыць кантракт менавіта з той фірмай, якая яго асабіста «зацікавіла». Карупцыянера злавілі ў момант атрымання хабару ў памеры 3 тысяч долараў. Гэта была першая частка «ганарару». Днямі адбыўся суд, які прыгаварыў нядобрасумленнага чыноўніка да 8 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВІДЭА ДАПАМАГЛО

Двое жыхароў в. Антанова, што пад Баранавічамі, знялі на відэа зладзеяў, якія рабавалі іх.

Міліцыянеры праглядзелі кадры і затрымалі неўзабаве рабаўніка — жыхара горада, які ўжо не раз пабываў на зоне. Відэакамера зафіксавала не толькі яго твар, але і нумар аўтамашыны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Юбілей

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Леаніда Шчамялёва з 85-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва з 85-годдзем.

«Вы ўнеслі значны ўклад у станаўленне і развіццё сучаснага выяўленчага мастацтва, узбагацілі яго яркімі мастацкімі адкрыццямі і наватарскімі рашэннямі, — гаворыцца ў віншаванні. — Дзякуючы вялікаму таленту, самаадданай працы і няспыннаму творчаму пошуку Вы ўзнялі айчынны жывапіс на новую вышыню, заваявалі аўтарытэт і прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру здароўя, жыццёвага і творчага даўгалецця, невычэрпнай энергіі, натхнення, поспехаў, дабрабыту і аптымізму.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Гучная» справа

КРАХ «КРЫМІНАЛЬНАЙ СТРАХІ»

Больш за 9 гадоў на Віцебшчыне дзейнічала злачынная арганізацыя, якой плацілі даніну дзесяткі дробных і буйных прадпрымальнікаў

Дзевяностыя гады мінулага стагоддзя на прасторах былога СССР недарэмна называюць «ліхімі». Менавіта ў той час у многіх колішніх савецкіх рэспубліках адбыўся ўсплёск злачыннасці, узніклі добра арганізаваныя крымінальныя фарміраванні, якія трымалі пад кантролем цэлыя галіны эканомікі і нават асобныя рэгіёны. Нашай краіне ўдалося пазбегнуць крымінальнага перадзелу. Аднак некаторыя разрозненыя злачынныя групоўкі, узніклыя ў «ліхія дзевяностыя», працягвалі дзейнічаць да нядаўняга часу. Напрыклад, на працягу дзесяці і больш гадоў тэрарызавалі жыхароў Гомельскай вобласці банды «пажарнікаў», «марозаўскіх», «рэчыцкіх». Лідары гэтых злачынных фарміраванняў і многія іх падначаленыя ўжо атрымалі суровыя прысуды. А неўзабаве ў судзе Віцебскай вобласці пачнуцца «судныя дні» яшчэ адной злачыннай арганізацыі: «банды Рынаса». Некаторыя падрабязнасці гэтай «гучнай» справы сталі вядомыя «Звяздзе».

(Заканчэнне на 7-стар.)

СТАРШЫНЯ КДБ ЮРЫЙ ЖАДОБІН УЗНАЧАЛІЎ БЕЛАРУСКУЮ ФЕДЭРАЦЫЮ БІЯТЛОНА

На пазачарговай выбарнай канферэнцыі 4 лютага ён прыняў гэту пасаду ў былога кіраўніка КДБ Сцяпана Сухарэнкі. Пасля ліпеньскай адстаўкі з пасады старшыні КДБ Сухарэнка папрасіў вызваліць яго і ад пасады кіраўніка беларускім біятлонам. Удзельнікі канферэнцыі аднагалосна задаволілі яго просьбу і гэтак жа аднагалосна выбралі новым шэфам Юрыя Жадобіна. Цікава, што да Сцяпана Сухарэнкі Беларускую федэрацыю біятлона таксама ўзначальвалі кіраўнікі КДБ — Уладзімір Мацкевіч (да 2002 года) і Леанід Ерын (да 2005).

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДЭПУТАТЫ РАДЫ САРВАЛІ ВЫСТУПЛЕННЕ ПРЭЗІДЭНТА І ЗАЧЫНІЛІ СПІКЕРА Ў КАБІНЕЦЕ

Пасяджэнне Вярхоўнай Рады Украіны ў аўторак так і не адбылося. Пасля ўзгадняльнага савета фракцый дэпутаты ад Партыі рэгіёнаў заблакіравалі спікера Рады Арсенія Яцэнюка ў яго ўласным кабінеце.

Затым большасць парламентарыяў пакінула зал пасяджэнняў. Раней, з раніцы, дэпутаты фракцыі Партыі рэгіёнаў заблакіравалі крэсламі прэзідыум і трыбуну Рады з патрабаваннем разгледзець пытанне аб рэферэндуме па ўступленні Украіны ў НАТА. У выніку было сарвана запланаванае выступленне прэзідэнта Віктара Юшчанкі са зваротам да парламента.

NASA АДПРАВІЛА ПЕСНЮ «БІТЛЗ» ДА ПАЛЯРНАЙ ЗОРКІ

5 лютага Сетка даследавання глыбокага космасу (DSN) адправіла ў космас песню гурта «Бітлз» «Скрозь сусвет».

«Запуск» песні прымеркаваны адразу да некалькіх юбілеяў: 40 гадоў таму была запісана песня, 45 гадоў назад — заснавана DSN, 50 гадоў таму — запушчаны першы амерыканскі спадарожнік. Акрамя таго, «Бітлз» таксама пачыналі спяваць прыкладна 50 гадоў назад. Перадача была накіравана прама на Палярную зорку, якая знаходзіцца на адлегласці 431 светлавога года ад Зямлі. Песня ў выглядзе электрамагнітнай хвалі спадарожнічае скрозь Сусвет з хуткасцю каля 300 тысяч кіламетраў за секунду.

БЫЛАЯ ЖОНКА ПРЭЗІДЭНТА ФРАНЦЫІ САРКАЗІ ВЫХОДЗІЦЬ ЗАМУЖ

Праз некалькі дзён пасля паведамлення пра вяселле прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі, стала вядома, што яго былая жонка таксама збіраецца ўзяць шлюб.

Мадам Сесілія Цыганер-Альбеніц у сакавіку збіраецца святкаваць вяселле ў Нью-Йорку са сваім каханкам — бізнэсменам Рышарам Аціясам. Каля двух гадоў таму Сесілія кінула Нікаля менавіта з-за Аціяса, французскага бізнэсмена, ураджэнца Марока і яўрэя па нацыянальнасці. Цікава, што Сарказі на пасадзе міністра ўнутраных спраў Францыі «праслаўіўся» жорсткімі дзеяннямі супраць выхадцаў з Паўночнай Афрыкі.

УКРАІНА РАСПАЧАЛА ВЫПУСК ГАРЭЛКІ Ў «СЭКСУАЛЬНАЙ» ТАРЫ

Ва Украіне Чарнігаўскі лікёра-гарэлачны завод распачаў выпуск прадукцыі ў бутэльках у форме мужчынскага дзетароднага органа.

Новую гарэлку літаральна змятаюць з прылаўкаў. Верагодна, рыхтуюцца да сустрэчы маючых хутка адбыцца святаў — Дня абаронца Айчыны і Міжнароднага жаночага дня.

У ЦІХІМ АКІЯНЕ ПЛАВАЕ ГАРА СМЕЦЦЯ ПАМЕРАМ З ДЗВЕ ТЭРЫТОРЫІ ЗША



У Ціхім акіяне неверагоднымі тэмпамі павялічваецца «суп з пластыку» — плывучая паласа смецця. Паводле слоў вучоных, на дзены момант яна ўдвая перавышае па плошчы кантынентальную частку ЗША.

Адзначым, што яшчэ ў 2004 годзе пластыкавы «востраў» важыў прыкладна тры мільёны тон і па памерах адпавядаў тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы. За апошні час вага гэтага хламу істотна павялічылася і дасягае 100 мільёнаў тон.

Старшыня Бярозаўскага райвыканкама Юрый НАРКЕВІЧ:

«ІНВЕСТЫЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ, СУЧАСНЫЯ ФЕРМЫ, СПОРАЎСКІ ФЕСТЫВАЛЬ ГУМАРУ — УСЁ ГЭТА БУДУЧЫНЯ РАЁНА»

Бярозаўскі раён знаходзіцца ў самым цэнтры Брэсцкай вобласці. Па яго тэрыторыі праходзяць найважнейшыя транспартныя артэрыі Беларусі: аўтадарога Брэст—Масква і чыгуначная магістраль Варшава—Масква. З Бярозы ў Брэст — блізка, у Мінск таксама — недалёка і дабірацца зручна. Гэта край балот і азёраў, дзе нараджаецца традыцыя праводзіць чэмпіянаты па кашэнні балота. Гэта край, адкуль узыходзіць народная творчасць і народны гумар — фестываль «Спораўскія жарты» набывае ўсё большую вядомасць у краіне. Гэты край узгадаваў шмат людзей творчых, тут Ніна Мацяш напісала сваю шчымліва-незабыўную «Калыханку маме».

70-тысячную Бярозаўшчыну можна смела называць краем працаўнікоў. Тут ёсць 16 прамысловых, 13 сельгаспрадпрыемстваў, значная частка электраэнергіі краіны выпрацоўваецца на знакамітай Бярозаўскай ДРЭС. Апошнім часам горад значна памяняў сваё аблічча пры тым, што ў ім не праводзілася ніякіх «дажынак»: ні рэспубліканскіх, ні нават абласных. Пра старажытную Бярозу ўпэўнена гавораць як пра горад, які мае будучыню. Трэці год раённую выканаўчую ўладу ў Бярозе ўзначальвае Юрый Наркевіч. З ім наша сённяшняе інтэрв'ю.

— Як вы для сябе, Юрый Іосіфавіч, вызначаеце галоўныя накірункі ў рабоце? Калі паслухаеш на абласным выканкаме: за ідэалогію і стан дарог адказвае асабіста старшыня райвыканкама. Пра сельскую гаспадарку і прамысловасць я нават не кажу. Работа школ і медыцынскіх устаноў — таксама стратэгічны вектар. Якое толькі пытанне не разглядаецца, з яго вынікае, што старшыня адказвае за ўсё: як разглядаюцца звароты грамадзян, наколькі хутка адпраўляюцца паперы ў патрэбныя інстанцыі, у якім стане аб'екты культуры...

— Гэта праўда. У рэшце рэшт старшыня райвыканкама адказвае за ўсё, што адбываецца ў раёне. А аднаму чалавеку ўсё не ахапіць. Таму задача любога кіраўніка — на першым этапе стварыць сваю каманду. Калі прыйшоў у раён, давялося памяняць і ў райвыканкаме начальнікаў асобных службаў і падраздзяленняў, некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Без гэтага не абыдзешся. Як толькі прыехаў у Бярозу з Іванава, даў зразумець усім, што сюды сабраўся надоўга, як кажуць, з сур'ёзнымі намерамі. Жыў напачатку ў гасцініцы, бо ездзіць кожны дзень за 70 кіламетраў лічу для сябе непрымальным: рана спяшаешся, вечарам таксама трэба паспець дадому. Жыў амаль год так, пакуль не атрымаў службовае жыллё...

Спадзяюся, што ў гэтым імкненні стварыць каманду аднадумцаў, людзі мяне таксама разумелі. Мы ж не выкідвалі нікога на вуліцу падчас кадравых змен, стараліся знайсці чалавеку іншую, не горшую работу.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Сфарміраваны пералік заключаемых ІП дагавораў з юрыдычнымі асобамі і іншымі ІП

Колькасць фізічных асобаў, якія прыцягваюцца да дзейнасці ІП па такіх дагаворах, не абмяжоўваецца. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве эканомікі.

Пералік дагавораў змяшчаецца ў інфармацыйным пісьме па пытанні аб прыцягненні індывідуальнымі прадпрымальнікамі фізічных асобаў па працоўных і (або) грамадзянска-прававых дагаворах, пісьмо падрыхтавана сумесна міністэрствамі юстыцыі, эканомікі і па падатках і зборах.

У дакуменце вызначана, што ІП змогуць заключаць дагаворы на аказанне ім паслуг спадарожнага характару, гэта значыць не накіраваных на непасрэднае атрыманне індывідуальным прадпрымальнікам даходу. Такімі названы паслугі па сертыфікацыі прадукцыі, дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі, абслугоўванні касавых падсумоўваючых апаратаў, пагрузцы, разгрузцы, перавозцы і транспартнай экспедыцыі. Магчыма таксама заключаць дагаворы на прадастаўленне ў арэнду гандлёвых аб'ектаў, аказанне банкаўскіх паслуг, паслуг па статыстычным дэклараванні тавараў, па ўборцы, тэхабслугоўванні (камунальныя паслугі) і (або) ахове гандлёвых аб'ектаў. У пералік уваходзяць і дагаворы на аказанне паслуг мытнага агента, аўдытарскіх і юрыдычных паслуг, а таксама паслуг па вядзенні бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці. На ўключаныя ў пералік дагаворы не распаўсюджваецца абмежаванне колькасці працуючых фізічных асобаў.

Разам з тым, падкрэслілі ў Мінэканомікі, па такіх дагаворах ІП не змогуць прыцягваць прадаўцоў магазінаў, вадзіцеляў транспартных сродкаў, работнікаў вытворчасці і іншых асобаў, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у атрыманні індывідуальным прадпрымальнікам прыбытку. У выпадку заключэння ІП грамадзянска-прававога дагавора з іншым ІП да такога дакумента прымяняюцца тыя ж правілы, што і да дагавора, заключанага індывідуальным прадпрымальнікам з юрыдычнай асобай.

БЕЛТА.

I зноў са святам!

Новы год: рыхтуем «пару мандарынаў». Віншуем усіх сабак!

Паводле ўсходняга календара, Новы год наступае на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння. Сёлета гэта надарыцца 7 лютага. Чым не нагода для святкавання?

Паводле старажытнай кітайскай легенды, кожны раз напярэдадні Новага года да людзей з пячоры выпаўзала пачвара Ніян, якая харчавалася выключна чалавечынай. Была пачвара магутнай і непераможнай, за адзін «прысесц» магла з'есці цэлую вёску, таму надыходу Новага года людзі чакалі з жахам і адчаем. А аднойчы аднекуль з'явіўся мудры стары, які не баяўся Ніяна. Ён паклікаў пачвару да сябе і прапанаваў ёй выбіраць ахвяраў сярод роўных па сіле працаўнікаў — лясных драпежнікаў, а людзей пакінуць у спакоі. Стары быў вельмі пераканальны і пачвара паслухала яго. З таго часу Ніян пераключыўся на дзікіх звяроў, якія раней нішчылі фермы, і вёскі больш не чапаў. Аднак стары, які не давяраў пачвары, перад сваім сыходам навучыў людзей рабіць чырвоныя папяровыя ліхтарыкі і напярэдадні Новага года развешваць іх на вокнах і дзвярах, каб утрымліваць Ніяна далей ад жылля (пачвара баялася чырвонага колеру). Толькі калі стары знік, людзі зразумелі, што да іх прыходзіў бог.

Паводле іншай легенды, Ніян аднойчы вынішчыў цэлы пасёлак, акрамя адной сям'і, члены якой былі апранутыя ў чырвонае, бо напярэдадні святкавалі вяселле аднаго са сваякоў. Людзі зразумелі, што пачвара баіцца чырвонага колеру, і з тых часоў сустракаюць Новы год у ярка-чырвоным адзенні, упрыгожваюць хаты чырвонымі ліхтарамі, фарбуюць чырво-

ным дзверы і вокны, развешваюць па ўсім доме спецыяльныя паштоўкі з пажаданнямі шчасця, багацця, даўгалецця, удалага шлюбу і г.д.

(Заканчэнне на 7-стар.)

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 163,11
1 латвійскі лат	4 534,23
1 літоўскі літ	915,64
1 чэшская крона	123,35
1 польскі злоты	884,85
1 расійскі рубель	87,64
1 украінская грыўня	424,64

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,5211
10 UAH	48,1042
1000 BYR	11,3965
EUR	36,3059

Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларусы змогуць атрымліваць аднаразовыя субсідыі на будаўніцтва жылля плошчай менш як 15 кв.м на чалавека

Беларусы змогуць атрымліваць аднаразовыя бязвыплатныя субсідыі для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў плошчай менш як 15 кв.м на аднаго чалавека. Адпаведнае рашэнне зацверджана пастановай Савета Міністраў № 110.

Дакументам вызначана, што атрымаць такую субсідыю змогуць грамадзяне, якія рэалізуюць права на сумеснае выкарыстанне субсідый і льготных крэдытаў. Адзінай умовай пры гэтым з'яўляецца добраахвотнае волевыяўленне гэтых грамадзян і членаў іх сем'яў, уключаных у спісы на атрыманне льготных крэдытаў, на зняцце з уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Як растлумачыла карэспандэнту БЕЛТА спецыяліст упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Наталля Станішэўская, прынятая пастанова здымае штучныя абмежаванні на прадастаўленне субсідый тым грамадзянам, якія мелі на іх права, але не маглі атрымаць у сувязі з існаваўшымі паміж нарматыўнымі актамі рознагалоссямі. Так, указам № 414 ад 7 верасня 2007 года было дазволена прадастаўляць грамадзянам ільготныя крэдыты на будаўніцтва (набыццё) жылля агульнай плошчай менш як 15 кв.м на чалавека ў тым выпадку, калі яны добраахвотна здымуцца з уліку маючых патрэбу. Аднак адносна аднаразовых субсідый прадаўжала дзейнічаць абмежаванне ў 15 кв.м — калі на аднаго чалавека была меншая плошча, субсідыя на будаўніцтва не прадастаўлялася.

«Асноўная мэта прадастаўлення дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве жылля, у тым ліку і ў форме аднаразовай субсідыі — скараціць колькасць маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — адзначыла спецыяліст. — Згодна з указам № 565 ад 29 лістапада 2005 года, маючым патрэбу прызнаецца грамадзянін, на якога прыпадае менш як 15 кв.м агульнай плошчы жылля. Прычым пры вызначэнні забяспечанасці ўлічваюцца ўсе жылыя памяшканні, якія знаходзяцца ва ўласнасці або ў карыстанні гэтага грамадзяніна ў гэтым населеным пункце».

Пастанова Савета Міністраў № 110 таксама ўрэгулявала пытанне прадастаўлення аднаразовай субсідыі грамадзянам, якія маюць ва ўласнасці або карыстанні жылыя памяшканні ў гэтым населеным пункце, а таксама калі такія жылыя памяшканні ёсць ва ўласнасці або карыстанні членаў іх сем'яў. Такім грамадзянам аднаразовая субсідыя для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў будзе прадастаўлена пры ўмове, што агульная плошча жылога памяшкання, вызначаная як сума агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія ёсць і будуюцца (набываюцца) з прыцягненнем субсідыі, складае больш як 15 кв.м на аднаго чалавека.

Уладзімір НАВУМАЎ:

«НЕ ХОЧАЦЕ ЖЫЦЬ У НАШЫМ ЗДАРОВЫМ ГРАМАДСТВЕ — НЕ ПЕРАШКАДЖАЙЦЕ ІНШЫМ!»

Міліцыя выхоўвае ўдзельнікаў дарожнага руху і актывізуе пошук злачынцаў мінулых гадоў.

У Гродзенскай вобласці ў ДТЗ загінуў супрацоўнік міліцыі разам з 7-гадовай дачкой. Міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў паведаміў, што віноўнікам гэтага здарэння стаў іншы чалавек, які парушыў правілы дарожнага руху.

5 лютага Уладзімір Навумаў браў удзел у аператыўнай нарадзе УУС Магілёўскага аблвыканкама, дзе адным з пытанняў быў стан аварыйнасці на дарогах вобласці і меры для забеспячэння бяспекі руху. У Магілёўскай вобласці ў ДТЗ летась загінула больш людзей, чым у выніку забойстваў :154 удзельнікі дарожнага руху страцілі жыццё ў аўтаварыях, а ахвярамі забойцаў стаў 151 чалавек.

— Самае крыўднае, што ўся наша праца зводзіцца да тлумачэнняў: «Паважаныя таварышы! Калі вы не хочаце жыць у нашым здаровым грамадстве, то не перашкаджайце іншым!» — сказаў магілёўскім журналістам міністр. — Вось і за апошнія суткі адбыліся такія ДТЗ, калі з-за грубага парушэння правілаў дарожнага руху вадзіцелем аўтамабіля пацярпелі ў большай меры не сам той вадзіцель, а іншыя ўдзельнікі дарожнага руху.

Уладзімір Навумаў адзначыў, што самай галоўнай часткай працы па бяспецы дарожнага руху застаецца выхаванне людзей. Ён прывёў прыклад з флікерамі: як дзеці носяць павязкі ў заплечніках, каб мець для праверкі. Нібыта вызначыць сябе на дарозе ў цемры болей патрэбна міліцыі, чым самім людзям. «Пакуль гэта будзе працягвацца — будзем мець праблемы», — сказаў Навумаў і заклікаў да супрацоўніцтва сродкі масавай інфармацыі і грамадзян.

Другое пытанне магілёўскай нарады — раскрыццё цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў мінулых гадоў.

— Так адбылося, што ў 1990-х гадах былі пэўныя складанасці, якія не дазвалялі працаваць дастаткова якасна, — прызнаў Уладзімір Навумаў. — А цяпер у нас створана падраздзяленне для раскрыцця злачынстваў мінулых гадоў. Для пацярпелых і іх сваякоў няма тэрміну даўнасці злачынстваў.

Міністр унутраных спраў паведаміў, што напрыканцы 1990-х гадоў у Бабруйску і Магілёве была ўчынена серыя згвалтаванняў, і літаральна некалькі тыдняў таму злачынства было раскрытае.

Таксама напрыканцы 1990-х — у пачатку 2000-х гадоў у рэгіёне была серыя заказных забойстваў розных пасадавых асобаў: такія злачынствы, паводле слоў Навумава, трэба абавязкова раскрываць.

Кіраўнік МУС таксама настойвае на тым, каб міліцыя не забывалася на злачынствы, якія не былі раскрыты не даўно, а летась. Напрыклад, паведаміў Уладзімір Навумаў, нядаўна быў затрыманы падазроны на гучным заказным забойстве, якое было ўчынена ў Бабруйску летась.

Ілона ІВАНОВА.

«ІНВЕСТЫЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ, СУЧАСНЫЯ ФЕРМЫ, СПАРАЎСКІ ФЕСТЫВАЛЬ ГУМАРУ — УСЁ ГЭТА БУДУЧЫНЯ РАЁНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вы кіраўнік валявы, строгі ці разважлівы, памяркоўны?

— Ва ўсякім разе крычаць і стукаць кулаком па стале — не мой метад, не кажучы ўжо пра нейкія моцныя выразы на павышаных тонах. Такіх формаў кіраўніцтва я не прымаю. Яны не на карысць справе. Памятаеце класічнае: «Юпітэр, ты злуешся, значыць, ты не маеш рацыі»? Можна зацяснуць чалавека сваім кіраўнічым аўтарытэтам, павысіць голас, але гэтым самым распішашся ў сваёй слабасці. Выходзіць, ты не змог пераканаць. А падначалены лішні раз на вочы не пакажацца, будзе старацца абыходзіць дзесятай дарогай. І гэта ва ўрон справе. Так што лепей усё-такі даводзіць думку спакойна і дзейнічаць метадам пераканання. Хоць, безумоўна, гэта цяжэй і бываюць выпадкі, калі, здаецца, хвіліна, і з сябе выйдзеш. Як было, напрыклад, з перадачай моста. У нас ёсць мост цераз Ясельду ў напрамку Івацэвічаў, які прыйшоў амаль у аварыйны стан. У раённых службаў нават тэхнікі і спецыялістаў патрэбных няма, каб аб'ект своечасова рамантаваць і ўтрымліваць. Было прынята рашэнне перадаць яго дарожнікам. А адпаведная ўстанова не захацела выдаваць на яго тэхпашпарт на той падставе, што аб'ект знаходзіцца ў водаахоўнай зоне. Акурат пра гэту тэму затрубілі ўсе сродкі інфармацыі. Колькі з імі давялося ваяваць, вы не ўяўляеце. Пытаю: «А дзе ж, па-вашаму, трэба ўзводзіць масты: з аднаго поля на другое, ці сярод лесу?» Ну, цяпер той выпадак успамінаецца як анекдот, хіба на «Спараўскія жарты» трэба прыпасці.

— Дадаць нешта накшталт таго, што з пункту гледжання шчупака, мост наогул не патрэбны, і сыдзе.

— Вось-вось. Жыццё штодзень прыносіць і гумар, і радасць, і смутак, і праблемы, якія трэба вырашаць.

— Калі ў памяці трымаеце «Спараўскія жарты», значыць, у Бярозе вы ўжо зусім свой чалавек...

— Я вельмі хутка прывык да Бярозаўшчыны, хоць заўсёды буду шанаваць Іванаўшчыну, дзе жыў і працаваў паўтара дзесятка гадоў. Але нават жонка прыкмячала, што Бярозе для мяне адразу стала сваёй. Бывала, убачу па тэлевізары, як выступае нейкі самадзейны калектыў, кажу: «Гэта ж нашы, бярозаўскія». А яна: «Бачыш, тры дні пабыў у Бярозе, і ўжо —нашы». Так сталася. Мне цікава тут працаваць.

— Як вы лічыце, што змянілася ў раёне з вашым прыходам на гэту пасаду?

— Самому сабе ацэнку даваць складана. Гэта хіба каб вы правялі экспрэс-апытанне дзе-небудзь на вуліцы ды ў людзей спыталі, тады можна было б меркаваць. Хацелася б спадзявацца, што нешта добрае вакол сябе яны ўсё ж заўважылі б. У Бярозе 30 тысяч насельніцтва, у Белаазёрску 13 тысяч, гэта таксама па велічыні — райцэнтр. А дарог, тратуараў нармальных не было ні ў адным, ні ў другім горадзе. Мы проста вымушаны былі заняцца добраўпарадкаваннем нягледзячы ні на якія фінансавыя складанасці. Першы год было асабліва цяжка, давялося звяртацца да прадпрыемстваў і арганізацый. Праводзілі так званыя «чыстыя чацвяргі», калі сядалі ў аўтобус разам з кіраўнікамі ўстаноў і «наразалі» кожнаму фронт работы: табе вось гэты ўчастак прывесці ў парадак, табе — другі, табе — іншы. Такім чынам проста прыбралі і зрабілі нейкія касметычныя паляпшэнні. На другі год стала крыху лягчэй, зарабілі нейкія грошы ў бюджэт і заасфальтавалі частку вуліц. Колькі дарожак пры гэтым праклалі, складана нават падлічыць. І прыступілі да паляпшэння цэнтральнай гарадской плошчы. Узяліся за плошчу — пасыпаліся папрокі: вы толькі цэнтр абсталёўваеце. Я тады казаў: «Людзі, у вас кароткая памяць. Паглядзіце, з чаго мы пачыналі. Квартал «Вілы» знаходзіцца практычна за гарадам, там засфальтавалі, каб свабодна пад'язджаў аўтобус, які забірае дзяцей у школу. Потым праклалі дарогу па вуліцы Лясной, гэта ў былой вайсковай часці. Спачатку зрабілі самыя праблемныя дарогі, пад'езды, а потым рухаліся да цэнтра. І цэнтр жа таксама мусіш рабіць, асабліва калі горад рыхтуецца да юбілейнай даты — 530-годдзя. Правялі, дарэчы, летам святкаванне Дня горада хораша, ярка, з кірмашом, музыкай, песнямі. Спецыяльна да гэтага дня адкрылі памятны знак у гонар Бярозы. Сціплы такі: герб горада, выява дрэва, якое дало назву. А людзі яго прынялі, гладжу, амаль кожны выхадны вясельныя карцэжы спыняюцца, маладыя фатаграфуюцца ля гэтага знака.

Зараз шмат намаганняў прыкладаем, каб адрадзіць стары парк. Яшчэ ў 2004 годзе было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў парку храма ў гонар воінаў, якія загінулі ў Афганістане. У Бярозе дыслацыраваліся вайсковыя часці, адкуль афіцэраў і салдат накіроўвалі прама на вайну. Некаторыя не вярнуліся. Афганская тэма да гэтай пары баліць вельмі многім, таму і будуецца храм. Помнік воінам-інтэрнацыяналістам ужо ёсць у парку. Тут жа з часам адкрыецца своеасаблівы музей тэхнікі пад адкрытым небам: самалёты, верталёты, БТРы, «шылкі», якія ўдзельнічалі ў ваенных дзеяннях. Ну і сам парк пры гэтым, натуральна, павінен выглядаць дастойна.

— Бярозаўскі раён займае перадавыя пазіцыі ў вобласці: найвышэйшая сярэдняя зарплата, адзіны раён, які летась выканаў усе прагнозныя паказчыкі развіцця эканомікі. Як гэтага ўдалося дасягнуць?

— Так, ёсць дзесяць асноўных паказчыкаў развіцця ўсіх галін гаспадаркі, якія трэба выконваць. Але ж працуем не дзеля паказчыкаў, а дзеля дабрабыту людзей. А клопат пра людзей — гэта магчымасць даць ім нармальную зарплату. Зарплату ж, як вядома, можа забяспечыць вытворчасць. Па аб'ёме прамысловай вытворчасці мы займаем чацвёртае месца ў вобласці пасля Брэста, Баранавічаў і Пінска. Нашу індустрыю складаюць16 прадпрыемстваў. Надышоў час, калі на старым абсталяванні, на старых тэхналогіях рухацца наперад стала амаль немагчыма. Таму на кожным прадпрыемстве распрацавана свая праграма мадэрнізацыі і тэхнічнага перааснашчэння. Дзякуючы ажыццяўленню названай праграмы за тры гады мы атрымалі 60 працэнтаў прыросту вытворчасці. Рост далі найбольш традыцыйныя вытворцы: мясакамбінат, сыркамбінат, КБМ па вытворчасці пліткі, КБВ па вытворчасці блокаў, энергамеханічны завод. Цікава, на мой погляд, і тое, што ў раёна ёсць перспектыва, з'яўляюцца новыя прадпрыемствы. У нас маецца салідная інвестыцыйная праграма, 11 яе праектаў уключаны ў праграму рэспублікі. Гэта будучае раёна.

Летась мы адкрылі новы завод «Бярозатара», які займаецца лякіраваннем і літаграфіяй бляхі, прасцей кажучы, на бляшанку наносіцца лагатып і іншая неабходная вытворцы інфармацыя. У мінулым годзе пабудаваны завод па вытворчасці сродкаў аховы раслін «Франдэса» з удзелам ізраільскага капіталу.

— Ваша «Франдэса» ужо, здаецца, паўсюль прагучала. Ці ўлягліся страсці вакол гэтага прадпрыемства?

— Так, многа коп'яў выпушчана апошнім часам у «Франдэсу». Сама назва прадукцыі — ядахімікаты, гербіцыды — насцярожвае. Але ж іх можна назваць інакш, напрыклад, лякарствы для раслін, бо нават на ўласнай дачы мех бульбы не вырасціш, каб не патравіць жука. Каб расставіць нарэшце ўсе кропкі над «і», мы правялі грамадскія слуханні на «Франдэсе», куды запрасілі самых кампетэнтных людзей: з Акадэміі навук, прадстаўнікоў экалагічных, санітарных, іншых службаў. Яны адказалі на ўсе пытанні людзей, якія прыйшлі на сход. Вытворчы працэс прадпрыемства — гэта замкнёны цыкл. Канцэнтрат у закрытых ёмістасцях прывозяць з Кітая, яго дапрацоўваюць і разліваюць па новых пасудзінах, пры гэтым няма ніякіх адходаў, нічога не трапляе нават у каналізацыю. Такую ж тэхналогію маюць аналагічныя прадпрыемствы ў Парыжы і іншых гарадах. Яшчэ да грамадскіх слуханняў праверак было праведзена шмат, усе яны прыйшлі да высновы, што санітарныя і іншыя нарматывы на гэтым прадпрыемстве захаваныя. Яго ўвод у строй — новыя рабочыя месцы, паступленні ў бюджэт.

Сёлета плануем здаць таксама два прадпрыемствы з удзелам польскага і нямецкага капіталу. Варта заўважыць, што самі яны, маю на ўвазе інвестараў, да нас не прыйшлі. Гэта вынік работы райвыканкама з грунтоўнай дапамогай аблвыканкама. Ну і інвестары бачаць, што іх тут падтрымаюць, не пакінуць сам-насам з праблемамі. А праблемы ўзнікаюць кожны дзень. Я вось вам ці не гадзіну кажу найбольш пра дасягненні. А праблем у нас не меней, нягледзячы на агульныя нядрэнныя паказчыкі.

— Якія з іх найважнейшыя?

— Напрыклад, адсутнасць сучасных малочнатварных фермаў. Па паказчыках развіцця жывёлагадоўлі раён ўваходзіць у першую тройку лідараў па воблясці. А вось матэрыяльна-тэхнічная база слабая, такіх сучасных фермаў з дайльнымі заламі, якія ёсць, скажам, у Брэсцкім раёне, да гэтага часу не было. Летась пачалі будаваць дзве, сёлета будзем закладваць яшчэ чатыры. Без новых тэхналогій сельгасвытворчасць не можа развівацца, як і прамысловасць. Будучае вёскі — сучасныя фермы, магутная сельгастэхніка, аграрадкі. Правільны накірунак выбраны дзяржавай у падтрымку цэнтральных сядзіб, буйных вёсак. У нас пабудавана шэсць аграрадкоў. У кожны з іх укладзена ад двух з паловай да чатырох мільярдаў рублёў. Ні сельсаветы, ні сельгаспрадпрыемствы, ні раённыя бюджэты такіх грошай у сябе не знайшлі б. Самае важнае, што з уводам аграгарадка не толькі падтрымліваецца сацыяльная сфера, але і набывае імпульс вытворчасць. А гэта рабочыя месцы, будучыня вёскі.

— Наколькі я ведаю, вы па адукацыі аграрый...

— І па адукацыі, і па вопыце, і ў душы. Я ў вёсцы вырас. Пасля заканчэння інстытута народнай гаспадаркі пачынаў з эканаміста калгаса, і на розных пасадах працаваў увесь час у галіне сельскай гаспадаркі. Вёску ведаю. З сумам даводзіцца назіраць, як адміраюць маленькія і большыя вёсачкі, але з гэтым нічога не зробіш. У некаторых з іх застаецца дзесятак або два жыхароў. Каб не адчувалі яны сябе пакінутымі, забытымі, найперш павінны клапаціцца сельскія Саветы. Умацоўваем матэрыяльную базу мясцовых органаў улады, усе яны зараз забяспечаны транспартам.

— У Бярозаўскім раёне шмат цікавых самабытных вёсак. Адно Спорава чаго варта. Яго, відаць, можна лічыць культурным цэнтрам раёна?

— Так. І фестываль гумару, які праводзіцца раз у два гады, ужо стаў чакаеным мерапрыемствам. Мясцовыя жыхары ганарацца сваім асаблівым статусам гумарных і вясёлых людзей. Калі па вуліцы ідзе калона ўдзельнікаў фэсту, яе спыняюць ля кожнага двара з накрытым сталом, з лепшымі пачастункамі. Такая шчырасць проста радуе, прыбаўляе аптымізму. Нездарма мы летась устанавілі своеасаблівы помнік спараўцу і спараўчанцы. Тут, несумненна — адзін з цэнтраў культуры раёна, крыніца вытокаў.

Дарэчы, гэты год у Бярозаўскім раёне можна смела называць годам культуры. Мы прыступілі да рэканструкцыі гісторыка-краязнаўчага музея, які даўно зачакаўся перамен. Працягваецца рамонт Дома культуры. Запланавана паляпшэнне цэлага шэрагу драбнейшых, але не менш важных устаноў культуры. 23 калектывы раёна маюць званне народных. Талентаў у нас многа. Як запяюць «Пескаўскія весялухі» або «Зараначкі» — заслухаешся.

— А з якіх газет пачынаецца дзень старшыні райвыканкама?

— Пачынаецца з раённай, з мясцовай прэсы. Стараюся праглядваць усе асноўныя рэспубліканскія газеты, ну і вядома ж з цікавасцю чытаю «Звязду», якую ўзначальвае мой цёзка па прозвішчы. Жадаю ўсім супрацоўнікам найстарэйшага беларускага выдання творчага плёну, а газеце — жыць і сустракаць новыя юбілеі.

— Дзякуй.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ІНІЦЫЯТЫВА ЕЎРАПАРЛАМЕНТА АБ ЗНІЖЭННІ ЦАНЫ ШЭНГЕНСКАЙ ВІЗЫ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ — КРОК У ПРАВІЛЬНЫМ НАПРАМКУ

Ініцыятыва групы дэпутатаў Еўрапарламента ад фракцыі сацыялістаў адносна неабходнасці зніжэння кошту шэнгенскай візы для грамадзян Беларусі з'яўляецца крокам у правільным напрамку, лічаць у МЗС Беларусі. Аб гэтым паведаміў, каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА гэту ініцыятыву, прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства Андрэй Папоў.

«Відавочна, што нават тыя еўрапейскія палітыкі, якіх нельга западозрыць у залішне лаяльных адносінах да афіцыйнага Мінска, добра разумеюць, што візавы рэжым у Еўропе не павінен перашкаджаць развіццю міжчалавечых кантактаў і эканамічных сувязяў. На нашу думку, у гэтым сэнсе ўстанаўленне больш нізкіх візавых ставак для грамадзян Беларусі цалкам адпавядала б і духу Хельсінкскіх пагадненняў 1975 года», — падкрэсліў ён.

Разам з тым Андрэй Папоў адзначыў, што «адначасова выклікае пэўнае здзіўленне сцвярджэнне, змешчанае ў афіцыйна распаўсюджаным тэксце ініцыятывы еўрадэпутатаў, што Беларусь, быццам бы, праяўляе пасіўнасць у пытанні заключэння пагаднення аб аблягчэнні візавага рэжыму ў ЕС». У сувязі з гэтым прэс-сакратар МЗС нагадаў, што Рэспубліка Беларусь паслядоўна пачынаючы з 2004 года прапануе Еўрасаюзу заключыць падобнае пагадненне, у тым ліку ў нашых пісьмовых зваротах на гэты конт у адрас генеральнага дырэктара па знешніх сувязях Еўракамісіі Энека Ландабуру, камісараў ЕК па знешніх сувязях і палітыцы суседства Беніты Ферэра-Вальднер і пытаннях правасуддзя Франка Фраціні. На жаль, гэтыя прапановы беларускага боку пакуль не знайшлі разумення ў нашых еўрапейскіх партнёраў.

Беларусь пацвярджае гатоўнасць да перагавораў з ЕС па візавай праблематыцы. «Больш таго, мы зрабілі ў гэтым напрамку шэраг аднабаковых крокаў, — падкрэсліў Андрэй Папоў. — У прыватнасці, адмянілі неабходнасць наяўнасці запрашэння пры афармленні кароткатэрміновай гасцявой або дзелавой візы для грамадзян краін Еўрасаюза, якія плануюць знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі не больш за 30 дзён. Беларусь увяла таксама паніжаныя візавыя стаўкі для грамадзян суседніх краін ЕС. Лічым, што ў гэтых умовах мы маем права разлічваць на ўзаемнасць з боку Еўрасаюза».

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

Культуру паводзінаў на катку адноўіць міліцыя...

Недзе другі месяц — на радасць дзятве і дарослым — побач са сталічным кінатэатрам «Дружба» ў Заводскім раёне працуе штучны каток. За гэты час ён паспеў стаць своеасаблівым цэнтрам адпачынку, культурнага жыцця: сюды і ўвечары пасля працоўнага дня, і найперш у выхадныя дні ідуць цэлымі сем'ямі, кампаніямі.

— Жонка літаральна прымусіла набыць канькі для мяне, сябе, дзіцяці. Рэгулярна катаемся на катку, — патэлефанаваў у рэдакцыю адзін з яго пастаянных наведвальнікаў. — Але мяне як бацьку не можа не засмучаць той факт, што некаторыя гараджане, найперш, зразумела, моладзь, нават падлеткі, калі меркаваць па знешнім выглядзе, курыць, п'юць піва і нават больш моцныя напоі прама на лядовай пляцоўцы — побач з лаўкамі для пераапранання. Некаторыя ў такім выглядзе потым выходзяць на лёд, што ўжо можа стварыць небяспеку для навакольных, малых дзетак найперш. Ужо неаднойчы асабіста рабіў заўвагі і хлопцам, і дзяўчатам, маўляў, што ж вы творыце на вачах ва ўсіх. Здзіўляе, што самі работнікі катка ніякіх актыўных мераў не прымаюць у гэтым накірунку, абмежаваліся толькі аб'явай на пункце пракату па забарону на распіццё такіх напояў. У мінулыя выхадныя пад'язджала міліцэйская машына, на некалькі імгненняў асвятліла фарамі каток і — з'ехала...

Намеснік кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна сталіцы Андрэй Лугаўцоў прызнаў, што пэўная праблема існуе, пра яе ведаюць і ў бліжэйшы час збіраюцца вырашыць.

— Каток працуе адносна нядаўна, не ўсё яшчэ цалкам адладжана, хоць у выхадныя і я, і кіраўнік адміністрацыі былі там, — зазначыў Андрэй Леанідавіч. — Плануем або заключыць дагавор з дэпартаментам «Ахова» — каб на час сезона на катку пастаянна знаходзіліся супрацоўнікі міліцыі, або прасіць дапамогі ў справе падтрымання грамадскага правапарадку ў ГУУС Мінгарвыканкама. Сітуацыя хутка будзе вырашана.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У СФЕРЫ ТУРЫЗМУ БУДУЦЬ РЫХТАВАЦЬ У ГРОДЗЕНСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Новая спецыяльнасць «Турызм і гасціннасць» будзе адкрыта на базе гуманітарнага факультэта.

Цяпер пры ГрДУ працуе школа турызму і гасціннасці, слухачы якой навучаюцца па пяці спецыяльнасцях. Аднак школа праводзіць толькі перападрыхтоўку кадраў, а вось выпускнікі гуманітарнага факультэта атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі, падкрэслілі ў цэнтры масавых камунікацый.

Першы набор складзе 60 чалавек: па 30 месцаў на дзённай і завочнай формах.

БЕЛТА.

ЗАТРЫМАЛІ «МУСТАНГАЎ»

Супрацоўнікі Столінскага РАУС каля вёскі Вялікае Малешава тармазнулі іншамарку, на якой перавозіліся тры скутэры «Мустанг».

Дакументаў на тэхніку коштам 7,5 млн рублёў не было і яе канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях адказнасці за парушэнні заканадаўства аб дзяржаўнай статыстыцы

Прыняты Палатай прадстаўнікоў
Адобраны Саветам Рэспублікі

28 лістапада 2007 года
20 снежня 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946; 2005 г., № 120, 2/1128) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Трэці сказ часткі 3 артыкула 6.5 пасля слоў «на фізічную асобу,» дапоўніць словамі «у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка,».

2. У артыкуле 7.6:

частку 1 дапоўніць пунктам 6 наступнага зместу:

«6) за ўчыненне адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага артыкуламі 23.18 гэтага Кодэкса, — на фізічных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў — не пазней за два гады з дня яго ўчынення і трох месяцаў з дня яго выяўлення.»;

у частцы 2:

словы «а па адміністрацыйным правапарушэнні» замяніць словамі «па адміністрацыйным правапарушэнні»;

дапоўніць частку словамі «, па адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным артыкуламі 23.18 гэтага Кодэкса, — на фізічных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў — не пазней за дваццаць пяць месяцаў з дня яго ўчынення».

3. Артыкул 23.18 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 23.18. Парушэнне парадку прадстаўлення даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці

1. Прадстаўленне службовай асобай і (або) іншай упаўнаважанай асобай, адказнай за складанне і прадстаўленне даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, несвоечасовае прадстаўленне або непрадстаўленне такой справаздачнасці органам дзяржаўнай статыстыкі, калі ў гэтых дзеяннях няма складу злачынства, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да ста дваццаці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад пяцідзесяці да ста пяцідзесяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад ста да двухсот базавых велічынь.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад ста пяцідзесяці да трохсот пяцідзесяці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад ста пяцідзесяці да чатырохсот базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад двухсот да чатырохсот пяцідзесяці базавых велічынь.

3. Прадстаўленне службовай асобай і (або) іншай упаўнаважанай асобай, адказнай за складанне і прадстаўленне даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, або індывідуальным прадпрымальнікам скажоных даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, несвоечасовае прадстаўленне або непрадстаўленне такой справаздачнасці органам дзяржаўным органам (арганізацыям), за выключэннем органаў дзяржаўнай статыстыкі, якія ажыццяўляюць вядзенне дзяржаўнай статыстыкі ў дачыненні да арганізацый, што знаходзяцца ў іх падпарадкаванні (падначаленні), а таксама па пытаннях, якія ўваходзяць у іх кампетэнцыю, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да ста базавых велічынь.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 3 гэтага артыкула, учыненыя паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад ста пяцідзесяці да трохсот базавых велічынь.»

Артыкул 2. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2004 года «Аб дзяржаўнай статыстыцы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 192, 2/1094) наступныя змяненні:

1. Падпункт 1.5 пункта 1 артыкула 9 выключыць.

2. У артыкуле 20 словы «а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі» замяніць словамі «індывідуальныя прадпрымальнікі, а таксама юрыдычныя асобы».

Артыкул 3. Унесці ў частку 1 артыкула 3.30 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 20 снежня 2006 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 14, 2/1291; № 119, 2/1318) наступныя змяненні:

пункт 23 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«23) органаў дзяржаўнай статыстыкі (па частках 1 і 2 артыкула 23.18 (за выключэннем правапарушэнняў, учыненых юрыдычнымі асобамі) Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях);»;

у пункце 28 лічбы «23.18,» замяніць словамі «часткам 3 і 4 артыкула 23.18, артыкулам».

Артыкул 4. Гэты Закон уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

4 студзеня 2008 года, г. Мінск. № 309 — З

БАБРЫ ПЕРАГАРАДЗІЛІ ЗАПРУДАЙ РАКУ КОТРА Ў ШЧУЧЫНСКІМ РАЁНЕ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Котра» Іван Жывушка.

Запруда збудавана крыху ніжэй за вярхоўе ракі, дзе заканчваецца беларускі заказнік і пачынаецца літоўскі запаведнік «Чапкяляй». Менавіта літоўскія бабры і «распаразаліся» на рацэ, зваліўшы ў ваду дзесяткі два дрэў.

Іван Жывушка адзначыў, што ў гэту пару на рацэ бабры заўсёды будуюць запруды, але ні разу не перагароджвалі яе поўнасцю.

Фота БЕЛТА

Мінскія аўташколы маюць патрэбу ў істотным павышэнні цэнаў на падрыхтоўку вадзіцеляў

Мінскія аўташколы для дасягнення рэнтабельнасці маюць патрэбу ў істотным павышэнні цэнаў на свае паслугі. Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА дырэктар аўташколы «Цэнтральны аўтамабільны вучэбны камбінат» (ЦАВК) Віталій Клышэўскі, цяпер падрыхтоўка вадзіцеля катэгорыі «В» нерэнтабельная.

Кошт такога курсу навучання складае Br600 тыс., а «рэнтабельнасць навучання — мінус 16 працэнтаў», сказаў ён.

На думку дырэктара ЦАВК, адзіныя тарыфы на навучанне, дзеючыя цяпер, ставяць аўташколы ў няроўныя ўмовы, таму што іх расходы істотна адрозніваюцца. Напрыклад, немалаважную ролю пры фарміраванні цаны навучання адыгрывае памер арэнднай платы за зямлю, а ён залежыць ад месца размяшчэння пляцоўкі.

На сёння для павышэння рэнтабельнасці аўташколы ЦАВК, паводле слоў яе дырэктара, набходна павысіць кошт падрыхтоўкі вадзіцеляў катэгорыі «В» прыкладна на Br200 тыс. Верагодна і далейшае павышэнне па прычыне рэгулярнага падаражэння аўтатэхнікі, запчастак, гаруча-змазачных матэрыялаў. У сваю чаргу намеснік старшыні Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання ДТСААФ Пётр Лебедзеў заявіў, што навучанне вадзіцеля ў аўташколах стала стратным з моманту ўвядзення гранічнага кошту гэтай паслугі — са студзеня 2006 года. «У 2006 і 2007 годзе ДТСААФ за кошт аўташкол панёс страты — упершыню за многія гады», — сказаў ён. «З улікам таго, што большасць грамадзян ездзяць на аўтамабілях іншаземнай вытворчасці, то на іх і трэба праводзіць навучанне. У такім выпадку падрыхтоўка вадзіцеля катэгорыі «В» будзе каштаваць у межах Br1 млн», — сказаў намеснік старшыні ДТСААФ.

Мінтранс унёс ва ўрад праект указа, які прадугледжвае, што тарыфы на паслугі аўташкол будуць рэгістравацца мясцовымі органамі ўлады. Папярэдне дакумент падтрыманы ў міністэрствах, Саўміне і Адміністрацыі Прэзідэнта.

Шайбу, шайбу!

У РОЗЫГРЫШЫ — «КУБАК ПАЛЕССЯ»

Сёння ў Беларусі стартуе другі па ліку міжнародны турнір «Кубак Палесся-2008». У гэтым годзе яго гаспадарамі стануць два гарады — Жлобін і Гомель. За трафей будуць спаборнічаць нацыянальныя зборныя Даніі, Славеніі і Беларусі, а таксама дружына «Палесся» (ігракі жлобінскага «Металурга» і «Гомеля»).

У мінулым годзе менавіта беларуская зборная заваявала «Кубак Палесся». Ён стаў першым трафеем для Курта Фрэйзера ў рабоце з нашай камандай. Аднак на сёлетнім турніры амерыканец зусім не ставіць перад сваімі падначаленымі задачу — захаваць тытул. «Для мяне больш важна, што ігракі збяруцца разам, — заявіў ён, — патрэніруюцца і правядуць некалькі гульняў. І не мае значэння, хто будзе нашымі сапернікамі, бо наша асноўная мэта — чэмпіянат свету, а «Кубак Палес

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 лютага 2008 г. № 5 (108)

ЯК ЗАРАБІЦЬ НА ТУРЫЗМЕ

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае начальнік аддзела планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці Міністэрства спорту і турызму Любоў МАКСІМАВА

— Любоў Яфімаўна, якую суму грошай пакінулі летась замежныя турысты ў нашай краіне?

— Прыкладна 100 мільёнаў долараў ЗША. Гэта больш, чым у 2006 годзе. Аднак яшчэ мала ў параўнанні з іншымі краінамі, якія зарабляюць на ўязным турызме астранамічныя сумы грошай. Тым не менш, у нас ёсць упэўнены рух наперад і гэта абнадзейвае.

— Давайце ўявім, што сёлета колькасць ахвотнікаў прыехаць у Беларусь узрасце ў дзесяць разоў. Яны захочуць убачыць не толькі нашы славутасці (Мірскі замак, Нясвіжскі палац Радзівілаў, Белавежскую пушчу, Полацк, Гродна і іншыя), але і наведаць глыбінку, пажыць некалькі дзён у малых гарадах і пасёлках, пазнаёміцца з побытам і традыцыямі іх жыхароў, паласавацца прысмакамі і напоямі мясцовай кухні, глынуць напоўніцу чыстага паветра. Дарэчы, гэта звычайная практыка для большасці еўрапейскіх краін. Скажыце, ці зможам мы дастойна, на высокім ўзроўні прыняць і абслужыць гэты наплыў турыстаў, каб ім потым захацелася яшчэ прыехаць да нас?

— Шчыра кажучы, сёння пакуль не ўсюды. Хоць, безумоўна, значны рост колькасці прыезджых стаў бы важным стымулам развіцця на месцах турыстычнай галіны, спрыяў бы прытоку інвестыцый у яе, актывізаваў намаганні мясцовай улады і г.д.

— А ці ўсюды ў глыбінцы разумеюць, а значыць і садзейнічаюць усталяванню партнёрскіх адносінаў з турыстычнымі арганізацыямі?

— Калі нашаму міністэрству даручылі курыраваць турызм, то мы, на жаль, сутыкнуліся з абсалютнай непадрыхтаванасцю на месцах, літаральна на ўсіх узроўнях, да сучаснага вядзення турыстычнай справы. Многія чыноўнікі не разумелі, што гэта такое. Нам давялося іх пераконваць у тым, што турызм пры ўмелым падыходзе можа ператварыцца ў высокарэнтабельную галіну эканомікі. У якасці аргументаў мы выкарыстоўвалі дадзеныя інвентарызацыі айчынных турыстычных рэсурсаў. Аказваецца, мы можам ганарыцца культурна-гістарычнай спадчынай, унікальнымі прыроднымі ландшафтамі, багатай флорай і фаўнай. Карацей, існавала трывалая аснова для развіцця ў малых гарадах і пасёлках паўнацэннага турызму.

Аднак моцна засмучаў стан яго матэрыяльнай базы, адсутнасць кадраў, недахоп запатрабаваных замежнымі гасцямі турыстычных паслуг. Паўставала шмат іншых пытанняў. Было зразумела, што наскокам сітуацыю не пераламаць.

— І тым не менш працэс пайшоў. З чаго пачыналі?

— З вырашэння адразу многіх праблем. Напрыклад, з прыцягнення ў турыстычную арбіту малых гарадоў і пасёлкаў, якія маюць цікавыя і перспектыўныя аб'екты. Дзеля гэтага ў краіне стварылі 27 турыстычных зон. Іх мэта — аб'яднаць намаганні тэрытарыяльных органаў кіравання, зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, бізнэсу, дапамагчы знайсці кожнаму боку свой эканамічны інтарэс у турызме.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Вяртанне Евы...

Калі на грамадскую пасаду вясковага старасты выбралі Еву Якавец, яна і ўявіць не магла, што гэта надоўга, на цэлых дзесяць гадоў. Як правіла, старастам калектыву ці населенага пункта не вылучаюць выпадковую асобу — у такім выпадку лепш нікога не выбіраць. Знаходзяць сваю, як кажуць, роднасную душу — блізкага, зразумелага, адкрытага чалавека, паважанага і актыўнага. Ева Якавец, жыхарка вёскі Лобча Лунінецкага раёна, менавіта такая.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ева ЯКАВЕЦ (у цэнтры) – заўсёды ў працы, у клопатах, у песні, а значыць — сярод людзей.

Ева Васільеўна не проста любіць жыццё і радуецца кожнаму яго дню — яна разумее людскія праблемы і сама дастойна пераносіць нягоды, якімі лёс і яе, на жаль, не абдзяліў.

Чаму я распачаў пісаць пра звычайнага чалавека з беларускай глыбінкі і наогул, чаму размова менавіта пра Еву Якавец? Прызнаюся, наша сустрэча была выпадковай, але з тых сустрэч, якія мяняюць творчыя планы і камандзіровачныя шляхі-дарогі, калі разумееш, што не расказаць пра такога чалавека не маеш права. Напярэдадні вечарам я рабіў фатаздымкі калядная абраду, які тут — жывая традыцыя і можа быць унесены ў рэестр нематэрыяльных культурных каштоўнасцяў нашай краіны. У групе калядніка ў былі работнікі сельскага дома культуры, працаўнікі мясцовага СВК і вясковыя пенсіянеры. А сярод іх і Ева Якавец... Напрыканцы вечарыны, калі ўволю накалядаваўшыся, гурт сядзеў за смачным сяброўскім сталом і ад душы спяваў мясцовыя паляшуцкія песні, я даведаўся, што Ева Васільеўна — пенсіянерка, але працуе бібліятэкарам, а яшчэ яна — тутэйшы старааста. Раніцай Ева Якавец ужо знаёміла мяне з вёскай Лобча, век якой пераваліў ажно за 400 гадоў.

— Ведаеце, сама я не імкнулася ў старасты — дом, праца, клопатаў, як у кожнага вяскоўца, хапала і хапае дагэтуль. Але ж людзі так захацелі, гэта была іх воля і, можна сказаць, давер, — гаворыць Ева, калі мы крочым па новым пасёлку — вуліцы Маладзёжнай. У гэтым новазбудаваным кутку старажытнай вёскі засталіся такія-сякія недаробкі на пешаходнай частцы, і маладыя жыльцы нярэдка выказваюць незадавальненне, просяць унікнуць у іх заўвагі. І хоць Ева па прафесіі не будаўнік, тым не менш, быць у курсе спраў павінна. Ці ёсць тут з-за чаго сыр-бор разводзіць, хоча разабрацца сама.

Староста вёскі — гэта нефармальны яе лідар, з думкай якога лічацца. Каб у населенага пункта быў свой твар, у першую чаргу неабходна сачыць за парадкам. І не толькі на праезнай частцы, але ў дварах і на агародах таксама. Трэба арганізаваць вываз смецця, прасачыць, каб абкошваліся двары, каб агароджа не хілілася і была пафарбаваная. І старасту тут ад вясны да восені хапае клопату. У Лобчы цяпер налічваецца 285 двароў. Палескія вёскі немалыя, і хоць Лобча не адносіцца да самых вялікіх населеных пунктаў Лунінскага сельсавета, у ёй пражывае амаль восемсот чалавек.

— Мінулым летам ад моцных дажджоў многія падворкі былі падтопленыя, і мне давялося ўсіх абыходзіць, рабіць замеры — каго на колькі затапіла, якія пасевы прапалі, — прыгадвае староста. — Калі маладзейшыя сем'і яшчэ могуць за сябе пастаяць, дык хто ж паклапоціцца за старых і адзіноких?

Свой лёс Ева вызначыла сама: пасля вучобы ў Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме вярнулася на радзіму, бо лічыла, што лепшых і прыгажэйшых мясцін не знойдзеш больш нідзе. Не пачуеш такіх песень і такой каларытнай мовы, поўнай дыялектаў, не сустрэнеш такіх абрадаў і традыцый. Вярнулася да бацькоў, да сваіх землякоў. І трыццаць восем гадоў адпрацавала ў Лабчанскай бібліятэцы.

Падзялілася Ева Васільеўна і сваім неадбалелым горам, якое стала самым моцным ударам і самым цяжкім выпрабаваннем яе жыцця. Хоць прайшло нямала гадоў, боль з душы не сыходзіць і сэрца не супакойваецца. Пасля чарнобыльскай катастрофы цяжка захварэў сын. У хлопчыка выявілі саркому.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАБ УСІМ БЫЛО ЗРУЧНА

Як мы ўжо паведамлялі, на сесіях Гродзенскага раённага і Гродзенскага гарадскога Саветаў дэпутатаў было разгледжана пытанне аб змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльных межаў Гродзенскага раёна і абласнога цэнтра і ўключэнні зямельных участкаў у гарадскія межы. Наступным этапам гэтай працэдуры (канчатковае рашэнне за Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь) стала ўзгадненне гэтага пытання на сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.

Пры гэтым была ўлічана неабходнасць упарадкавання межаў горада з мэтай развіцця сацыяльнай інфраструктуры. Перш за ўсё — у мікрараёнах індывідуальнай жылой забудовы, што знаходзяцца ў распараджэнні сельскіх выканаўчых камітэтаў і дзе большасць участкаў прадастаўлены жыхарам г. Гродна. Акрамя таго, існуючыя землеўладанні з рознай адміністрацыйнай падпарадкаванасцю ствараюць цераспалосіцу і ўкліньванне зямель, ускладняюць выкарыстанне і ахову зямельных рэсурсаў.

Абласны Савет дэпутатаў узгадніў змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльных межаў г. Гродна і Гродзенскага раёна з уключэннем у межы горада абласнога цэнтра зямельных участкаў 155 юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў і 22 249 фізічных асобаў агульнай плошчай 7913,1191 га. Таксама ўзгоднена перадача ў адміністрацыйнае падпарадкаванне Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў і гарвыканкама 25 сельскіх населеных пунктаў і мікрараёна Зарыца — Грандзічы.

Сесія выказалася за тое, каб пасля прыняцця адпаведнага рашэння кіраўніком дзяржавы аблвыканкам сумесна з Гродзенскім гарадскім і Гродзенскім раённым выканаўчымі камітэтамі ажыццявілі комплекс мераў, звязаных з абслугоўваннем насельніцтва і ўтрыманнем перадаваемых тэрыторый і населеных пунктаў. Гродзенскаму гарадскому Савету дэпутатаў даручана прадоўжыць растлумачальную работу з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі па пытаннях, звязаных з уключэннем іх зямельных участкаў у межы горада.

На думку старшыні Гродзенскага гарвыканкама Аляксандра Антоненкі, рана ці позна, але гэту праблему давялося б вырашаць, каб не ствараць перашкоды для наступнага развіцця горада згодна з Генеральным планам развіцця абласнога цэнтра да 2020 года. Пры гэтым, падкрэсліў мэр Гродна, будзе праводзіцца работа ў тым накірунку, каб жыхары ўваходзячых у межы горада сельскіх населеных пунктаў карысталіся паслугамі ў адпаведнасці з вызначанымі для горада сацыяльнымі стандартамі — гэта і водазабеспячэнне, і каналізацыя, і дарогі, і транспартнае абслугоўванне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СТРАСЦІ па малаку

Са старшынёй Юшавіцкага сельскага Савета Нясвіжскага раёна Анатолем ХАЛОПІЦАМ ідзём па вёсцы Затур'я — у «госці» да адной з малаказдатчыц. Поўдзень, абедзенны час — а навокал практычна ні душы.

— Пусцее вёска... Людзі ад'язджаюць, паміраюць. Я ў сельсавеце старшынёй больш за дваццаць гадоў, з 85-га. За гэты час колькасць насельніцтва зменшылася на пяцьсот чалавек, — тлумачыць Анатоль Аляксандравіч.

Сёння ў сельсавеце пражывае 1139 чалавек. У мінулым годзе нарадзілася 12, яшчэ 11 прыехала, каб уладкавацца на працу ў СВК «Юшавічы». Старшыню сельскага Савета гэта, безумоўна, радуе. Але вялікага аптымізму не выклікае — вёска, калі браць яе ўзроставую катэгорыю, старэе, адток у гарады працягваецца. Гэта аб'ектыўны працэс, і як ты ні круціся і ні старайся, спыніць яго наўрад ці ўдасца. Хіба што... прыпыніць. Але і для гэтага патрэбны пэўныя ўмовы — жыллё, выгоды, сацыяльная інфраструктура і, зразумела, добрая зарплата. Колькі? Зыходзячы з сённяшніх цэнаў, не менш за мільён, лічыць Анатоль Аляксандравіч.

На сёння сярэдняя зарплата ў СВК «Юшавічы» — 395 тысяч. Пражыць на такія грошы, скажам, у горадзе вельмі праблематычна. А вясковага жыхара выручае вясковы ўклад жыцця — наяўнасць падсобнай гаспадаркі. Выручае — з аднаго боку, з другога — абцяжарвае. Гэта, лічы, для вяскоўца другая «змена». Той жа карове не толькі есці даць трэба, не толькі пачысціць за ёй. Чалавек увесь час «прывязаны» да працэсу даення — раніцай, у абед і вечарам. Але менавіта свойская жывёла становіцца ледзь ці не галоўнай крыніцай даходаў для вяскоўцаў. Не для ўсіх, натуральна, а для тых, хто яшчэ не страціў сілы і не адвык ад вясковай працы.

Колькі памятае Анатоль Халопіца, сельскі Савет заўсёды адказваў за збор малака ў насельніцтва, хоць непасрэдна гэтым займаліся калгасы. І толькі ў 2003-м райвыканкам прыняў рашэнне аб поўнай перадачы «малочнай» функцыі сельскім Саветам — разам з адпаведным штатам і інвентаром. Тры—чатыры гады таму, калі пагалоўе кароў на падворках грамадзян перавышала 200 адзінак, колькасць закупленага малака складала 1000 тон і болей. Гэта было выгадна і вяскоўцу, і сельсавету — нягледзячы на тое, што закупачныя цэны на малако заўсёды моцна адставалі ад магазінных. Тады ж дзякуючы «малочным грашам» сельскі Савет купіў малакавоз.

— 15 мільёнаў рублёў нам выдзелілі на яго з фонду падтрымкі сельгасвытворцаў, а 13 мільёнаў мы заплацілі самі, — гаворыць Анатоль Аляксандравіч. — Яшчэ 7 мільёнаў, зароблены намі, пайшло на пакупку аўтамабіля «Жыгулі» (3 мільёны было выдзелена з бюджэту)... А як выкручваюцца сельсаветы, якія не займаюцца закупам малака ў насельніцтва?

Дарэчы, грошы, атрыманыя сельсаветам за здадзенае малако, не ўваходзяць у пералік даходных крыніц, вызначаных указам № 21. А вызначанныя крыніцы папаўнення бюджэту працуюць далёка не заўсёды. У Юшавіцкім Савеце рэальныя даходы (а гэта падатак на зямельныя ўчасткі, на нерухомасць, здача ў арэнду маёмасці і дзяржпошліна) складаюць усяго 15—20 мільёнаў рублёў, а пад патрэбы неабходна 90—100 мільёнаў. Яшчэ да нядаўняга часу дзякуючы малочным грашам сельсавет адчуваў сябе адносна самастойным і не хадзіў, як многія, з працягнутай рукой... Але пагалоўе свойскай жывёлы змяншаецца — і не толькі ў Нясвіжскім раёне. «Калі б сельсаветам дазволілі пакідаць у сябе хоць частку падаходнага падатку, яны адчувалі б сябе больш упэўнена», — гаворыць Халопіца.

У пацвярджэнне сваіх слоў Анатоль Аляксандравіч прыводзіць нескладаныя падлікі. Сёлета пагалоўе кароў на падворках «апусцілася» да 178. У выніку за год сельсавет сабраў не 1000 тон малака, як раней, а толькі 828 тон, і атрымаў за гэта ад малаказавода 74 мільёны рублёў. З іх 72 мільёны былі затрачаны на заработную плату, паліва для тэхнікі, падаткі... (Прычым на падаткі пайшло амаль 12 мільёнаў.) У выніку чысты прыбытак склаў усяго 2 мільёны.

— Калі паглядзець на рэчы рэальна, атрымліваецца, што сельскі Савет, які займаецца сельскагаспадарчай дзейнасцю, — збірае з падворкаў малако, адвозіць яго на завод, атрымлівае грошы, рэгулярна разлічваецца з людзьмі — не мае ніякіх ільгот. Так, мы не з'яўляемся вытворцамі сельгаспрадукцыі, але ж маем самае непасрэднае дачыненне да яе збору і рэалізацыі!.. Аднак падаткі плацім па поўнай праграме, як і ўсе. І паліва купляем без усякіх скідак. Летась толькі 15 мільёнаў сельвыканкам выклаў за бензін.

— Дорага вам абыходзіцца малакавоз. А без яго нельга? — пытаюся ў старшыні.

— Вазіць малако на конях ды на вазах? Гэта не выйсце, калі ўлічыць тэрытарыяльную раскіданасць нашых вёсак. Пакуль да апошняй дарэшся на возе, малако пракісне. Так што з малакавозам — падкрэсліваю, новым — прасцей. А нашаму ўсё часцей патрабуецца рамонт, — гаворыць старшыня сельскага Савета.

Таццяна ХАЛОПІЦА знайшла ў вясковым жыцці шмат плюсоў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

КАМУ ВЫГАДНЫ АЎКЦЫЁН?

Указ Прэзідэнта № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў» ад 27 снежня 2007 года прадугледжвае спрашчэнне працэдуры выдзялення грамадзянам участкаў, замацоўвае адказнасць чыноўнікаў за неабгрунтаваны адказ у адабранні ці прадастаўленні зямлі, абавязвае мясцовыя ўлады прадастаўляць максімальна поўную інфармацыю аб зямельных участках, якія грамадзяне маглі б набыць. Указ устанаўлівае агульнае правіла прадастаўлення зямлі — толькі па выніках аўкцыёнаў. Без аўкцыёну будуць выдзяляцца ўчасткі для вядзення асабістай гаспадаркі, фермерства, традыцыйных народных рамёстваў, сенажаці, а таксама для будаўніцтва жылля грамадзянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пастаянна пражываюць і працуюць на тэрыторыі раёна. «МС» пацікавілася, як ідзе рэалізацыя азначанага ўказа на месцах, ці для ўсіх рэгіёнаў пытанне выдзялення зямлі сёння актуальнае?

Віктар АГАРОЎ, старшыня Краснаўскага сельскага Савета дэпутатаў Светлагорскага раёна:

— Наш сельсавет размешчаны на самым ускрайку раёна, і зямельныя ўчасткі тут не так запатрабаваны, як у сельсаветах прыгараднай зоны. У нас на зямлю вялікага попыту няма. Сёння 220 дамоў на тэрыторыі нашага сельсавета лічацца пустымі, з іх 150 — так званыя дачы (насамрэч дач у вёсках няма, гэта дамы часовага пражывання). Згодна з указам мы правялі інвентарызацыю, размясцілі спісы пустых зямельных участкаў на інфармацыйных шчытах (такі шчыт ёсць у кожным населеным пункце). Пакуль што да нас па зямлю ніхто не звяртаўся. Шэсць населеных пунктаў на тэрыторыі нашага сельсавета размешчаны на ўзбярэжжы ракі Бярэзіны. Думаю, у перспектыве там зямельныя ўчасткі будуць запатрабаваныя. Увогуле, зямлі, дзякуй Богу, у нас хапае — 8960 га. Людзей малавата — усяго 1524 жыхары.

Магчыма, варта абмежаваць плошчу ўзводзімага жылля разумнымі параметрамі, аднак не трэба рабіць іх такімі жорсткімі.

Што тычыцца аўкцыёну, мне здаецца, гэта добра для буйных населеных пунктаў. А для сельсаветаў, якія размешчаны далекавата, можа, ён і непатрэбны. Аўкцыён пачынаецца з кадастравай ацэнкі зямлі, а ў нас яна вельмі нізкая. Калі хтосьці задумае прыехаць з таго ж Мінска і набыць у нас зямлю, пабудаваць дачу ці заняцца аграэкатурызмам, яму гэта будзе каштаваць нядорага. А мясціны ў нас прыгожыя.

Валерый ГЕРМАНЕНКА, старшыня Касцяневіцкага сельскага Савета дэпутатаў Вілейскага раёна:

— Нам пашанцавала, што мы жывём у водаахоўнай зоне. Там, дзе бліжэй да вады, безумоўна, зямля карыстаецца попытам. Ёсць прапановы, і людзі з задавальненнем бяруць участкі. А ў аддаленых глухіх вёсачках нам складана вырашаць пытанне пустых участкаў, тым больш праз аўкцыён, як таго патрабуе Указ № 667. Тут хоць бы каму-небудзь іх «сплавіць», без аўкцыёну, абы толькі людзі будаваліся.

Добра, што сродкі ад аўкцыёну павінны ісці ў бюджэт сельскага Савета, нам гэта вельмі імпануе. Сёлета мы мяркуем у вёсцы Сосенка, размешчанай на беразе вадасховішча і вельмі папулярнай сярод адпачываючых, у тым ліку і мінчан, выставіць на аўкцыён 14 участкаў. Раён быццам бы паабяцаў выдзяліць стартавую суму для афармлення патрэбных дакументаў. Калі пытанне з фінансаваннем будзе вырашана, тады мы, безумоўна, атрымаем пэўныя дывідэнды.

На тэрыторыі сельсавета сёння толькі ў 7 населеных пунктах (з 37) участкі не карыстаюцца попытам. А на астатніх часта здараецца так: мы ў выканкаме яшчэ не ведаем, хто са спадчыннікаў збіраецца прадаваць хату, а пакупнікі ўжо знайшліся. Набываюць дамы, даводзяць іх да ладу. Вёска атрымлівае другое жыццё. Прырода ў нас больш багатая і разнастайная, чым у нарачанскім краі, ёсць дзве рэчкі, вадасховішча. Аднак з-за таго, што мы знаходзімся ў водаахоўнай зоне, тыя дамы, якія набываюцца новымі гаспадарамі, могуць быць рэканструяваны выключна ў межах старога фундаменту. Мне здаецца, гэта няправільна. Не трэба кідацца з адной крайнасці ў другую. Гарадскія людзі прывыклі да парадку. Яны ж набываюць дамы, каб потым пакінуць іх сваім дзецям, значыць, будуць ахоўваць гэтыя мясціны, упрыгожваць іх. Безумоўна, неабходна вызначыць пэўныя абмежаванні: пры будаўніцтве ў водаахоўнай зоне чалавек павінен вытрымаць усе санітарныя нормы, забяспечыць ізаляваную каналізацыю. Магчыма, варта абмежаваць плошчу ўзводзімага жылля разумнымі параметрамі, аднак не трэба рабіць іх такімі жорсткімі. Людзі, якія маюць сродкі, сёння маглі б навесці прыгажосць без урону для прыроды.

Незразумела, чаму ва Указе прапісана адзінае для ўсіх палажэнне — продаж зямлі праз аўкцыён. Тут абавязкова трэба ўлічваць месцаразмяшчэнне зямельнага ўчастка і тое, наколькі ён будзе карыстацца попытам. Трэба вызначыць тыя месцы ў раёне, дзе можна праводзіць аўкцыён, а дзе — не.

Работу па Указу № 667 нам ускладняюць пустыя аварыйныя дамы. Калі б спадчыннікі былі ў іх зацікаўлены, то даўно б прывялі гэтыя дамы да ладу. Добра, калі далёкія родзічы пішуць нам адпаведную заяву і дазваляюць знос. Але так робяць не ўсе. Мы абавязаны занесці пусты дом у дзяржаўны рэестр, год чакаць, а за гэты час мы б яго знеслі і перадалі ўчастак канкрэтнаму чалавеку. Трэба неяк спрасціць гэтую працэдуру, дазволіць мясцовай уладзе самастойна вырашаць пытанне зносу.

Тамара ЯРЫГА, старшыня Баброўскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна:

— З зямлёй у нас праблем няма. На 17 тыс. га ў нас пражывае 1,5 тысячы чалавек. Мы аддалены ад раённага і абласнога цэнтраў. З усіх населеных пунктаў (а ў нас іх 36) толькі ў адной вёсцы (Завадзіна) ёсць попыт на зямлю. Яна месціцца ля двух азёраў. Ахвотнікі набыць там участкі ёсць. Зямлі, якая пустуе, у нас многа, але аўкцыён яшчэ не праводзілі. Пакуль што завяршылі інвентарызацыю, вызначыліся з участкамі, вывесілі інфармацыю на стэнды. Цяпер думаем пачаць збіраць дакументы. Аўкцыён будзе выгадным толькі тады, калі знойдзецца хоць бы некалькі канкурэнтаў на зямельныя ўчасткі. Тут уся надзея на дачнікаў, бо мясцовыя жыхары будавацца не будуць. Што казаць пра вёскі, калі ў нашым аграгарадку Баброва 7 новых дамоў яшчэ не заселеныя?

Сяргей ШЭЦІК, старшыня Вензавецкага сельскага Савета дэпутатаў Дзятлаўскага раёна:

— Указ № 667 для нас не вельмі актуальны. Аўкцыёну ў нас не было і не будзе, бо няма ахвотнікаў. Мы месцімся ў глушы, у глыбінцы, зямля тут незапатрабаваная. У цэнтры, у аграгарадку мы зносім старыя дамы, СВК забудоўвае свабодныя ўчасткі. У астатніх населеных пунктах свабодныя ўчасткі маюцца, аднак попытам не карыстаюцца. Сёння ў нас 10 свабодных незапатрабаваных участкаў, забудоўшчыкаў няма. І колькасць такіх участкаў з часам будзе толькі расці.

Мікалай ІЛЬЯНКОЎ, старшыня Тур'еўскага сельскага Савета дэпутатаў Краснапольскага раёна:

— У нас адносна зямлі ёсць і попыт, і прапанова. Адны падаюць заяву на адабранне ўчастка, іншыя — на атрыманне. Напрыклад, пенсіянеры ўжо не могуць апрацоўваць зямлю, просяць — забярыце, а людзі больш маладога ўзросту наадварот хацелі б яе ўзяць. Пустых участкаў на тэрыторыі сельсавета няшмат, такую зямлю мы перадаём СВК. Работа па Указу № 667 ідзе нармальна, аўкцыён мы правялі. Уся інфармацыя аб зямельных участках знаходзіцца ў землеўпарадкавальнай службе. Свайго землеўпарадчыка ў нашым сельскім выканкаме няма — гэтым пытаннем займаецца раённая служба.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

ЯК ЗАРАБІЦЬ НА ТУРЫЗМЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Які тут інтарэс тэрыторый?

Я думаю, што немалы. Усё залежыць ад іх руплівасці, дзелавітасці. Так, турыстычныя зоны ўжо дазволілі на месцах больш мэтанакіравана і эфектыўна выкарыстоўваць фінансавыя магчымасці інвестараў, рэсурсы тэрыторый. У кожнай вызначаны асноўныя маршруты, вакол якіх цяпер ідзе паэтапнае прывядзенне іх у належны стан. Ужо ў 2006—2007 гадах мы здолелі прыцягнуць больш за 400 млрд рублёў у развіццё інфраструктуры турызму. Значная іх частка засвоена ў малых гарадах і пасёлках. Напрыклад, былі адрамантаваны дзесяткі старых і пабудаваны пяць новых гасцініц, уздоўж аўтамагістраляў з'явілася больш за сотню аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу.

Новыя магчымасці перад мясцовай уладай адкрывае вядомы Указ Прэзідэнта № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў». Раней інвестару даводзілася паўтара года збіраць подпісы, перш чым распачаць будаўніцтва аб'екта інфраструктуры. Цяпер усё прасцей. І я параіла б мясцовым выканкамам загадзя вызначыць зямельныя ўчасткі, вырашыць усе рабочыя пытанні, каб потым весці прадметную размову з патэнцыяльным інвестарам і без бюракратычнага зацягвання пачынаць рэалізацыю саліднага турыстычнага праекта.

— І як турыстычныя зоны садзейнічаюць стварэнню «турыстычнага прадукту» па-за межамі вялікіх гарадоў?

— У выкарыстанні пераваг турыстычных зон сярод рэгіёнаў лідзіруе Мінская вобласць. Лагойская зона — добры прыклад таго, як можна пры вялікім жаданні і падтрымцы ўлады, у тым ліку і мясцовай, ажыццявіць амбіцыйную ідэю. Маляўнічыя ландшафты Лагойшчыны, якія не горшыя за славутыя карпацкія, натхнілі групу энтузіястаў стварыць беларускі гарналыжны комплекс. Не буду засяроджвацца на перыпетыях рэалізацыі гэтага праекта, адзначу толькі, што тут шмат і плённа папрацавалі ўсе раённыя і абласныя арганізацыі і службы. І без перабольшання, у нядаўнім мінулым складаны датацыйны Лагойскі раён атрымаў другое дыханне. Папрыгажэў, набыў сучасны выгляд горад, з'явілася работа для мясцовай моладзі. Так, два комплексы «Сілічы» і «Лагойскі» далі сотні новых працоўных месцаў.

— Але без салідных інвестыцый вашы лагойскія планы так і засталіся б на паперы. Як удалося прыцягнуць інвестараў і якая тут, на ваш погляд, павінна быць тактыка органаў мясцовай улады?

— Зноў нагадаю Лагойск. Яшчэ зусім нядаўна сама ідэя гарналыжнага комплексу ў Беларусі многім здавалася фантастычнай. Яе спачатку стрымана ўспрымалі і патэнцыяльныя інвестары. Але калі яны ўбачылі прадстаўленыя мясцовай уладай і іншымі зацікаўленымі бакамі дакладныя разлікі па ўсіх пазіцыях будаўніцтва, шчырую гатоўнасць раёна супрацоўнічаць, я нават сказала б, агеньчык у вачах яго кіраўнікоў, то гэта ў многім паспрыяла сумеснай рабоце.

Адсюль выснова ці парада: працуйце з інвестарамі сур'ёзна, адказна, зацікаўлена, каб яны ў органах мясцовай улады адчувалі партнёраў. Тады інвестары будуць разумець вас лепш. Як гэта, напрыклад, адбылося ў Паставах. Там за кароткі тэрмін у некалькі разоў павялічылі лічбы прыняцця турыстаў. І ўсё дзякуючы разумнай палітыцы мясцовай улады. Там здолелі стварыць свой арыгінальны турыстычны прадукт. Як, дарэчы, і ў Іванава, Тураве, Пружанах і Ашмянах. Апошні горад заняў першае месца сярод малых гарадоў у конкурсе па развіцці турызму. Творча і плённа працуюць у Заслаўі.

— Скажыце, а які яшчэ незвычайны, але рэальны турыстычны праект па сілах мясцовай уладзе?

— Наспела стварэнне СЭЗ «Нясвіж—Мір» з турыстычнай спецыялізацыяй на базе Нясвіжскага палацавага комплексу Радзівілаў і Мірскага замка. Ёсць эканамічны сэнс аб'яднаць патэнцыял гэтых тэрыторый з самымі знакамітымі культурна-гістарычнымі помнікамі нашай краіны, паступова развіваць вакол Нясвіжа і Міра на ўзроўні еўрапейскіх стандартаў інфраструктуру камфартабельнага адпачынку і разнастайных забаў. Скажам, узвесці трох-чатырохзоркавую гасцініцу ў Нясвіжы. Каб айчынныя і замежныя турысты прыязджалі сюды не на аднадзённую экскурсію, а затрымліваліся на два—тры дні. Фінансавы эфект тады будзе на парадак вышэй.

Тут, праўда, складанасць у тым, што тэрытарыяльна Нясвіж і Мір знаходзяцца ў розных абласцях, але гэта і іншыя праблемы вырашальныя. Я ўпэўнена, што з часам такая зона будзе створана.

— Турыстаў вабяць не толькі прыгожыя помнікі даўніны, ім яшчэ хочацца дакрануцца ў новай краіне да невядомых рытуалаў, легендаў, звычаяў яе народа, пакаштаваць яго кулінарныя прысмакі. Але нашы кулінарныя прапановы, як мне здаецца, моцна адстаюць ад попыту. Няўжо так цяжка яго задаволіць?

— Аказваецца, што няпроста. Мы нават яшчэ не навучыліся частаваць турыстаў, і не толькі ў глыбінцы, сапраўднай нацыянальнай беларускай кухняй. У нас яшчэ няма паўнацэнных гастранамічных тураў, што ў іншых краінах звычайная справа. З-за шматлікіх азёраў і рэк Беларусь невыпадкова называюць сінявокай. А ці шмат дзе ў рэстаранах ці кафэ малых гарадоў і пасёлкаў, нават у турыстычных зонах, вы знойдзеце дастойнае рыбнае меню? Між тым еўрапейцы, у прыватнасці, заможныя заходнія турысты, у харчаванні перавагу часта аддаюць рыбным стравам. Мы ж ім часта прапануем не рыбацкую юшку, а банальныя супы, катлеты, шніцэлі, у лепшым выпадку дранікі. Дзе нашы мясныя далікатэсы, тая ж якасная, як у народзе кажуць, пальцам пханая каўбаса, паляндвіца, стравы з рыбы, ягад, натуральныя сокі з іх? І гэта пры тым, што наша нацыянальная кухня вельмі багатая і дасць фору любой еўрапейскай.

Вось гэта, на маю думку, справа для мясцовай улады. Ёй па сілах разам з мясцовымі прыватнікамі, інвестарамі адрадзіць славу беларускай кухні. Цікавы ход зрабіў Шклоў, дзе пачалі праводзіць свята Агурка. На яго збіраюцца як мясцовыя жыхары, так і турысты. Чаму б, напрыклад, не наладзіць свята Сыру ў адным з малых гарадоў?

— У нас, акрамя азёраў і рэк, нямала рыбных гаспадарак. Няўжо яны не зацікаўлены ў пастаўках сваёй прадукцыі прадпрыемствам харчавання?

— Так, мы думаем над тым, як больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці рыбных гаспадарак у турыстычных мэтах. Бо нават сам працэс гадавання рыбы з'яўляецца цікавым для турыстаў. Дык чаму б не сумясціць экскурсію па рыбнай гаспадарцы з абедам там ва ўтульным і экзатычна афармленым кафэ, дэгустацыяй рыбных страў? Я ўпэўнена, што многія турысты з задавальненнем яшчэ набылі б у дарогу некалькі вэнджаных рыбін.

Такі падыход быў бы выгадны і рыбным гаспадаркам. Тым больш што адкрыццё кафэ, невялікай крамы не патрабуе вялікіх грошай. Нягледзячы на тое, што гэта ідэя ляжыць на паверхні, справа рухаецца вельмі марудна. І тут мы моцна разлічваем на ўдзел мясцовай улады.

— А ці ёсць нейкі агульны сакрэт ці рэцэпт развіцця турыстычнай галіны менавіта ў малых гарадах і пасёлках?

— Адкажу проста. Калі да вас у госці прыязджаюць далёкія і пажаданыя родзічы ці сябры, то вы знойдзеце што ім паказаць, чым смачным пачаставаць і г.д. Ці, на турыстычнай мове гаворачы, арганізаваць тур. Вось прыкладна такое стаўленне пажадана выхоўваць мясцовай уладзе ў адносінах да турыстаў, вучыць землякоў праяўляць да іх спагаду і гасціннасць, прымаць іх радушна, хлебасольна, з выдумкай. Тады і яны дазволяць вам зарабляць на сабе.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Вадзіцель малакавоза Алег АЧКАС.

СТРАСЦІ па малаку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Малаказборшчыкі таксама на вагу золата — з-за невысокай, менш за 400 тысяч, зарплаты. У іх задачу ўваходзіць не толькі сабраць малако, але і праверыць яго якасць спецыяльным прыборам. Вопытным малаказборшчыкам — такім, як Анжэла Сухаверх ці Яўгенія Стульба — аднаго погляду на малако дастаткова, каб вызначыць яго якасць. Няякаснае, разбаўленае малако мае сіняватае адценне. Тут ужо і прыбор непатрэбны.

Разлічваюцца з людзьмі за малако 3 разы на месяц, выходзячы з кошту 550 рублёў за адзін літр (плюс 70 рублёў дзяржаўнай датацыі). Многа гэта ці мала? І што ў выніку маюць вяскоўцы? Анатоль Халопіца падлічыў, што за мінулы год жыхарам сельсавета, якія здавалі дзяржаве лішкі малака, выплацілі (у пераліку на у.е.) 186 тысяч долараў. Або, у сярэднім, па 805 долараў на адну карову. А ёсць жа сярод вяскоўцаў і такія, якія трымаюць іх па дзветры і нават па чатыры. Вось і падлічыце дадатковы заробак. Дадатковы — таму што асноўная маса вяскоўцаў занятая на працы ў СВК.

Напрыклад, Таццяна Халопіца працуе запраўшчыцай на мехдвары. Работу па спецыяльнасці (скончыла каледж фізвыхавання) Таня не знайшла, але на жыццё не скардзіцца. Разам з мужам, загадчыкам малочнатаварнай фермы СВК «Юшавічы», гадуе дваіх дзяцей. Маладая сям'я займае палову дома з выгодамі, які ім выдзеліла гаспадарка. Трымаюць карову і «зводзіць» яе не збіраюцца.

— Вучылася я ў горадзе, але жыць вырашыла ў вёсцы. І ніколькі аб гэтым не шкадую. Мы самастойная сям'я, даўно не сядзім на шыі ў бацькоў. Калі ўмееш працаваць і не лянуешся, у вясковым жыцці можна знайсці шмат плюсоў, — упэўнена Таццяна.

Яна не выключэнне з правілаў, як, магчыма, падумае нехта. У сельсавеце дастаткова маладых энергічных людзей, якія без усялякага падштурхоўвання займаюцца падсобнай гаспадаркай, здаюць дзяржаве не толькі лішкі малака, але і мяса, бульбу, агуркі, капусту...

Праўда, «пасыл» у іх цяпер некалькі іншы — у адрозненне ад старэйшага пакалення. Многімі рухае не столькі любоў да зямлі і ўсведамленне «звязанасці» з ёю, колькі жаданне зарабіць. Але гэта зусім не дрэнны пасыл, хоць магчыма, і не самы ўзнёслы. Паводле слоў Анатоля Халопіцы, усе грошы, атрыманыя ад вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, моладзь пераводзіць ва ўмоўныя адзінкі, каб потым набыць сучасную бытавую тэхніку ці машыну.

— Паглядзіце — раней каля адміністрацыйнага будынка і прахадной стаялі матацыклы і веласіпеды. А сёння — аўтамабілі, ды яшчэ і іншамаркі. Па 20—30 аўтамабіляў прыпаркавана. Хто на іх ездзіць? Вясковая моладзь. Як паказвае практыка, той, хто займаецца асабістым падворкам, не злоўжывае спіртным. У яго і сям'я нармальная, і дом дагледжаны, і ў доме парадак.

На ўвесь Юшавіцкі сельсавет — толькі тры няўдалыя сям'і. І гэта лепшы доказ высновы, зробленай Анатолем Халопіцам.

— Маючы галаву на плячах, у вёсцы сёння можна жыць, — упэўнены старшыня Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль Драгавец. — Толькі ў дадатак для гэтага неабходна мець 2—3 каровы і пару гектараў зямлі.

І Анатоль Драгавец (у мінулым, дарэчы, старшыня сельскага Савета), і Анатоль Халопіца згодныя з тым, што вясковая праца, мякка кажучы, нялёгкая, кожная «тысяча», а тым больш «мільён» зарабляюцца потам, а часам і слязьмі. Разам з тым, дзякуючы толькі падсобнай гаспадарцы жыхары Юшавіцкага сельсавета паклалі летась у свае кішэні 1 мільярд рублёў. Параўнайце: фонд зарплаты ў СВК «Юшавічы» склаў за год не нашмат больш — 1,6 мільярда. Інакш кажучы, праца на сябе па-ранейшаму застаецца для чалавека моцным стымулам. У тым ліку і ў сельскай мясцовасці. І гэты стымул неабходна ўсяляк падтрымліваць.

— Не будзе калгаса, не будзе і падсобнай гаспадаркі, — упэўнены Анатоль Халопіца. — Усё трымаецца на калгасе. Пакуль ён ёсць, будуць жыць у вёсцы і медыцына, і сацыяльная інфраструктура, і людзі. Усе гэтыя 3—4—5 кароў на падворку — яны ж калгасам кормяцца, кармы вяскоўцы бяруць або па сабекошце, або ўвогуле за бясплатна. Поўная апрацоўка «сотак» абыходзіцца калгасніку ў 2,5 тысячы рублёў — усяго! У нас і кароў на падворках засталося параўнальна многа таму, што чалавеку як нідзе дапамагае калгас — СВК «Юшавічы». Ужо гады тры людзі самі не займаюцца кармамі ды і на полі практычна не бываюць — за іх усё робіць гаспадарка.

І тым не менш... пагалоўе свойскай жывёлы зніжаецца. Нават пры такім, здавалася б, спрыяльным раскладзе. У першую чаргу таму, што вясковая праца ніколі не была і не будзе лёгкай. А кампенсацыя, атрыманая за яе ў выглядзе рублёў і «у.а.», далёка не ўсім падаецца адэкватнай.

— Пакет малака «Савушкін прадукт» каштуе ў магазіне 2130 рублёў, — гаворыць Анатоль Халопіца. — А людзі за літр сваёй прадукцыі атрымліваюць, з улікам датацыі дзяржавы, 620 рублёў. Як гаворыцца, адчуйце розніцу...

Наталля КАРПЕНКА.
Нясвіжскі раён.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Вяртанне Евы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Лячэнне ішло цяжка, то даючы надзею на выратаванне, то зноў яе забіраючы. Доўгія месяцы былі праведзены ў аддзяленні дзіцячай анкалогіі ў Бараўлянах пад Мінскам. Ці медыцына ў тыя часы не была настолькі дасканалай, ці сапраўды лёсам было так вызначана, але ў 1991-м Ева страціла свайго сына.

— Я думала, што ніколі не пераадолею гэту трагедыю, не выйду са стану роспачы. Але ж была праца, людзі навокал... Трэба было пераадольваць сябе, стрымліваць эмоцыі.

Можа, таму Ева Якавец лепей разумее тых, каму таксама давялося сутыкнуцца ў жыцці з рознымі выпрабаваннямі. Яна і па прыродзе сваёй з тых людзей, хто сапраўды здольны адчуваць і ўмее быць патрэбным. Разам мы зайшлі да адзінокай пенсіянеркі Яўгеніі Антанавіч. Ева даўно хацела наведаць сваю аднавяскоўку, супакоіць яе, суцешыць. Пасля смерці мужа Яўгенія Барысаўна дрэнна сябе адчувае, цяжка пераносіць адзіноту. І прыход Евы для яе сапраўды ў радасць, няхай сабе тая і ненадоўга зайшла.

Нялёгка было калісьці Еве вяртацца ў мастацкую самадзейнасць, у калектыў, які разам з аднавяскоўкай Настай Якавец стваралі. Але знайшла сілы, знайшла ў сабе веру. Сёння фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Лабчанка» мае званне народны і, калі вобразна сказаць, грыміць не толькі ў Лунінецкім раёне — па ўсёй краіне..

— Збіралі калектыў па хатах разам з Настай і першыя рэпетыцыі праводзілі то ў яе хаце, то ў школе, бо Дома культуры тады яшчэ не было, — прыгадвае старасta. — Людзі ў нас галасістыя, ведаюць даўнейшыя песні, таму мы і захавалі многія традыцыйныя абрады.

Калядная Звязда ў хате — на шчасце, дабрабыт і здароўе.

У доме пенсіянеркі Яўгеніі АНТАНОВІЧ.

Шмат разоў артысты з Лобчы здымаліся на Беларускім тэлебачанні, удзельнічалі ў буйных святах і фестывалях. Дзякуючы ім захаваўся вельмі старажытны абрад «Куст», жывуць і звіняць зажыначныя і касарскія песні і тым больш вясельныя. Сёння гэта не проста мастацкая самадзейнасць вёскі, а важная і неад'емная частка агульнай і вялікай мастацкай культуры краіны. Яе сапраўдны скарб.

Калі на палеткі са спелай збажыной выходзяць першыя камбайны, а бывае гэта звычайна на Пятра, папарадзе заўсёды ідуць жнеі. Сярод іх і Ева Якавец. Песня жняярак славіць поле і сялянскую працу, бласлаўляе хлеб. Яны ж звязваюць і першыя снапы.

— Як будзе хлеб, дык заўсёды будзе і песня, — кажа старасta вёскі Лобча.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ПАД НАГЛЯДАМ

Правільна кажуць у народзе, што старасць — не радасць. Вось чаму, у прыватнасці, на Гомельшчыне дзейнічаюць аддзяленні кругласутачнага знаходжання такіх катэгорый грамадзян у Калінкавічах і вёсках Холмеч Рэчыцкага, Прысно Веткаўскага, Беліцкае і Журавічы Рагачоўскага раёнаў. Усе яны ўваходзяць у склад тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтвам.

Людзі пражываюць тут па паўгода і плацяць за ўтрыманне 80 працэнтаў ад пенсіі. Сюды ўваходзіць харчаванне, медыцынская дапамога, комплекс іншых паслуг.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КРАМА НА КВАТЭРЫ

У Кобрыне пяцідзесяцігадовая беспрацоўная адкрыла гандаль залатымі вырабамі ў сваёй кватэры. Калі супрацоўнікі мясцовага РАУС правялі ў жанчыны вобыск, то знайшлі больш за 160 залатых вырабаў без пробы.

Ювелірныя ўпрыгажэнні пайшлі ў даход дзяржавы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

ДУМАЦЬ «ГЛАБАЛЬНА» ЦІ ЛІЧЫЦЦА З КОЖНЫМ?

або Жыццёвая праграма Чавусаў

«Смачны гарадок»

Гэта гандлёвая марка Чавускага завода, які вырабляе масла, сыр і іншую малочную прадукцыю. Днямі прадпрыемства адзначыць свой 35-гадовы юбілей, а таксама і пачатак стварэння новай сучаснай вытворчасці ў адпаведнасці з праграмай развіцця малых і сярэдніх гарадоў.

Нават улетку, калі шмат малака, завод працуе на палову сваіх сапраўдных магутнасцяў. Ва ўмовах сыравіннага недахопу вырашана пабудаваць новы цэх, які дазволіць перарабляць малочную сыроватку. Пакуль што частка яе ідзе на кармленне свіней, а большасць — проста выліваецца ў каналізацыю, якая ад гэтага яшчэ і шкодзіцца. Цяпер у Чавусах сыроватку будуць сушыць. Сухая малочная сыроватка з'яўляецца заменнікам неразведзенага малака. З яе, акрамя ўсяго іншага, робяць ежу для цялят — больш танную, але не менш пажыўную, чым неразведзенае малако. Зэканомленае ў гаспадарках малако, плануюць на заводзе, пойдзе да іх на перапрацоўку.

Дырэктар прадпрыемства Аляксандр Купцоў абяцае, што сёлета новая вытворчасць пачне працаваць. Вядомая славенская фірма ўжо выйграла тэндар на пастаўку абсталявання, і першыя машыны з тэхнікай перасеклі беларускую мяжу. Каштуе абсталяванне нятанна — 400 тысяч еўра, але банк забяспечыў завод крэдытам.

— У сувязі з развіццём малых гарадоў наша прадпрыемства карыстаецца падтрымкай, — запэўніў Аляксандр Купцоў. — Мы крэдыт атрымалі па льготнай стаўцы. А таксама летась зэканомілі на падатках паўмільярда рублёў — грошы былі скарыстаны для тэхнічнага пераўзбраення, паляпшэння санітарнага стану. Гэта патрабавалася для атрымання расійскага сертыфіката, бо значная частка прадукцыі завода, у першую чаргу сыры, экспартуецца ў Расію.

Праз 2,5 года, паводле разлікаў, выдаткі на праект акупяцца. На новай вытворчасці створаць 6 новых працоўных месцаў.

— Можа гэта і няшмат, бо на заводзе сёння працуе 180 чалавек, — каментуе Аляксандр Купцоў. — Але ў нашых Чавусах не так шмат магчымасцяў уладкавацца на працу. Так што камусьці дакладна пашанцуе.

Паліва — з адходаў

Яшчэ 6 жыхароў Чавусаў знайшлі працу на прыватным унітарным прадпрыемстве Ігара Мельнікава, якое месціцца ў вёсцы Вілейка, што за пяць кіламетраў ад райцэнтра. У студзені тут пачалі вырабляць паліўныя брыкеты.

Калісьці Мельнікаў убачыў тэлевізійны рэпартаж пра новыя віды мясцовага паліва і загарэўся перспектыўнай ідэяй. За тры гады ён арганізаваў справу. Пры падтрымцы ўладаў адрамантаваў закінуты цялятнік і знайшоў у Беларусі фірму, якая вырабляе патрэбнае абсталяванне.

Паліўныя брыкеты робяцца з адходаў дрэваапрацоўкі. Стружка і абрэзкі драўніны спачатку сушацца, а потым прэсуюцца ў акуратныя трубачкі. Гэта паліва добра гарыць і мае вялікую цеплааддачу.

Першыя партыі ўжо гатовыя да адпраўкі ў замежжа. На экспарт тона брыкетаў каштуе 400 еўра, а абрэзкі прадаюцца ў Чавускім раёне па 146 тысяч рублёў за тону. Рынак збыту, упэўнены Ігар Віктаравіч, будзе з цягам часу толькі пашырацца.

Цяпер за суткі ў Вілейцы можна вырабляць 4 тоны паліўных брыкетаў. Работнікі атрымліваюць заробак ад зробленага: за тону — 20 тысяч рублёў. У месяц удаецца зарабіць у сярэднім па 700 тысяч рублёў, калі ў Чавусах сярэдні заробак — 480 тысяч.

Сыравіну прыватнік набывае на суседніх піларамах. Адно дрэнна: там выкідаюць стружку і адходы на вуліцу, пад дождж і снег. Таму Мельнікаў марыць набыць другі паўразбураны цялятнік па суседстве і зрабіць там склад сыравіны, каб спакойна працаваць і развівацца.

— Нікога нельга прымусіць ствараць прадпрыемствы і новыя працоўныя месцы, — тлумачыць Ігар Віктаравіч. — У чалавека павінна выспець такое жаданне.

Добрыя дакументы і дрэнныя інструкцыі

Думаць пра павелічэнне вытворчасці (а значыць, падаткаў) і дапамагаць станаўленню прыватнай ініцыятывы павінны чыноўнікі. Прыватнікі просяць іх не караць за правіннасці, а дапамагаць — тлумачыць, як зрабіць правільна.

Праблемы вытворчасці кабелю і правадоў ужо неаднойчы прасіў паставіць на парадак дня кіраўнік чавускага прадпрыемства «Пошук-1» Міхаіл Пехцераў. Міхаіл Фёдаравіч займаўся электрамантажом у савецкі час, калі кабель быў вялікім дэфіцытам. Ідэя арганізаваць сваю справу рэалізавалася ў прадпрыемстве «Пошук-1», якое працуе ўжо 10 гадоў і з'яўляецца самым буйным падаткаплацельшчыкам сярод прыватных.

На прадпрыемстве выпускаюць 150 найменняў прадукцыі, але апошнім часам кола спажыўцоў звузілася.

— Таму што нашы канкурэнты з Расіі і ўвогуле з замежжа маюць больш спрыяльныя ўмовы, — тлумачыць Пехцераў. — Маю прадукцыю бралі фірмы, якія гандлююць электраабсталяваннем. Аднак на беларускую прадукцыю можна рабіць нацэнку толькі ў 20 працэнтаў, а рэальна — яшчэ меней. Затое на замежную нацэнка можа складаць да 30 працэнтаў плюс транспартныя выдаткі. Няхай наша прадукцыя будзе больш танная і больш якасная, але фірмам выгадна набываць кабель і правады ў замежнікаў. Атрымліваецца, што менавіта іх стымулююць нашы законы.

Міхаіл Пехцераў выступае і супраць рэгістрацыі цэнаў на сваю прадукцыю. Калі павялічваецца цана на метал — нават у некалькі разоў, прадпрыемства не мае права падняць кошт сваёй прадукцыі. Як, дарэчы, не мае права і панізіць цану, хоць з-за гэтага можна і тэндар прайграць. У выніку, расказвае кіраўнік «Пошуку-1», асартымент звужаецца, а замест айчыннай прадукцыі на рынак завозіцца замежная.

Сёння ў чавускага прыватніка хапае рэсурсаў на тое, каб забяспечыць працай і заробкам 16 сваіх работнікаў. Аднак магчымае павелічэнне аб'ёмаў прадукцыі на 50—70 працэнтаў — пакуль толькі ў планах.

— Нібыта і добрыя дакументы выходзяць, а як абрастуць інструкцыямі — сэнс знікае. Найбольш спрыяе нам мясцовая ўлада, таму што праграма развіцця малых гарадоў — гэта клопат тутэйшых. Яны не думаюць «глабальна», а лічацца з кожным чалавекам, які прыносіць капейку ў бюджэт.

Вяртайцеся, мужыкі!..

Дэвіз чавускіх уладаў — «зялёная вуліца» для інвестыцыйных праектаў, якія створаць новыя працоўныя месцы і ў будучым папоўняць мясцовы бюджэт.

— Любое пытанне, якое ў нашай кампетэнцыі, мы вырашым, — запэўнівае старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Чыканаў. — Аднак, як паказала практыка, асноўная маса «прабуксовак» адбываецца ў сталіцы, падчас узгадненняў. Ледзь не год могуць хадзіць паперы па інстанцыях. Верагодна, можна хутчэй?..

Летась Чавускі раён з немалога спісу інвестыцыйных праектаў рэалізаваў палову, частка з іх нарэшце запрацуе сёлета. Як, напрыклад, завод па перапрацоўцы гумавых вырабаў «Экамаш» — зацягнулася перадача нерухомасці, што, зноў жа, залежала ад сталічных інстанцый.

У 2008 годзе на парадку дня — больш за два дзесяткі праектаў, якія закранаюць горад і сельскія тэрыторыі. Адкрыецца вытворчасць пенабетонных блокаў, у фермерскай гаспадарцы «Клубнічная» з'явіцца гадавальнік і ягады, «Дусен» пасадзіць пладовы сад, пашырыцца прыдарожны сэрвіс, у Чавусах будаўнічая фірма з абласнога цэнтра зробіць забаўляльны цэнтр.

— Каб забяспечыць паспяховае выкананне праектаў, за кожным з іх замацаваны прадстаўнік улады, — паведаміла намеснік старшыні Чавускага райвыканкама Ларыса Шундалава. — Бясспрэчна, усё рухаецца, але пакуль не так хутка, як хацелася б.

Але планы вялікія: летась у Чавускім раёне стварылі 300 новых працоўных месцаў, сёлета павінна з'явіцца больш за 200.

— Паводле праграмы развіцця райцэнтра, у 2010 годзе сярэдні заробак жыхароў павінен дасягнуць 400 долараў, — дадае Аляксандр Чыканаў.

— Шмат мужыкоў з нашых мясцін з'ехала на заробкі ў Расію, — сказаў прэсоўшчык Дзмітрый Макараў, якому пашанцавала дзесятак гадоў таму знайсці добрую працу на прадпрыемстве «Пошук-1». — Я сваёй працай даражу. Але знайсці такое месца, дзе б заробак плаціліся не для таго каб існаваць, а каб жыць, у малым горадзе нялёгка. Спадзяюся, што нашым мужчынам будзе куды вярнуцца.

Ілона ІВАНОВА,
Чавускі раён.

ПАЛТАРА МІЛЬЁНА — НА ПЯЦЬ РАЁНАЎ

Урад гэтай краіны адобрыў выдзяленне з Мэтавага фонду ААН 1,5 млн долараў ЗША на рэалізацыю праекта на тэрыторыях Беларусі, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Праект разлічаны на тры гады і непасрэдна закране як мінімум 50 тысяч жыхароў Слаўгарадскага, Столінскага, Чачэрскага, Брагінскага і Лунінецкага раёнаў.

Так, плануецца прадастаўленне экспертнай і тэхнічнай дапамогі па ўкараненні бяспечных і малазатратных метадаў вядзення сельскай гаспадаркі, павышэнне яе прадукцыйнасці і садзейнічанне доступу на рынкі збыту. Адзін з важных накірункаў — павышэнне інфармаванасці мясцовага насельніцтва аб карысці здаровага ладу жыцця. З гэтай нагоды адбудуцца сустрэчы спецыялістаў з цяжарнымі жанчынамі і членамі іх сем'яў, іншыя мерапрыемствы ў фельчарска-акушэрскіх пунктах і амбулаторыях.

Адначасова мяркуецца істотна павысіць узровень ведаў аб радыяцыйнай бяспецы сярод дзяцей і падлеткаў. З гэтай нагоды плануецца стварэнне школьных цэнтраў радыяэкалагічнага інфармавання і навучання.

Леанід ТУГАРЫН.

Рэха публікацыі

«З аўтаномнымі электракардыёграфамі праблем няма»

У нумары «Звязды» за 11 студзеня 2008 года быў змешчаны артыкул Надзеі Ніколаевай «103: яна і хуткая, і неадкладная», дзе аўтарам узнімаліся пытанні ўдасканалення арганізацыі работы рэспубліканскай службы хуткай медыцынскай дапамогі, а таксама выкананне мінімальных сацыяльных стандартаў у гэтай сферы. Пасля выхаду публікацыі мы атрымалі афіцыйнае рэагаванне з Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, у якім кіраўніцтва камітэта паведамляла аб выніках работы сталічнай службы хуткай медыцынскай дапамогі за 2007 год:

«Задачы па аказанні хуткай медыцынскай дапамогі, медыцынскім забеспячэнні сацыяльна-значных, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў былі выкананы ў 2007 годзе службай хуткай медыцынскай дапамогі г. Мінска ў поўным аб'ёме.

З 1 студзеня 2007 года ў сталічнай службе хуткай медыцынскай дапамогі працавалі 144 брыгады, што адпавядае мінімальнаму сацыяльнаму стандарту — 1 брыгада на 12 500 жыхароў. Для выканання мінімальнага сацыяльнага стандарта, з улікам росту насельніцтва Мінска за 2007 год, з 1 студзеня 2008 года дададзены яшчэ 2 брыгады хуткай медыцынскай дапамогі.

Камітэтам па ахове здароўя Мінгарвыканкама ў 2007 годзе было выдзелена з бюджэту на хуткую медыцынскую дапамогу 40,1182 млрд беларускіх рублёў, з іх у неабходнай колькасці выдзяляліся сродкі на медыкаменты, медыцынскае абсталяванне, рамонт будынкаў, набыццё форменнага адзення і іншыя патрэбы.

За 2007 год для службы хуткай медыцынскай дапамогі было закуплена: 59 апаратаў ЭКГ, 19 дэфібрылятараў, 14 апаратаў ІВЛ, 40 глюкометраў, 72 танометры, 2 цеплаізаляцыйныя трубкі-кантэйнеры, 30 каркасных насілак, 10 плашчовых насілак і г.д. На сёння ўсе брыгады хуткай дапамогі аснашчаны аўтаномнымі электракардыёграфамі і сродкамі сувязі, у тым ліку радыёстанцыямі, транкінгавай сувяззю, тэлефонамі сотавай сувязі. Усе спецыялізаваныя брыгады аснашчаны аўтаномнымі дэфібрылятарамі.

У сталічнай службе хуткай медыцынскай дапамогі працуюць 4 рэанімабілі, што адпавядае патрабаванням загада Міністэрства аховы здароўя № 164 ад 31 жніўня 1992 года «Аб удасканаленні арганізацыі хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі» — 1 рэанімацыйная брыгада на 500 000 насельніцтва.

У 2007 годзе для патрэбаў мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі КУП «Мінсксанаўтатранс» было набыта 25 санітарных аўтамабіляў тыпу «Газэль» і 1 рэанімацыйны аўтамабіль — за кошт сродкаў Міністэрства аховы здароўя.

У 2007 годзе 4 аўтамабілі Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі былі аснашчаны сістэмай спадарожнікавага кантролю і кіравання транспартам «Дыспетчар», якая дазваляе з высокай дакладнасцю вызначыць месцазнаходжанне кожнай машыны і паказаць яго на электроннай карце горада. У 2008 годзе плануецца аснасціць ёй яшчэ 10 аўтамабіляў.

З леташняга года на Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі працуе адзіны ў службе хуткай медыцынскай дапамогі краіны псіхолаг. Мэта яго работы — аказанне практычнай дапамогі кіраўніцтву ў пераадоленні супрацоўнікамі фактараў негатыўнага псіхаэмацыянальнага ўпływу ўмоў працы (удасканаленне прафесійнага адбору супрацоўнікаў Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, навучанне персаналу асновам псіхалагічных ведаў).

Для забеспячэння мераў асабістай бяспекі супрацоўнікаў адпрацаваныя пытанні ўзаемадзеяння Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі і ГУУС Мінгарвыканкама. Далейшае развіццё сталічнай службы хуткай медыцынскай дапамогі будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Праграмай развіцця службы хуткай медыцынскай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь на 2008—2010 гады, зацверджанай пастановай калегіі Міністэрства аховы здароўя».

У суд Бабруйскага раёна і горада Бабруйска Магілёўскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак грамадзянкі **КУЛЬША Пелагеі Пракопаўны**, 1932 года нараджэння, ураджэнкі г. Бабруйска, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Бабруйск, вул. Чапаева, д. 48.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзянку **КУЛЬША П.П.**, паведаміць іх суду Бабруйскага раёна і г. Бабруйска, пак. 42, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Краіна здароўя

Выпуск № 6 (62)

Бяспечнае харчаванне

Якую Е-жу можна Е-сці?

Літарныя і лічбавыя абазначэнні можна ўбачыць у складзе самых розных прадуктаў

Літарай Е і трохзначным індэксам ва ўсім свеце прынята абазначаць харчовыя дабаўкі. Напрыклад, адной з першых харчовых дабавак быў усім вядомы воцат. У сувязі з ускладненнем тэхналогіі вытворчасці прадуктаў узнікаюць і новыя. . Многія спажыўцы ставяцца да іх прадузята, але на самай справе сярод дабавак ёсць і прыродныя рэчывы, якія прыносяць даказаную карысць арганізму. Напрыклад, пекціны, якія валодаюць вартасцю выводзіць таксічныя рэчывы, у тым ліку радыянукліды. Усе харчовыя дабаўкі праходзяць выпрабаванні на бяспеку. Сёння ва ўсім свеце іх налічваецца велізарная колькасць. Так, індэксы, якія пачынаюцца з Е 100 і даходзяць да паказчыкаў Е 182, азначаюць фарбавальнікі, Е 200 і далей — кансерванты, Е 300 і далей — антыакісляльнікі (папярэджваюць псаванне прадуктаў), Е 400 і далей — стабілізатары (захоўваюць зададзеную кансістэнцыю), Е 500 і далей — эмульгатары (яны падтрымліваюць пэўную структуру), Е 600 і вышэй — узмацняльнікі смаку і водару. Некаторыя харчовыя дабаўкі, якія выкарыстоўваюцца за мяжой, не дазволены на тэрыторыі Расіі і нашай краіны, напрыклад, Е 123 — фарбавальнік амарант або Е 240 — кансервант фармальдэгід.

Несумленныя журналісты так часта палохаюць неразборлівых у гэтым сэнсе спажыўцоў, што ў апошніх ужо развілася штосьці падобнае на панічныя настрої. Людзі перакананыя: ужываць можна толькі той тавар, які не ўтрымлівае Е. Усё астатняе — атрута. На самай справе не існавала і не існуе прадуктаў харчавання, вырабленых без дабавак, а значыць,без «лічбавага» кода. Іншая справа, калісьці ў нашай краіне наогул не існавала неабходнасці размаўляць са спажыўцом на мове, скажам, еўрапейскіх стандартаў. Дабавак Е сапраўды можа быць выкарыстана крыху больш ці крыху менш, а некаторыя прыватныя кампаніі наогул могуць папросту не паведамляць усё, што было выкарыстана. Так што варта яшчэ падумаць, якой этыкетцы даверяць больш.

Расійскія эксперты мяркуюць, што НАСТУПНЫЯ ДАБАЎКІ хоць і адносяцца да ліку дазволеных, але З'ЯЎЛЯЮЦЦА НЕБЯСПЕЧНЫМІ

для алергікаў:

Е131, Е132, Е160b, Е210, Е214, Е217, Е230, Е231, Е232, Е239, Е311, Е313;

для астматыкаў:

Е102, Е107, Е122-124, Е155, Е211-214, Е217, Е221-Е227;

для печані і нырак:

Е171-173, Е220, Е302, Е320-Е322, Е510, Е518;

для шчытападобнай залозы:

Е127;

для скуры:

Е230-Е233;

для кішэчніка:

Е220-Е224;

для стрававання:

Е338-341, Е407, Е450, Е461, Е463, Е465, Е466;

для развіцця плода:

Е233;

для маленькіх дзяцей:

Е249, Е262, Е310-312, Е320, Е514, Е623, Е626-635;

уплываюць на ўзровень халестэрыну:

Е320;

разбураюць вітаміны ў арганізме:

Е220, Е222-227, Е320

Калі ж мы цалкам адмаўляем Е, значыць, мы выказваем вотум недаверу вытворцам, вучоным, санітарным службам і г.д. і г.д. Чым тут можна дапамагчы? Паспрабуйце наогул не наведваць магазін — вырошчвайце і вырабляйце ўсю прадукцыю самі! У адваротным выпадку застаецца мець на ўвазе: кожнае рэчыва, якое выкарыстоўваецца сёння ў харчовай прамысловасці, праходзіць складаны шлях праверак і выпрабаванняў. І не забывайце аб тым, што раяць дыетолагі: не захапляцца аднымі прадуктамі. Чым больш разнастайным будзе ваша меню, тым менш шанцаў з'есці крытычную дозу якога-небудзь «асабліва шкоднага» Е (вялікіх скептыкаў гэта думка павінна суцешыць).

Святлана БАРЫСЕНКА.

Доктар адкажа

На гэтым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

6 лютага — галоўны ўрач 12-й мінскай гарадской паліклінікі Вячаслаў Іванавіч ГРАНЬКОЎ.

7 лютага — галоўны ўрач 36-й мінскай гарадской паліклінікі Віталь Вітальевіч ПАЛЯШЧУК.

8 лютага — галоўны ўрач сталічнай гарадской інфекцыйнай бальніцы Мікалай Мікалаевіч ЮРОЎСКІ.

У графіку магчымыя змяненні.

Для загартоўкі, для сілы

Плавальны басейн Калінкавічаў працуе дзесяць месяцаў у годзе. У ім вучацца плаваць дзеці з ранняга ўзросту, тут займаецца ў спартыўнай секцыі 170 чалавек, тут заключаны дагаворы з 43 арганізацыямі на наведванне яго па абанементах іх работнікамі. На жаль, падобны малюнак назіраецца не ва ўсіх раёнах Гомельшчыны. У адных плавальных басейнаў зусім няма, у іншых яны не працуюць. Таму на чарговым пасяджэнні аблвыканкама было вырашана змяніць сітуацыю: аднавіць, рэканструяваць басейны, дзе яны ў заняпадзе. Дарэчы, пастаўлена і пытанне, каб будаваліся яны і ў рамках дзяржаўнай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Прамая лінія

НАША СКУРА — ЛЮСТЭРКА ІМУНІТЭТУ

Адказвае ўрач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 30, 31 студзеня 1, 2 і 5 лютага.)

☎ — Вера Антонаўна, Мінск. Ці трэба выдаляць тлушчавікі? Што гэта такое, як ад іх пазбаўляцца?

— На жаль, я вас не бачу і не магу ведаць, што канкрэтна вы маеце пад гэтым словам. Магчыма, сапраўды маюць быць гэтыя ўтварэнні. Важна, дзе яны размешчаны, ці не траўмуюцца. Паколькі ў выніку пастаяннага траўмавання яны пачнуць паступова расці. Калі ж утварэнні вам не перашкаджаюць, вы не бачыце ў гэтым ніякага касметычнага дэфекту, то можаце і не пазбаўляцца іх.

☎ — Мінск непакоіць, Ірына Пятроўна. Мне 65 гадоў. Пакутую ад вялікай колькасці папілом. Як спыніць іх рост і дзе можна гэта зрабіць на дзяржаўнай падставе?

— Папіломы можна выдаляць. І лепей за ўсё гэта рабіць, паколькі яны маюць вірусную паходжанне, а значыць, там, дзе сёння была адна, заўтра можа быць больш. Звярніцеся, калі ласка, да тэрапеўта. Важна высветліць, у сувязі з чым назіраецца іх рост — з павышаным потааддзяленнем ці з магчымымі хранічнымі захворваннямі, якія і правакуюць утварэнне папілом. Як правіла, такія працэсы суправаджаюцца парушэннем работы імуннай сістэмы, а тая ў сваю чаргу пакутуе ад нейкіх хранічных паталогій. Выдаленне папілом — працэдура платная.

☎ — Лёзна, Раіса Міхайлаўна. У мяне летам — грыбок, а зімой — герпес. Як лячыцца?

— Вірус герпесу можа актывізавацца як пасля пераахаладжэння, так і пасля перанагравання. Так што яго лячэннем варта заняцца разам з дэрматолагам. Яму ж раскажыце і пра грыбок. Бо калі вы яго ніколі не лячылі, то малавераго дна, што ён у вас знік. Грыбок не можа з'яўляцца і знікаць. Вам патрэбна сістэмнае лячэнне, прызначыць якое можа толькі спецыяліст.

☎ — Лілія Вікенцьеўна, Стоўбцы. Мне зараз 69 гадоў. Пасля 60 на твары, на скронях, з'явіліся цёмныя плямы. Што гэта можа быць і як спыніць працэс?

— Вас павінен паглядзець дэрматолаг, паколькі тыя сімптомы, якія вы называеце, могуць сведчыць як аб ачаговай гіперпігментацыі, так і аб узроставых змяненнях скуры. Спыніць падобныя працэсы здольны дэпігментуючыя крэмы. Аднак іх нельга прымяняць, пакуль не будзе дакладна ўстаноўлена, што ў вас мае быць. Пры той жа кератоме вышэйпамянёныя крэмы могуць толькі паспрыяць яе разрастанню.

☎ — Ніна Аляксееўна з Мінска. Мне 40 гадоў. На твары, пераважна ў вобласці падбародка і каля рота з'явіліся болькі. Як толькі адны сыходзяць, з'яўляюцца іншыя. Што гэта магло б быць?

— Завочна сказаць немагчыма, але падобнага кшталту высыпанні могуць сведчыць аб перыяральным дэрматыце. Пакажыцеся, калі ласка, свайму дэрматолагу. У Мінску такія спецыялісты прымаюць па тэрытарыяльнай прыкмеце. Ёсць асноўны дыспансэр на Прылуцкай, 46А і два філіялы — на Смалячкова, 1 і Нахімава, 4.

☎ — Уздзенскі раён, Канстанцін Іванавіч. Вось ужо гадоў 5—7 пакутую ад псарыязу. Лячыўся ў Астрашыцкім гарадку. Рабілі ўколы, пераліванне крыві, прымянялі ўльтрафіялетавае абпраменьванне... Усё роўна псарыяз застаецца на руках, нагах, галаве. Якім можа быць далейшае лячэнне?

— Псарыяз — хранічнае захворванне, пры якім перыяд абвастрэння змяняецца перыядам рэмісіі. У час абвастрэнняў трэба лячыцца — амбулаторна ці ў стацыянары. Аб'ём працэдур і лекаў трэба вызначаць з дэрматолагам.

☎ — Вілейка, Галіна Станіславаўна. Дачцэ — 34 гады. Гадоў 10 у яе — высыпанні на твары. Накшталт крапіўніцы. Прычыну не ведам. Алергію ўрачы адмаўляюць. Як трапіць на прыём да дэрматолага?

— Дэрматолаг прымае па месцы жыхарства. Калі лячэнне, якое там будзе прызначана, акажацца малаэфектыўным, значыць, дачку накіруюць у вобласць, а пасля — у Рэспубліканскі кансультацыйны цэнтр, што ў мінскім скурна-венералагічным дыспансэры. Можаце пад'ехаць сюды адразу і пракансультавацца платна.

☎ — Вера Сцяпанаўна патурбавала, з Лагойскага раёна. Мне 71 год. Вельмі даўно, з 1964 года, пакутую ад псарыязу. Не так даўно быў інфаркт. Скажыце, ці могуць быць звязаны гэтыя захворванні?

— Стрэс можа стаць прычынай і інфаркту, і псарыязу. Але ў дачыненні да псарыязу можна сказаць, што ёсць і спадчыннасць.

☎ — Аляксандр, Слуцк. Раніцай моцна сохне скура твару. Што вы параіце?

— Перш-наперш варта пачаць з такога простага касметычнага сродку як спажыўны крэм. Калі сухасць назіраецца раніцай, то лепей за ўсё нанесці крэм на сухія ўчасткі скуры звечара.

☎ — Ірына Віктараўна з Брэста. Падкажыце, як можна перамагчы вірус герпесу 2-га тыпу? Ці можа герпес актывізавацца падчас цяжарнасці?

— Вірус герпесу перамагчы нельга. Ён убудоўваецца ў ДНК клеткі. Герпес 2-га тыпу — гэта генітальны герпес, які перадаецца палавым шляхам. Што датычыцца цяжарнасці, то ў гэты час змяняецца гарманальны фон, органы і сістэмы працуюць па-іншаму, а значыць, вірус можа актывізавацца. Неабходна напярэдадні запланаванай цяжарнасці правесці імунную тэрапію і далей проста назірацца ва ўрача. Майце на ўвазе, што вірус герпесу ёсць у больш як 90 працэнтаў насельніцтва планеты, праўда, клінічныя праяўленні назіраюцца толькі ў 15—20 працэнтаў.

— Скажыце, ці праўда, што платныя медцэнтры, якія займаюцца дыягностыкай інфекцый, што перадаюцца палавым шляхам, выяўляюць захворванні, якіх на самай справе ў пацыента няма, прапануюць пасля псеўдалячэнне?

— Мы не зацікаўленыя ў гіпердыягностыцы. Наш дыспансэр імкнецца накіроўваць пацыента на даследаванні ў дзяржаўных структурах, калі самі не можам правесці тыя ці іншыя даследаванні. З намі супрацоўнічае ў гэтым сэнсе цэнтральная навукова-даследчая лабараторыя Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, якая размешчана ў Бараўлянах.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

Эпідэмія грыпу ў сталіцы — на пад'ёме

Паводле інфармацыі рэспубліканскай санэпідслужбы, на пачатак тыдня эпідэмій грыпу былі ахопленыя ў Беларусі 7 кантрольных гарадоў і 27 адміністрацыйных тэрыторый.

Да тэрыторый, дзе яшчэ раней быў разгорнуты комплекс проціэпідэмічных мерапрыемстваў, далучыліся Асіповіцкі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Старадарожскі, Капыльскі, Крупскі, Асіповіцкі, Чашніцкі, Слонімскі, Любанскі, Слуцкі, Салігорскі, Драгічынскі, Смаргонскі раёны, гарады Бабруйск (з 30 студзеня) і Салігорск (з 31 студзеня). Сталічныя медыкі паведамляюць, што на мінулым тыдні ў Мінску працягваўся эпідэмічны пад'ём захваральнасці насельніцтва на ВРВІ і грып. Так, за перыяд з 28 студзеня па 3 лютага ў сталічныя ўстановы аховы здароўя з сімптомамі прастуды звярнуліся больш як 40 тысяч чалавек, што ў 1,3 раза перавышае паказчык за папярэдні тыдзень. 52 працэнты ад агульнай колькасці захваравалых складаюць дарослыя. Сярод дзяцей самыя высокія паказчыкі захваральнасці рэгіструюцца ва ўзроставых групах 3—6 і 7—14 гадоў. За тыдзень у стацыянары былі шпіталізаваныя 336 чалавек, у тым ліку 298 дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СПАРТЫЎНЫ ТУРНІР У АГРАГАРАДКУ

У Фашчаўцы Шклоўскага раёна прайшоў традыцыйны спартыўны турнір. Яго ўдзельнікі гулялі ў валейбол, міні-футбол і шашкі. Паміж сабой спаборнічалі каманды працаўнікоў эксперыментальнай базы «Спартак» і, з іншага боку, шклоўскіх ветэранаў спорту, да якіх далучыліся маладыя настаўніцы, работнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях і завода газетнай паперы. Перамога ў міні-футболе і валейболе дасталася шклоўцам, а ў шашках сталі лепшымі сельскія працаўнікі. Пераможцам уручылі граматы і падарункі, а гаспадарка пачаставала аматараў спорту добрым абедам.

Ілона ІВАНОВА.

Жыхарка аграгарадка Сноў Нясвіжскага раёна Галіна БАРТАШЭВІЧ з унучкамі Ангелінай і Карынай

Ангеліна, Карына і баба Галіна

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА

Хуткая дапамога

Лекавы «дымок» для хворых органаў дыхання

Рэспіраторныя інфекцыі адносяцца да ліку самых распаўсюджаных хвароб і складаюць прыкладна палову ад агульнай колькасці вострых захворванняў. Нягледзячы на тое, што яшчэ ў 1979 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендавала звярнуць першачарговую ўвагу на распрацоўку эфектыўных метадаў прафілактыкі і своечасовай дыягностыкі рэспіраторнай паталогіі ў дзяцей, колькасць гэтых хворых няўхільна расце. Любое дзіця штогод перажывае ў сярэднім 3—5 эпізодаў вострых рэспіраторных захворванняў, хвароб верхніх і ніжніх дыхальных шляхоў.

Штогод грып і вострыя рэспіраторныя захворванні пераносяць каля 3 мільёнаў беларусаў, і палова з іх — менавіта дзеці. Паводле даных Міністэрства аховы здароўя, павялічылася колькасць хворых дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў. Пераважалі якраз хваробы органаў дыхання: у 70 працэнтах выпадкаў урачы ўстанаўлівалі рэспіраторныя інфекцыі, бранхіты, бранхіяльныя астмы. 26 працэнтаў гэтых захворванняў — хранічныя.

— Імунітэт дзяцей — недасканалы, фарміруецца дзесьці да 12—14 гадоў, таму менавіта сярод самых маленькіх так шмат тых, хто часта хварэе, — да шасці і больш разоў у год, — кажа намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы санаторыя «Беларусачка» Вольга НОВІКАВА. — Верхнія дыхальныя шляхі падвяргаюцца запаленчаму паражэнню па шэрагу прычын. Слізістая абалонка поласці носа і глоткі першай сустракаецца з уздзеяннем фактараў знешняга асяроддзя: вірусамі, бактрыямі, алергенамі, з-за чаго на яе паверхні з`яўляецца запаленчая рэакцыя. Патагенныя мікробы выклікаюць захворванне, лячэнне якога можа быць у некаторых выпадках распяховым, а ў некаторых — з ускладненнямі, такімі, як бранхіяльная астма, пнеўманія, паражэнні сэрца, нервовай сістэмы і іншыя...

Метады лячэння дзеляцца на медыкаментозныя і немедыкаментозныя. Пад першымі варта разумець ужыванне медыкаментаў, як правіла, антыбіётыкаў. Сёння спецыялісты кажуць, што ўжыванне антыбіётыкаў з першага дня захворвання паказана не ўсім дзецям. Мяркуецца, што ў першыя тры дні, калі няма высокай тэмпературы і спадарожных цяжкіх хвароб, можна прытрымлівацца тактыкі чакання. Аднак чакаць ці не — павінен вырашыць урач.

Пад немедыкаментознай тэрапіяй разумеюць ужыванне, скажам, настояў траў — спецыяльных лекавых збораў, якія прадаюцца ў аптэцы і рэкамендуюцца да ўжывання на прыёме ва ўрача, а таксама інгаляцыі. Што датычыцца дастаўкі лякарства ў дыхальныя шляхі, то тут існуе некалькі тыпаў сістэм: дазіраваныя інгалятары, камбінацыя дазіраваных інгалятараў са спейсэрамі, парашковыя інгалятары і небулайзеры.

У санаторыі «Беларусачка», напрыклад, шырока выкарыстоўваюць небулайзеры, якія называюць яшчэ кампрэсарнымі інгалятарамі. Небулайзеры бываюць і ўльтрагукавымі, аднак менавіта кампрэсарныя сталі «залатым стандартам» інгаляцыйнай тэрапіі.

Небулайзер прымяняецца ўжо больш за сто гадоў. Само слова паходзіць ад лацінскага «небула» — туман, воблачка. Сучасныя апараты ператвараюць лекавы прэпарат у аэразоль з асабліва дробнадысперснымі часціцамі, здольнымі пранікнуць у бронхі, альвеолы лёгкіх. Такім чынам удаецца дасягнуць эфектыўнага выніку за кароткі час — 5—10-хвілінны сеанс. Каштоўны прэпарат хутка і ў патрэбнай высокай канцэнтрацыі трапляе на слізістую носа, бронхаў, у дыхальныя шляхі, дзе купіруе вірусную інфекцыю. Простая працэдура не выклікае ў дзяцей адмоўных эмоцый. Нездарма санаторныя пацыенты жартаўліва прызвалі працэс «падыхаць дымком».

ЯК ВЫБРАЦЬ НЕБУЛАЙЗЕР?

1. Выбар апарата для хатняга выкарыстання вызначаецца клінічнай сітуацыяй, якую лепш абмеркаваць з урачом.

2. Для тых, хто часта хварэе, лепш выбіраць апарат з пераменным рэжымам дастаўкі аэразоля.

3. Неабходна ўлічваць камплектнасць: мундштук, насавыя канюлі і маскі розных памераў. Дзецям ва ўзросце да 5 гадоў у большасці выпадкаў лепш выкарыстоўваць маску, таму што ім цяжка кіраваць дыханнем.

4. У пашпарце небулайзера варта звярнуць увагу на сярэдні памер часціц аэразоля (менш за 5 мкм), а таксама на хуткасць патоку рабочага газу.

5. Звяртайце ўвагу на рэкамендаваныя тэрміны замены камеры.

Небулайзер-тэрапія можа прымяняцца з першых месяцаў жыцця, яна практычна не мае проціпаказанняў. Не рэкамендуецца яе выкарыстанне, бадай, толькі пры высокай тэмпературы. Такую немедыкаментозную тэрапію можна праводзіць і ў хатніх умовах. Кошт небулайзера не перавышае 200 тысяч рублёў, а карыстацца ім можа ўся сям'я. Прычым не толькі ў лячэбных, але і ў прафілактычных мэтах, калі ёсць неабходнасць увільгатнення слізістай, для папярэджання запалення. У апошнім выпадку замест спецыяльных фізіялагічных растворaў выкарыстоўваюцца мінеральная вада або адвары траў.

— Самае важнае — вытрымліваць дазіроўку, — тлумачыць Вольга Новікава. — Лепш за ўсё набываць гатовыя сумесі і гатаваць так, як указана на ўпакоўцы...

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗРАБІ ПАЎЗУ — ПРАДУХІЛІ СТРЭС

Усе мы штосьці чулі пра стрэс і нават прыблізна здагадваемся, чым можа пагражаць хранічны трывожны стан, але наўрад ці ўсур'ёз усведамляем, наколькі цесна гэтыя паняцці могуць быць звязаныя са шматлікімі фізічнымі захворваннямі — ад артэрыяльнай гіпертэнзіі да бранхіяльнай астмы і язвы страўніка. Як жа перамагчы трывогу і «прыручыць» стрэс? Асабліва ў гарадах, дзе паветра проста пранізана імі... Расказвае ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Вячаслаў СОЛТАН.

— Па якіх прыкметах можна зразумець, што ты сутыкнуўся з сапраўднай стрэсавай сітуацыяй?

— У шырокім сэнсе гаворка ідзе пра той раздражняльнік, які выходзіць за межы паўсядзённых, добра знаёмых падзей і сітуацый. Застрахавацца ад стрэсаў, цалкам пазбегнуць іх нерэальна. З другога боку, пры наяўнасці пэўных рэсурсаў — рацыянальна мысленне, станоўчага эмацыянальнага жыццёвага багажу, можна «пераварыць» любы стрэс на пазнавальным узроўні. У сэнсе, разважаць наступным чынам: я не вінаваты, мая праблема не ўнікальная і г.д. Справа ў тым, што ўздзеянне стрэсу абавязкова цягне за сабой рэакцыю прыстасавання — патрабуе аналізу і выпрацоўкі рашэння. Калі ж механізмы абароны, адаптацыі не дастаткова моцныя, развіваецца прыстасавальніцка-эмацыянальная рэакцыя. Гэта сустракаецца значна часцей. Па той прычыне, што такая рэакцыя патрабуе менш энергазатрат. Для таго каб сфарміраваць план дзеянняў па барацьбе са стрэсам, спатрэбіцца ажывіць мысленне, актывізаваць памяць, сінтэзаваць атрыманае з мінулага, прааналізаваць мінулыя спробы і памылкі і, нарэшце, выбраць адзіны правільны варыянт. Адным словам, вельмі складана. Таму часцей атрымліваецца наступнае: не змог — усвядоміць, рацыяналізаваць, растлумачыць. А паколькі на любы стымул павінна быць рэакцыя, то ў дадзеным выпадку застаюцца толькі эмоцыі.

Існуе ўніверсальная тэорыя французскага псіхолага XVIII стагоддзя Ганса Сялье, паводле якой вылучаюць тры стадыі стрэсу — трывогі, напружання і знясілення. Ёсць людзі, якія праходзяць усе прыступкі. Здараецца гэта з тымі, хто, напрыклад, хранічна знаходзіцца ў стрэсавым стане — пражывае побач з алкаголікам ці наркаманам, або знаходзіцца пад віртуальным уздзеяннем стрэсу, калі, скажам, з моманту скасавання шлюбу прайшло шмат гадоў, а чалавек усё яшчэ знаходзіцца ў той падзеі.

На стадыі трывогі прыстасавальніцкая рэакцыя чалавека — на ўзроўні, як кажуць англійскія псіхіятры, бегчы або біцца. Такая рэакцыя суправаджаецца выкідам адрэналіну — для ўзмацнення крыватоку ў мышцах, галаўным мозгу, сэрцы, выкідам халестэрыну — для сінтэзу таго ж адрэналіну. Узнікае спазм венаў для папярэджання верагоднай крывацечы. Іншымі словамі, з'яўляюцца вегетатыўныя складнікі трывогі — патлівасць, павышэнне ціску, пачашчэнне сэрцабіцця, пякота, уздрыгванне, паколванне, парушэнне засынання, збой у рабоце перыстальтыкі, што праяўляецца млоснасцю, расстройствам страўніка, колікамі і г.д. Такім чынам, трывога — гэта трывожныя думкі, якія суправаджаюцца каскадам адпаведных рэакцый. Рэакцыя гэта нявыгадная для чалавека. Яна яго знясільвае ва ўсіх сэнсах. Таму паступова трывога спалучаецца са станам слабасці, калі няма сілаў што-небудзь рабіць, а пазней ужо і не хочацца.

Першапачатковая стадыя трывогі дапускае фізіялагічную прыроду. Гэта характэрна для спартсменаў на старце, студэнтаў перад экзаменам і г.д. Аднак трывога, якая доўжыцца без бачных стымулаў звонку, з'яўляецца паталагічнай, і з ёю варта змагацца, паколькі менавіта яна нараджае спазм сасудаў, спрыяе артэрыяльнай гіпертэнзіі, стэнакардыі, атэрасклерозу, цукроваму дыябету, бранхіяльнай астме, язвавану каліту і г.д. Рэакцыя, якая спынілася, а не прайшла, выклікае структурныя парушэнні ў рабоце арганізма.

— А псіхатэрапія, паколькі я магу здагадацца, здольна не дапусціць гэтага...

— Які сэнс у псіхалагічнай дапамозе? Сапраўды, не дачакацца, не дапусціць, каб у пацыента надышла фізіялагічная стадыя знясілення. А без псіхалагічнай дапамогі яна наступіць. Пакуль у чалавека будуць сілы трывожыцца, ён будзе трывожыцца. Задача псіхатэрапеўта — купіраваць трывогу, перавесці яе ў стан расслаблення і захаваць чалавеку сілы.

— З чаго ж у народзе кажуць: што нас не забівае, тое робіць больш моцнымі?

— Стрэс — гэта з нейкага пункту гледжання трэніровачны механізм. Калі ён нам па сілах, калі мы знайшлі рацыянальнае выйсце, то гэта ўзніме нас на больш высокі ўзровень, павысіць уласную самаацэнку. Аднак моцны стрэс абавязкова народзіць трывожны стан. Ёсць аб'ектыўна і суб'ектыўна моцны стрэс. Дык вось, аб'ектыўна слабы можа быць суб'ектыўна моцным, аб'ектыўна ж моцны, як правіла, не бывае суб'ектыўна слабым. Ёсць катэгорыя стрэсавых падзей, якая заўсёды нараджае дэзадаптацыю — страта блізкага чалавека, інваліднасць, цяжкая хвароба, глабальныя катаклізмы і катастрофы, стыхійныя бедствы. Каб чалавек не ўвайшоў у дэзадаптыўную рэакцыю, трэба дапамагчы яму пазбавіцца залішняй трывожнасці.

— Можна выхаваць дзіця так, каб яно вырасла здольным да правільнай рэакцыі на стрэсавыя падзеі?

— Частку сваіх характаралагічных асаблівасцяў мы атрымліваем ад бацькоў — генетычна, а другую — таксама ад бацькоў, але праз вопыт іх паводзінаў у тых ці іншых сітуацыях. Дарэчы, згодна з тэорыяй шаблонаў, паводзіны дзіцяці будуюцца на стэрэатыпах, атрыманых у дзяцінстве ад значных асобаў. Існуе пэўная ідэнтыфікацыя ў сына — з бацькам, у дачкі — з маці. З дапамогай такіх паняццяў, як пакаранне — стымуляванне бацькі выпрацоўваюць у дзіцяці комплекс рэакцый. Адмоўны прыстасавальніцкі момант бацькі найчасцей закладваюць у хлопчыкаў, якіх прывучаюць не плакаць, не паказваць свае пачуцці і г.д. У рэшце рэшт сярод мужчын значна больш людзей, няздольных да ўсведамлення і выражэння сваіх эмоцый, схільных да рэакцыі захавання негатыўнай энергіі. Такія людзі прыходзяць на прыём са словамі: «мне дрэнна», а што дрэнна, патлумачыць не могуць. Як не могуць і ўключыцца ў нейкую механічную работу, пераразмеркаваць трывогу, вывесці яе з арганізма. Адсюль і шматлікія захворванні.

— Няўжо жанчыны лепей рэагуюць на складанасці?

— У іх, што называецца, свае праблемы. Жанчыны якраз у два разы часцей пакутуюць ад трывожных расстройстваў. Таму што ў іх ёсць базавая высокаразвітая трывожнасць — стан трывогі, які наогул не звязаны ні з якімі падзеямі. Лічыцца, што гэта перайшло сучасным жанчынам ад тых далёкіх папярэдніц, калі трэба было зберагчы нашчадкаў, накарміць, выгадаваць, ад статку не адбіцца... Зараз патрэба, як кажуць, знікла, а трывожнасць засталася.

— Што рэальна спрыяе зніжэнню трывожнасці?

— У прынцыпе чалавек становіцца больш спакойным, калі мае за плячыма вялікі жыццёвы вопыт. Гэта, дарэчы, не заўсёды прыходзіць з гадамі. Хутчэй, нават з выхаванням. Не важна, трапляе чалавек у тую ці іншую сітуацыю або ён проста шмат разоў чуў аб тым, як паводзіць сябе, — у яго выпрацуецца пэўная стратэгія, і рэакцыя трывогі будзе мінімальнай. Рацыянальны падыход да жыцця можна закласці ў выхаванне, але гэта павінен быць уласны прыклад бацькоў, а не агульныя словы. У ідэале ў чалавека павінна быць добрае, пазітыўнае дзяцінства, і ён павінен мець нейкую апору ў жыцці — тую камізэльку, у якую можна паплакацца, каб стала лягчэй. Зваротная сувязь з тым, каму давяраеш, дазваляе лепш усведамляць праблемы і выслабаняцца ад стрэсавай энергетыкі. Для некага такой «камізэлькай» становіцца псіхатэрапеўт.

— І што ён здольны зрабіць?

— Задача псіхатэрапеўта — зняць негатыўную сімптаматыку, дапамагчы чалавеку адаптавацца да сітуацыі, псіхалагічна падтрымаць яго, стварыць усе ўмовы, каб той знайшоў выйсце сам. Неабходна вывесці чалавека на той рэзерв энергетычных рэсурсаў, які быў да стрэсу.

— Якія «рэчы» робяць нас больш устойлівымі да стрэсаў?

— Вакцыны ад стрэсу не існуе, але некаторыя агульныя мерапрыемствы — сонца, паветра, вада, фізічная нагрузка, рацыянальнае харчаванне, нармальная псіхалагічная атмасфера дома, аптымальны рэжым работы і адпачынку — здольны спрыяць наш

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 2 (36)

ЯК УРУЧЫЦЬ ПРАДАЎЦУ ПРЭТЭНЗІЮ?

Патлумачце, калі ласка, што рабіць, калі прадавец не хоча задавальняць нашы прэтэнзіі? Мы з мужам купілі на рынку некалькі месяцаў таму кран з душам расійскай вытворчасці, але ён вельмі хутка выйшаў са строю. Прадавец абвінаваціў у гэтым нас, маўляў, мы ім няправільна карысталіся. Як нам прымусіць прадаўца задаволіць нашы патрабаванні?

А.М. БУДАЙ, *п. Бараўляны.*

У гэтым выпадку трэба скласці пісьмовую прэтэнзію. Прэтэнзію можна адправіць па пошце заказным пісьмом ці з паведамленнем аб яе ўручэнні на юрыдычны адрас прадаўца (індывідуальнага прадпрымальніка). Для гэтага, праўда, трэба ведаць найменне той арганізацыі, якая прадала вам тавар неналежнай якасці, і яе юрыдычны адрас. У кожным гандлёвым пункце такая інфармацыя павінна знаходзіцца на бачным месцы і быць даступнай для пакупнікоў, ці ў крайнім выпадку можна атрымаць неабходную інфармацыю ў адміністрацыі рынку.

Прэтэнзію можна пакінуць таксама ў Кнізе заўваг і прапаноў, якая павінна знаходзіцца на кожным гандлёвым аб'екце.

Прэтэнзія павінна змяшчаць наступную інфармацыю:

— найменне арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якім накіроўваецца прэтэнзія;

— прозвішча, імя, імя па бацьку спажыўца, інфармацыю аб яго месцы жыхарства;

— сутнасць прэтэнзіі (калі, дзе і што было вамі набыта, па якой цане, чым вы гэта можаце пацвердзіць, якія недахопы былі выяўлены ў тавары);

— патрабаванні, якія прад'яўляюцца да прадаўца (вытворцы). Майце на ўвазе, што згодна з артыкулам 19 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» спажывец, якому быў прададзены тавар неналежнай якасці, мае права на свой выбар патрабаваць: замены недабраякаснага тавару таварам належнай якасці, суразмернага змяншэння пакупной цаны, бясплатнага рамонту, вяртання выдаткаў па рамонце, вяртання грошай за няякасны тавар. Акрамя таго, згодна з законам спажывец мае права патрабаваць кампенсацыі яму шкоды, нанесенай у выніку продажу тавару неналежнай якасці;

— дату, подпіс.

Пажадана пакінуць сабе копію прэтэнзіі на той выпадак, калі прадавец (вытворца) не задаволіць вашы патрабаванні ці задаволіць іх часткова. Копія прэтэнзіі, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць факт атрымання прадаўцом прэтэнзіі, спатрэбяцца пры зварот ў суд.

А на мой погляд...

«У жыцці павінен быць пазітыў. І гэта свята яго стварае»

Што яшчэ дзесяць гадоў таму большасць з нас ведала пра дзень Святога Валянціна? У лепшым выпадку — легенду яго ўзнікнення на Захадзе, ды тое, што ў гэты дзень там прынята каханым дарыць невялікія сувеніры з выявай сэрца. Прайшло колькі гадоў і цяпер ужо і ў нас сярэдзіну лютага цяжка ўявіць без «падарункавага буму», тым больш што і асартымент сувеніраў адпаведнай тэматыкі ў гандлёвых прадпрыемствах павялічваецца з кожным новым святам: мяккіх цацак, паштовак, цукерак і інш. Моладзь радуецца магчымасці «афіцыйна» яшчэ раз выказаць адзін другому свае пачуцці, людзі больш сталага ўзросту часам жа бурчаць, маўляў, свята не мае нічога агульнага з нашымі традыцыямі, яно заходняе, дый увогуле гэты дзень «прыдумалі» гандляры, каб у прамежку паміж навагоднімі святамі і «мужчынскім» і «жаночым» днямі падтрымліваць тавараабарот.

Праз тыдзень — зноў 14 лютага. А што вы думаеце пра гэта свята? Ці адзначаеце яго неяк, ці набываеце для родных і блізкіх адпаведныя сувеніры, ці рады іх самі атрымліваць у гэты дзень?

Руслан МІХАЛЕВІЧ, першы намеснік старшыні Дзяржынскага райвыканкама:

— *(Смяецца.)* Вядома ж, набываю, віншую. Ведаеце, мне абсалютна ўсё роўна, якая падаплёка ў гэтага дня. Павінен быць пазітыў *(смяецца)*. Жыццё — адно, у ім павінна быць месца святу.

Работніца з Нясвіжа (папрасіла прадставіць сябе менавіта так, інакш «будзе патрабаваць абвяржэння»):

— Нічога не набываю, не адзначаю, і ўвогуле, гэты дзень за свята не лічу. Мне 50 гадоў, я выйшла замуж у 36 5 лютага. Такім чынам учора мы адзначылі сямейны юбілей — 15 гадоў у шлюбе. Вось гэта я лічу сапраўднай датай, вартай таго, каб яе рэгулярна адзначаць. А дзень Святога Валянціна... Дачцэ маёй 13 гадоў, вось ім гэта сапраўды падабаецца.

Людміла ЧЭБАН, першы сакратар Глыбоцкага райкама БРСМ:

— Безумоўна, люблю дарыць сама і атрымліваць ад іншых у гэты дзень нейкія невялікія сувеніры, чуць добрыя словы. Гэта вельмі здорава, што ёсць такое свята, калі любы чалавек, незалежна ад узросту, можа праявіць свае пачуцці, даць ім волю *(смяецца)*. Кожны з нас варты кахання, кожны мае права кахаць, дарыць блізкаму любоў і цеплыню. Прыемна ў гэты дзень атрымаць SMS, «валянцінку», самой сказаць добрыя словы мужу, маме, сябрам, калегам. Вельмі добра, што з кожным годам свята пашыраецца, з'яўляецца ўсё большы выбар нейкіх прыемных сувеніраў. Ці часта вы бачыце на вуліцы людзей, якія ўсміхаюцца? А ў гэты дзень іх бывае шмат!

Фёдар АРЦЯМЧУК, начальнік тэхнічнага аддзела УП «Мінскзелянбуд»:

— Я лічу, што гэта свята — найперш для моладзі. Зрэшты, і для людзей больш сталага ўзросту. Хоць асабіста я раней, дый і цяпер, яго прапускаю *(смяецца)*. Некалі ж сапраўды мы нічога не ведалі пра такі дзень. А ўвогуле няхай свята будзе. Родныя людзі могуць жа павіншаваць адзін другога і без нейкага падарунка, праўда?

Таццяна ЛОГМАН, вёска Слабада-Кучынка Капыльскага раёна, знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці:

— Так, адзначаем гэта свята ў сям'і, дорым з мужам адно аднаму нейкія невялікія сувеніры. Навошта?.. Ну, гэта адзін са спосабаў даведацца, як да цябе ставіцца іншы чалавек, ці кахае *(смяецца)*. Ад падарункаў настрой паляпшаецца, словам, дзень Святога Валянціна — вельмі добрае свята, яно патрэбна.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ЭКАЛАГІЧНАЯ МЭБЛЯ дзеда Мікалая

Не бяруся казаць за іншыя рэгіёны, але ў Давыд-Гарадку — месцы самых розных майстроў-рукадзельнікаў — больш няма каму рабіць мэблю з лазы. Мікалай Петравец ужо не ў стане займацца любімай справай, якая некалі кармі-ла яго сям'ю: сталы ўзрост, рукі не такія спрытныя, як раней, і сілы немаладыя. А найгоршае — кепска стаў бачыць. Ён бы і перадаў каму сваё ўмельства, як-ніяк цяпер гэты промысел адносяць да народнага мастацтва. Але бяда не толькі ў тым, што ахвотнікаў вучыцца не знайшлося, — у насельніцтва знікла патрэба на лазовыя крэслы, падстаўкі, калыскі, дзіцячыя цацачныя ложачкі і мэблю. Мода цяпер іншая і тут нічога не папішаш.

Але Мікалай Андрэевіч мае ўсе падставы ганарыцца, што некалькі пакаленняў давыд-гарадчукоў і навакольных вёсак няньчыліся і раслі ў ягоных калысках — лёгенькіх, залацістых, надзіва моцных, надзейных і, галоўнае, чыста экалагічных, здаровых. А колькі хатніх пакояў заможных і не вельмі гараджан і сялян запаўнялі і ўпрыгожвалі крэслы, сталы і столікі, этажэркі, зробленыя ягонымі майстравымі рукамі. Што ж, вернецца мода (а яна ўжо вяртаецца), працы старога пляцельшчыка яшчэ паслужаць прыкладам і ўзорам.

Збіраючыся на фатаздымку да майстра (адрас падказалі ў гарсавеце), я спадзяваўся ўбачыць яго няхітрую хатнюю майстэрню з пучкамі нарыхтаванай лазы, прадчуваў казытлівы гаркаваты пах абкораных дубцоў, натхнёны быў любавацца на гатовыя вырабы. І, найперш, сфатаграфаваць яго ў працы. Але гаспадар адно развёў рукамі, маўляў, нічога гэтага ўжо няма. І сапраўды, у доме нічога не нагадвала пра нялёгкі і рэдкі цяпер промысел. Толькі тры прадметы з лазовага матэрыялу яшчэ запаўнялі хатнюю прастору. Зразумела, я і гэтаму быў рады. Але ўзгадаў, як гадоў дзесяць таму выпадкова здымаў аднаго чалавека з калыскаю, якую той вёз на цялежцы. Ужо ў Мінску, парыўшыся ў архіве, адшукаў негатывы (гэта цяпер мы фатаграфуем лічбавымі камерамі) і пазнаў на іх Мікалая Петраўца. Аказваецца, гэта былі яго апошнія спробы яшчэ нешта зарабіць ручной працай. Майстар рабіў традыцыйную і па-ранейшаму элегантную мэблю, у базарныя дні вывозіў яе ў горад, чакаў пакупнікоў і ўсё радзей іх знаходзіў. Здымкі той выпадковай сустрэчы на месце праз Гарынь, напэўна, ляжалі б незапатрабаванымі і далей, каб не акалічнасць, што залатыя рукі апошняга давыд-гарадоцкага ўмельца аказаліся проста незапатрабаванымі. Сумна робіцца ад адной думкі, што разам з гэтым гарадчуком адыходзіць эпоха выдатных майстроў, больш за тое, знікае цэлы пласт самабытнай культуры. І ўжо гэта дае падставу сказаць хоць пра аднаго чалавека добрае слова. Да прыкладу, скажу, што да вайны ў Давыд-Гарадку працавалі 400 (!) майстроў ботаў. Яны пастаўлялі ў Еўропу свой лепшы абутак. Гэта, безумоўна, гонар у гісторыі старажытнай мясціны, але так і карціць спытацца: дзе сёння прадаўжальнікі тых найвыдатнейшых спецыялістаў, дзе носьбіты і захавальнікі традыцый? Няўжо ўсё тлумачыцца толькі модай і эканамічнай мэтазгоднасцю? У чым самабытнасць гарадчукоў і чаму гэткае неабачлівае абыходжанне з векавымі набыткамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры?

Мікалай Андрэевіч Петравец нарадзіўся таксама ў сям'і майстра па пашыве ботаў і з малых гадоў, як і належала, дапамагаў бацьку, таму шмат чаму ў яго навучыўся. Але пасля вайны пайшоў у райпрамкамбінат (тады Давыд-Гарадок быў яшчэ райцэнтрам), у цэх лазовай мэблі, рабіў і перавыконваў планы. Мэбля прадавалася ў Пінску: калыскі, сталы і крэслы, этажэркі. У Беларусі, і тым больш на гарынскім і прыпяцкім берагах, матэрыялу для гэтай працы было ўдосталь. Але мода не спрыяла развіццю промыслу, попыт знікаў, а праца абясцэньвалася. І Мікалай Петравец стаў майстрам-адзіночкам. Але менавіта дзякуючы яму вырабы з лазы ў Давыд-Гарадку і захаваліся.

У наступным годзе будзе роўна пяцьдзесят, як жывуць разам карэнныя гарадчукі Ганна Лявонцьеўна і Мікалай Андрэевіч Петраўцы. У іх двое дзяцей, чацвёра ўнукаў і два праўнукі. Для аднаго з іх у падарунак стары майстар зрабіў маленькае крэсла. І хто ведае, можа для другога таксама змайструе. Як бы там ні было, а памяць — каштоўная рэч.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

На хвалі

Добрай музыкі многа не бывае

Інтэрнэт дае кожнаму магчымасць выбраць, што слухаць

З учарашняга дня пачалося «жывое», праграмнае вяшчанне новай беларускай радыёстанцыі — NETradio (www.netradio.by). Гэта, як падкрэсліваюць стваральнікі, першае прафесійнае радыё ў Байнэце.

Пры ўсім тым яшчэ шматканальнае: у лістападзе, падчас тэставага вяшчання, слухачам былі прапанаваныя два каналы з розным фарматам: Netradio Adult (класіка XX стагоддзя, хіты розных жанраў — ад поп-музыкі да джазу, блюзу і хард-року) і Netradio Hot («гарачыя» хіты сучаснасці, альтэрнатыўная музыка, клубная, рэп і г.д.). З 1 студзеня на абодвух каналах пачалося кругласутачнае вяшчанне. Нарэшце, з 5 лютага ў эфіры і з'явіліся паўнавартасныя праграмы, а таксама загучалі галасы вядучых — як вядомых журналістаў Тамары Лісіцкай, Барыса Штэрна, Алега Ціткова, так і дэбютантаў — папулярных асобаў з розных сфераў: гімнасткі Яўгеніі Паўлінай, капітана каманды знаўцаў Алеся Мухіна, пісьменніцы Наталлі Батраковай, музыкантаў Пятра Елфімава, Андрэя Дзяркова і іншых удзельнікаў праекта Netradio.

У першыя тыдні праграмнага вяшчання на абодвух каналах будуць выходзіць праграмы па заяўках, а таксама аўтарскія праграмы «Аўдыя кніга», «Прыватная калекцыя», «Медытацыя», «Беларуская раскладка» і іншыя. Гэтаксама слухачам прапануецца праграма «MyTrack», складзеная... з частак музычных калекцый саміх слухачоў.

«Мы запускаліся без спешкі, паэтапна, паколькі праект сур'ёзны, шматузроўневы — уявіце толькі аб'ём музыкі, — расказвае кіраўнік праекта Глеб Марозаў. — Падчас прома-вяшчання тэсціравалі абсталяванне, вывучалі аўдыторыю, а паралельна будавалі эфірную студыю. Нарэшце, мы дасягнулі такога тэхнічнага ўзроўню, калі можам пачынаць працаваць «он-лайн». У перспектыве, як разлічваюць стваральнікі радыёстанцыі, будзе павялічвацца не толькі колькасць праграм, але і колькасць саміх радыёканалаў. Так, да існуючых двух дададуцца кругласутачныя «тэматычныя» музычныя каналы NETradio Jazz, NETradio Rock, NETradio Relax, NETradio Disco 80, NETradio Рускі Рок, NETradio Pop, NETradio 100 %, NETradio World Music, Netradio Jungle, NETradio Baby і іншыя.

Фота з сайта www.netradio.by.

Глеб МАРОЗАЎ за работай.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ЧЭК КАРЫСНЫ НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ СПАЖЫЎЦОЎ

У сацыяльнай тэлевізійнай рэкламе нас пастаянна заклікаюць браць у прадаўца чэк. Маўляў, чэк — гэта гарантыя якаснай пакупкі. Але ж касавыя апараты ёсць далёка не ва ўсіх гандлёвых пунктах. Тым больш іх няма на рэчавых рынках, дзе гандлююць пераважна індывідуальныя прадпрымальнікі.

М.П. МІГАЛЬ, *г. Мінск.*

Як патлумачылі нашай газеце ва ўпраўленні абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю, пастановай Савета Міністраў прадугледжваюцца выпадкі, у якіх юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам дазваляецца прымаць наяўныя грашовыя сродкі без прымянення касавых падсумоўвальных апаратаў (КПА) ці спецыяльных камп'ютарных сістэм. У прыватнасці, адпускаць тавары без КПА дазваляецца пры ажыццяўленні рознічнага гандлю на гандлёвых месцах на рынках, кірмашах і выставах тавараў. Праўда, на іншыя гандлёвыя структуры, якія знаходзяцца на рынку (магазіны, павільёны), а таксама на гандлёвыя цэнтры і гандлёвыя дамы такое «паслабленне» не распаўсюджваецца.

Пры гэтым адсутнасць абавязку выкарыстоўваць КПА пры прыёме наяўных сродкаў не вызваляе прадаўца (вытворцу, выканаўцу паслугі) ад выдачы спажыўцу дакумента, які б пацвярджаў аплату тавару (выкананне работы, аказанне паслугі) у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў».

У выпадку, калі магазін, аб'ект абслугоўвання ці індывідуальны прадпрымальнік не маюць касавага падсумоўвальнага апарата, дакументамі, якія пацвярджаюць аплату тавару і якія павінны выдавацца спажыўцу, з'яўляюцца: **адрыўны талон, прыходны касавы ордэр, квітанцыя формы КВ-1, таварная накладная, таварны чэк і іншыя, прадугледжаныя заканадаўствам формы дакументаў.**

Акрамя таго, пры продажу тавараў да дакументаў, што пацвярджаюць факт пакупкі (выкананне работ, аказанне паслуг), таксама адносяцца: належным чынам аформлены тэхнічны пашпарт, інструкцыя па эксплуатацыі, інструкцыя для карыстальніка ці любы іншы дакумент, які змяшчае звесткі аб прадаўцы і тавары (рабоце, паслузе).

У дакуменце, што пацвярджае факт пакупкі, павінны змяшчацца звесткі аб юрыдычным адрасе прадаўца. Індывідуальны прадпрымальнік павінен прадастаўляць інфармацыю аб сваім прозвішчы і даныя пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі (нумар, дата выдачы, кім было выдадзена). У дакуменце павінна змяшчацца таксама наступная інфармацыя: найменне, марка ці мадэль (артыкул ці гатунак тавару пры іх наяўнасці); цана; устаноўлены гарантыйны тэрмін, калі ён не ўказаны ў іншай дакументацыі, што прыкладаецца да тавару (выкананні работы, аказанні паслугі); дата продажу тавару ці афармлення заказу на выкананне работы, паслугі; тэрмін выканання работы, паслугі; іншыя звесткі, выходзячы з умоў дагавора.

У першую чаргу сам прадавец павінен быць зацікаўлены ў выдачы чэка ці іншага дакумента, які пацвярджае факт пакупкі, таму што ў процілеглым выпадку ён рызыкуе справакаваць злоўжыванні з боку спажыўцоў. Напрыклад, спажывец захоча вярнуць прадаўцу тавар належнай якасці пасля прадугледжанага законам для гэтых мэтаў 14-дзённага тэрміну (ён проста будзе адлічваць дату пакупкі ад любога зручнага для яго дня). Ці, напрыклад, заявіць, што заплаціў за тавар большую суму грошай.

ПАДЛОГА МОЖА БЫЦЬ РОЗНАЙ. АЛЕ КЛАСІКА «ЖАНРУ» — ГЭТА ПАРКЕТ

Карысная парада

Рабіць паркетную падлогу мы першапачаткова не збіраліся, чамусьці аддавалі ў думках перавагу ламінату. Ідэю падкінуў, як кажуць, у перадапошні момант калега па працы, які на той момант таксама будаваўся. Мы яе падхапілі, хуценька абмеркавалі, праверылі па суадносінах цана/якасць і вырашылі — а чаму б і не. Выходзіла некалькі даражэй, чым ламінат (хоць і ён бывае розным), але на карысць паркета гаварыла натуральнасць матэрыялу, прыгажосць і, што таксама нямалаважна, магчымасць яго далейшага спалучэння ў інтэр'еры практычна з любымі іншымі задумкамі. Ды і сам па сабе паркет, акрамя ўласна функцыянальнай «нагрузкі», — па сутнасці адзін з галоўных элементаў усяго інтэр'ера жылля.

Самому такую работу зрабіць цяжкавата

У адрозненне ад многіх іншых відаў будаўнічых і аддзелачных работ, пра якія мы ўжо згадвалі ў мінулых выпусках «Карыснай парады», менавіта ўкладку паркета з-за сваёй складанасці і неабходнасці мець спецыяльны інструмент у найменшай ступені раім выконваць самастойна. Лепш даверыць справу прафесіяналам.

Праблемы могуць узнікнуць ужо на стадыі падрыхтоўкі асновы — бетоннай сцяжкі. Практычна ніколі яна не бывае ідэальна роўнай (у нас перапады дасягалі некалькі сантыметраў), таму першы крок — гэта заліўка цэментна-пясчанай сцяжкі. У прынцыпе ўжо на яе і можна ўкладваць паркет, аднак ёсць вялікая рызыка, што, нічым не замацаваны, ён хутка пачне «гуляць». Па тэхналогіі выкарыстоўваюць прамежкавы слой, у якасці якога звычайна выступае вільгацетрывалая фанера, зрэдку — ДСП (яна больш рэагуе на вільгаць).

Фанера ўкладваецца фрагментамі — квадратамі, паміж якімі пакідаюцца тэмпературныя швы. Папярэдне праводзіцца гідраізаляцыя. Фанеру да сцяжкі мацуюць з дапамогай дзюбеляў і клею. Потым яе трэба абавязкова адшліфаваць для выраўноўвання стыкаў у адзін узровень.

Дарэчы, укладку паркета пажадана праводзіць не раней чым як мінімум праз два тыдні з моманту завяршэння ўсіх мулярных работ. Важна таксама, асабліва ў зімовы час, каб тэмпература падрыхтаванай асновы і паркета была аднолькавай, таму закрытыя ўпакоўкі з матэрыялам неабходна вытрымаць у памяшканні, дзе будуць адбывацца работы, не менш за 2—3 дні. Памятаю, наш брыгадзір так спяшаўся, што гатовы быў пачаць укладку літаральна з «колаў», маўляў, што тут такога. Балазе, мы ўжо ведалі, што так рабіць нельга і катэгарычна забаранілі распачынаць работы.

Паркет укладваецца на клей з дадатковым мацаваннем спецыяльнымі цвікамі. Пасля яго паэтапна — памятаеце пра спецыяльны інструмент? — шліфуюць (напачатку груба, затым больш тонка) і пакрываюць лакам. Апошні засцерагае паркет ад уздзеяння знешняга асяроддзя і робіць саму падлогу больш прыгожай. Звычайна наносяць некалькі слаёў (у нас, да прыкладу, пакрывалі тройчы). Зразумела, усе гэтыя этапы і пералічаныя матэрыялы ў дадатак да самога паркета (фанера, цвікі, клей, лак) давядзецца аплачваць з уласнай кішэні. У сувязі з вышэйпералічаным паркетная падлога і атрымліваецца, як мы гаварылі ў пачатку, даражэйшай за іншыя. На сёння ўкладка паркета на сцяжку (з далейшай шліфоўкай, пакрыццём лакам) каштуе 13 долараў, на фанеру — 16 долараў за квадратны метр).

Для нас больш традыцыйным з'яўляецца дуб

Насамрэч існуе некалькі відаў паркета, але спытай любога, і ён з вялікай доляй верагоднасці ўкажа на адзін, які ў большасці з нас атаясамліваецца з гэтай назвай — штучны. Гэта сапраўды самы распаўсюджаны від, які мае форму прамавугольнай планкі (плашкі). У мэтах эканоміі газетнай плошчы (уся тэма вельмі вялікая) спынімся больш падрабязна толькі на ім.

Якасць паркета вызначаецца пародай драўніны, спосабам распілоўкі ствала, спосабам вырабу. Гатунак драўніны вызначае цвёрдасць паркетнай падлогі. Тут у лідарах дуб, граб, бук, ясень. Да мяккацелых адносяцца сасна, бяроза, вішня. Зразумела, што апошнія падыдуць больш для спальнага пакоя, а, напрыклад, для гасціннага лепш выбіраць дуб.

Зараз можна купіць якую заўгодна экзотыку, аднак менавіта дуб у нас заўсёды лічыўся традыцыйнай пародай драўніны для вырабу паркета. Спелая драўніна мае адценні ад светла-карычневага да жоўта-карычневага з прыгожай тэкстурай на зрэзе. Яна трывалая, даўгавечная, устойлівая да знешніх уздзеянняў. З цягам часу дуб крыху цямнее, што, думаю, ідзе толькі на карысць пакрыццю, бо з'яўляецца адценне даўніны.

Што такое тэкстура паркета? Гэта малюнак, атрыманы на паверхні драўніны ў выніку пераразання гадавых слаёў і сэрцападобных промняў. Скажам, радыяльны паркет — адабраны паркет вышэйшага гатунку толькі радыяльнага распілоўвання (плоскасць разрэзу праходзіць праз радыус ствала). Заганы драўніны і механічныя пашкоджанні не дапускаюцца. Тангенцыяльны — адабраны паркет вышэйшага гатунку тангенцыяльнай распілоўкі (плоскасць разрэзу — па датычнай да гадавога слоя ствала). Гатунак паркета вызначаецца наяўнасцю ці адсутнасцю ў драўніне сучкоў, іх колькасці і памеру.

За вашы грошы — любая прыхамаць па ўкладцы

Памер прамавугольных паркетных плашак можа быць розным: і 420x70 міліметраў, і 350x70, і 280x70, і 400x50, і 250x50, і інш. Кожны выбірае, што яму асабіста падабаецца. Мы, напрыклад, паколькі выбралі паркет для двух розных па плошчы пакояў, спыніліся на варыянце 350x70 для большага і 280x70 — для меншага.

Калі гаварыць пра віды ўкладкі штучнага паркета, дык найбольш простым і эканамічным спосабам стварэння паркетнай кампазіцыі з'яўляецца фігурная ўкладка. Самыя вядомыя віды такой укладкі — «елачка» і «палуба»: простыя, не патрабуюць дадатковай падрыхтоўкі плашак. Калі каму гэтага будзе недастаткова, ёсць іншыя віды ўкладак, пры якіх за кошт геаметрыі і паўтаральнасці ўзораў можна адначасова вырашаць задачы па пашырэнні—звужэнні знешняга ўспрымання прасторы тых ці іншых пакояў (пра такія спосабы ўвогуле мы пісалі ў ранейшых «Карысных парадах»). Геаметрычныя ўзоры ўкладак, якія не патрабуюць дадатковай нарэзкі, заснаваны на чаргаванні груп плашак, арыентаваных у тым ці іншым накірунку. Іх перавага — прастата і эканамічнасць (каэфіцыент запасу матэрыялу складае ўсяго 1,05, г. зн. што вам неабходна набыць зусім мала дадатковага паркета на «прырэзку»).

Есць віды ўкладак, калі патрабуецца нарэзка плашак пад вуглом 90 градусаў. Гэта класічныя малюнкі з чаргаваннем маленькіх і вялікіх квадратаў, рознымі іх перапляценнямі. З дапамогай плашак розных пародаў і каляровага адцення можна стварацца сапраўдную прыгажосць (праўда, адпаведна павялічацца вашы выдаткі не толькі за матэрыял, пры набыцці якога давядзецца выкарыстоўваць каэфіцыент 1,2, але і на аплату работы майстроў).

Нарэшце, віды ўкладак, якія патрабуюць нарэзкі плашак пад вуглом менш за 90 градусаў. Гэта больш працаёмістыя і матэрыялаёмістыя віды ўкладак, бо каэфіцыент запасу матэрыялу можа складаць 1,5—1,7, іншымі словамі, каб паркет з'явіўся ў нейкім пакоі, яго давядзецца браць амаль як на два. Затое пры такіх відах укладкі, калі плашкі наразаюцца пад рознымі вугламі, можна стварацца складаныя геаметрычныя формы і малюнкі, стваральчы ілюзію трэцяга вымярэння.

З дапамогай штучнага паркета можна выравашаць і розныя інтэр'ерныя задачы. Скажам, можна чаргаваць розныя віды ўкладкі для зрокавага раздзялення прасторы ці зрабіць фрыз па перыметры памяшкання для надання інтэр'еру строгасці. У залежнасці ад пароды драўніны і віду паркета (з адборам ці без адбору па распіле) можна таксама маніпуляваць каляровым вырашэннем паркетнай падлогі.

Ніякіх «шпілек», а мыццё — без вялікай колькасці вады

Каб выбранае пакрыццё доўгія гады радавала вас самім фактам сваёй наяўнасці, давядзецца запомніць і выконваць некалькі галоўных правілаў па эксплуатацыі паркетнай падлогі.

Паводле слоў спецыялістаў, перш чым упершыню ступіце на свой паркет, павінна прайсці не менш за 24 гадзіны з моманту нанясення апошняга слоя лаку. Канчатковую трывалась лакавае пакрыццё набярэ ўвогуле тыдні праз два, тады лепш і ўносіць у жыллё мэблю. Дарэчы, пра апошнюю. Як мы ўжо раней пісалі, яе ножкі павінны быць падклеены мяккім матэрыялам: фетрам, лямцам і г.д. Калі мэбля на роліках, яны павінны быць з якаснага каўчуку. Зразумела, нельга хадзіць па паркеце ў «шпільках» — паркетныя лакі дрэнна пераносяць менавіта такія механічныя «кропкавыя» нагрузкі. Ад падэшваў могуць застацца і проста чорныя палосы, і хоць іх можна выцерці, лепш па паркеце шпацыраваць не ў вулічным, а ў хатнім абутку.

Складанае ўладкаванне паркетнай падлогі мае на ўвазе яго поўную герметызацыю, г.зн. што пародa драўніны не будзе ўзаемадзейнічаць ні з вільгаццю, ні з брудам. Аднак ад уздзеяння тэмпературы і змянення вільготнасці паркет не выратуе ніводны лак. Ідэальнай умовай для эксплуатацыі вырабаў з драўніны з'яўляюцца пастаянная вільготнасць паветра ў межах 40—65 працэнтаў пры тэмпературы 18—25 градусаў цяпла (як гэтага дасягнуць, як змагацца з наступствамі сезонных дэфармацый паркета — чытачы даведаліся з матэрыялу пад рубрыкай «Выпрабавана на сабе» у мінулым выпуску. Зразумела, ніякіх эксперыментаў з бытавой хіміяй. Жонка неяк змывала лак з пазногцяў, фактычна некалькі кропель ацэтону трапілі на падлогу — засталіся плямкі. За рэстаўрацыю невялікага кавалачка падлогі (раілі ўвогуле ўсю падлогу ў пакоі нанаў адцыкляваць і пакрыць лакам) запрасілі столькі грошай, што засталося толькі махнуць рукой. Аналагічныя праблемы могуць узнікнуць і ва ўладальнікаў хатняй жывёлы: ад механічных пашкоджанняў да плямаў ад слядоў жыццядзейнасці.

Пры мыцці мы выкарыстоўваем спецыяльную мяккую анучу (прадаюцца ў магазінах), якую трэба добра адціскаць, або як варыянт — спецыяльную шчотку з мяккай губкай. Вада цёпленькая, галоўнае, каб потым падлога прасохла. Дарэчы, на паркет нельга ставіць на доўгі час нейкія воданепранікальныя прадметы.

Выбар лаку для падлогі залежыць ад пастаўленай задачы

Якому вытворцу аддаць перавагу? Мы нейкі час вагаліся — браць расійскі паркет або беларускі — але ў выніку выбралі айчыннае. Пра канкрэтныя цэны пісаць не хочацца, бо трэба пералічваць шэраг параметраў (вытворца, драўніна, памер, гатунак). Напрыклад, айчынны паркет (дуб, плашкі 280x50, ва ўпакоўцы 0,98 квадратнага метра) каштаваў нядаўна ў перараз-ліку больш за 25 долараў (некалькі гадоў таму было менш за 15 долараў). Адзінае, параю не спяшацца: кошт аднаго і таго ж паркета можа ў розных прадаўцоў істотна адрознівацца. Не палянуйцеся наведаць з паўтузіна, маючы потым на руках іх прайс-лісты, вы лёгка выбераце прымальную для сябе цану. Пажадана таксама па магчымасці ўбачыць месца, дзе ў прадаўца захоўваецца прадукцыя, а пры набыцці — глядзець, каб упакоўка паркета не была пашкоджана (каб плашкі не нацягнулі вільгаці).

Звычайна бяруць фанеру № 10 (плошча аднаго ліста — 2,1x2,3 квадратнага метра). Фанера за апошні час падаражэла (некалі была 9—11 долараў, потым 20—21 долар за ліст). Пры набыцці паркета ўдакладняйце, колькі квадратных метраў утрымлівае адна ўпакоўка, бо ў залежнасці ад памераў можа быць і 0,625 і 1,176 квадратнага метра. Пажадана на ўсякі выпадак мець невялікі запас матэрыялу, аднак праблема ў тым, што паштучна паркет не прадаюць. Яшчэ больш крыўдна браць цэлую ўпакоўку фактычна дзеля некалькіх плашак, неабходных згодна з разлікамі, але што зробіш? Мы, было, паспрабавалі зэканоміць, дык потым давялося асобна ехаць па адну ўпакоўку.

Калега па працы неяк цікавіўся: які лак бралі. Мы — нямецкі, ён лічыцца адным з лепшых (хоць, як кажуць, на густ і колер...) Тры слоі — гэта прыкладна 300 грамаў на квадратны метр. Можа быць у ёмістасцях (калі гаварыць пра нямецкі) па 6,5 і 13 кілаграмаў, а можа (іншы выторца) па 9,9 кілаграма (у апошнім выпадку кошт бляшанкі з неабходнымі дадатковымі кампанентамі складае 99 долараў). Галоўнае, загадзя даведайцеся — з чым канкрэтна даэтуль працавалі вашы майстры, выслухайце іх парады. Паркетны лак бывае глянцавы, бывае шаўкавіста-матавы. Выбіраць трэба зыходзячы з таго, якую задачу вы хацелі б вырашыць, на што перавесці акцэнт, якая ў вас абстаноўка, на які бок выходзяць вокны. Пагадзіцеся, калі ў вас і без таго ўвесь дзень сонечна, навошта вам яшчэ і бліскучая падлога? Дарэчы, глянцавы лак з цягам часу губляе гэтую сваю ўласцівасць, на матавым працэс менш заўважны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«крымінальнай страхі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тульская філія

«Банда Рынаса» — таксама «родам з ліхіх дзевяностых». Хоць дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што ў гэтай злачыннай арганізацыі два «бацькі-заснавальнікі». Памянёны вышэй грамадзянін па прозвішчы Рынас і яго хаўруснік Ксяндзоў. Уладзімір Рынас, больш вядомы ў крымінальным асяроддзі па мянушцы «Немец», нарадзіўся ў Карагандзе. Па нацыянальнасці — немец, адсюль і адпаведная мянушка. У Віцебск трапіў падчас службы ў войску. Служыў Рынас у знакамітай паветрана-дэсантнай дывізіі. У горад сваёй «баявой маладосці» вярнуўся ў 1995 годзе. Паводле некаторых звестак, яго «камандзіравала» ў Віцебск тульская злачынная групоўка, якой кіравалі браты Громавы. Менавіта з пратэкцыі «тульскай братвы», якая дамовілася з беларускімі «калегамі», Рынас і атрымаў права на заняцце рэкетам. Напачатку «група Рынаса» перабівалася дробным вымаганнем: выбівала па 10—20 долараў у месяц з «чаўнакоў». Апетыты бандытаў раслі, але, каб наталіць сваю прагу нажывы, у іх не хапала «штыкоў». І тады Рынас прапанаваў лідару другой злачыннай групоўкі Ксяндзову аб'яднаць свае сілы, каб узяць пад кантроль найбольш прыбытковыя часткі прыватнага бізнэсу. Такім чынам у 1997 годзе і ўзнікла цэлая злачынная арганізацыя, якая неўзабаве ўзяла пад сваю «страху» дзесяткі, а магчыма, сотні дробных і буйных прадпрымальнікаў Віцебшчыны, уключаючы бізнэсменаў з абласнога цэнтра.

«Пошукавікі», «зборшчыкі» і «карнікі»

Фарміравалася банда не абы як. Каб трапіць у гэтую «брыгаду», патрэбна была пратэкцыя чалавека, якому давяралі Рынас альбо Ксяндзоў. Бралі на «службу» ў асноўным асобаў са спартыўным мінулым, без шкодных звычак. Кожны ўдзельнік банды меў свае абавязкі. Адна група займалася пошукам ахвяраў: людзей, якіх можна было абкласці данінай. У гэтае кола траплялі не толькі дробныя і буйныя прадпрымальнікі, апошніх, дарэчы, курыравалі самі лідары, але і падпольныя рамонтнікі аўтамабіляў, якія займаліся сваёй справай ва ўласных гаражах.

Другая частка бандытаў непасрэдна збірала даніну. Былі ў бандзе і гэтак званыя «карнікі». Яны прымянялі меры фізічнага ўздзеяння на асобаў, якія адмаўляліся плаціць, а таксама распраўляліся са сваімі «калегамі». За кожную правіннасць, напрыклад, залішнюю балбатлівасць ці непаслухмянасць, з банды не проста выганялі, але і на дарогу моцна збівалі, каб «звольнены» трымаў язык за зубамі.

Офіс арганізацыі знаходзіўся ў Віцебскім раёне, у будынку фірмы, дзе Рынас фармальна лічыўся намеснікам дырэктара. Кожны дзень у гэтым памяшканні збіраліся члены групоўкі, атрымлівалі заданні, рабілі справаздачы, дакладней, прыносілі адабраныя ў людзей грошы.

Пасткі для прадпрымальнікаў

Дробныя і буйныя бізнэсмены з Віцебшчыны траплялі ў пасткі вымагальнікаў «оптам і ў розніцу». Напрыклад, у Шуміліне «рынасаўцы» адразу ўзялі пад свой кантроль цэлы рынак, які раней плаціў даніну полацкім бандытам. Паколькі многія ўдзельнікі групоўкі былі родам менавіта з Шуміліна, то вырашылі, што рынак гэтага населенага пункта належыць ім па праву нараджэння. Пасля жорсткіх перамоў з полацкімі канкурэнтамі, шумілінскі рынак і сапраўды перайшоў пад «пратэктарат банды Рынаса». Адметна, што гандляры з такой жа пакорлівасцю пачалі плаціць даніну «новым гаспадарам».

З «крутымі» бізнэсменамі злачынцы дзейнічалі не так нахабна і прамалінейна. У прыватнасці, для таго каб пераканаць перайсці пад сваю «страху» аднаго даволі буйнага прадпрымальніка, бандыты разыгралі цэлы спектакль. Напачатку яны паведамілі камерсанту, што на яго нібыта рыхтуюць замах расійскія кампаньёны. Бандыты выдзелілі бізнэсмену свайго целаахоўніка, а праз некаторы час імітавалі напад. Удзячны прадпрымальнік пасля гэтага кожны месяц плаціў сваім выратавальнікам шчодры «ганарар».

Часта практыкавалі «рынасаўцы» і крэдытаванне бізнэсменаў. Пазычалі некаторым даверлівым камерсантам грошы на развіццё бізнэсу, а потым раптоўна патрабавалі вярнуць доўг. Калі крэдытор не паспяваў своечасова разлічыцца, то ўключалі «лічыльнік» і сума доўгу імгненна вырастала. Напрыклад, адзін такі даверлівы камерсант узяў у бандытаў 200 долараў, а неўзабаве ўжо быў вінен 5 тысяч «зялёных». Каб вярнуць доўг, яго прымусілі займацца крадзяжамі, а таксама пазычаць грошы ў сваіх знаёмых і сяброў.

Зразумела, што не ўсе людзі пагаджаліся плаціць бандытам даніну. Тады да справы падключаліся «карнікі». Напачатку яны проста пагражалі, потым псавалі ці знішчалі маёмасць: падпальвалі аўтамабілі, офісы, крамы. Калі і пасля такога «намёку» людзі адмаўляліся плаціць, бандыты выкрадалі непакорных, па некалькі дзён трымалі іх у якасці закладнікаў, жорстка збівалі бейсбольнымі бітамі. Такім чынам дзейнічала гэтая жахлівая «крымінальная страха», пад якой апынуліся віцебскія прадпрымальнікі.

Спонсары «абшчака»

Яшчэ адной крыніцай папаўнення бюджэту «банды Рынаса» было страхавое махлярства.

Схема была даволі простая. Самі ўдзельнікі злачыннай арганізацыі альбо хтосьці з іх давераных асобаў імітавалі дарожна-транспартнае здарэнне. З дапамогай мясцовых «пярэваратняў у пагонах», якія афармлялі гэтыя ДТЗ, злачынцы атрымлівалі значныя страхавыя выплаты. Адметна, што такім чынам, прадажныя «даішнікі» ўдзельнічалі ў напаўненні злодзейскай скарбонкі — гэтак звана «абшчака». Калісьці прымітыўны злодзейскі банк — «абшчак» — папаўняўся толькі добраахвотнымі ахвяраваннямі саміх злачынцаў. Грошы са злодзейскай касы ішлі на дапамогу «калегам», якія знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі. Традыцыю дапамагаць сябрам па няшчасці (на злодзейскім жаргоне гэта называецца «падагрэвам зоны») імкнуліся падтрымліваць і «рынасаўцы». Паводле некаторых звестак яны «грэлі» вязняў калоніі ў Навасадах і Наваполацкага следчага ізалятара. Ролю спонсараў «абшчака» выконвалі не толькі прадпрымальнікі, якія штомесяц плацілі бандытам грашовы «падатак», але і «чаўнакі»: у іх адбіралі цыгарэты, каву, гарбату, прадукты харчавання і перапраўлялі на «зону».

Дарэчы, часткай свайго прыбытку Рынас некалькі гадоў дзяліўся з тульскай крымінальнай групоўкай, якая калісьці зрабіла яму пратэкцыю на Віцебшчыне.

Смелыя людзі

Варта адзначыць, што на Віцебшчыне знайшліся-такі смелыя людзі, якія нягледзячы на пагрозы і пабоі, адмаўляліся плаціць даніну бандытам. Адметна, што найбольш рашучае супраціўленне злачынцам аказала жанчына-прадпрымальнік. Калі яна адмовілася ад «крымінальнай страхі», злачынцы напачатку знішчылі яе аўтамабіль, а потым жорстка расправіліся з самой жанчынай. Бандыты напалі на яе ў пад'ездзе дома і моцна збілі бейсбольнымі бітамі. Гэта была паказальная і нахабная расправа. Пасля нападу падонкі пакінулі на месцы злачынства біты і маскі. Аднак віцебская міліцыя не здолела скарыстацца гэтым шанцам яшчэ ў красавіку 1999 года знайсці злачынцаў і ўвогуле спыніць дзейнасць усёй банды, бо ў паказальнай расправе ўдзельнічалі яе лідары Рынас і Ксяндзоў.

Зрэшты, былі яшчэ больш спрыяльныя выпадкі для арышту бандытаў. Напрыклад, адзін з прадпрымальнікаў, якога бандыты моцна збілі сярод белага дня, пазнаў некаторых сваіх крыўдзіцеляў і паведаміў у міліцыю. Але зноў жа вартавыя правапарадку чамусьці не парупіліся затрымаць падазроных, а потым увогуле спынілі справу.

Праўда, аднойчы мясцовая міліцыя затрымала аднаго з рэкеціраў. Бандыта ў следчым ізалятары пазнаў камерсант, які трапіў за краты пасля таго, як рэкеціры «ўключылі лічыльнік» і фактычна прымусілі красці, каб аддаць ім вялізную суму грошай. Калі ён усё расказаў міліцыянерам і прадставіў пэўныя доказы віны затрыманага рэкеціра, прадстаўнікі праваахоўных органаў чамусьці зноў не звярнулі ўвагі на гэтае шчырае прызнанне. Злачынная арганізацыя працягвала дзейнічаць...

Арыштавалі Рынаса і яго «байцоў» толькі ў ліпені 2006 года. Яго хаўруснік Ксяндзоў паспеў збегчы ў Расію. Амаль год хаваўся ў суседняй краіне і быў затрыманы ў Туле падчас спробы продажу зброі. Аднак крымінальны лідар да гэтага часу не экстрадзіраваны ў Беларусь.

Толькі дзякуючы намаганням супрацоўнікаў спецпадраздзялення па расследаванні асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў мінулых гадоў Галоўнага ўпраўлення папярэдніх расследаванняў МУС краіны «бандзе Рынаса» не ўдалося выслізнуць з рук правасуддзя. Следчая група пад кіраўніцтвам Юрыя Ендавіцкага аператыўна і высокапрафесійна правяла расследаванне. У выніку сам Рынас і яшчэ 27 яго «падначаленых» неўзабаве апынуцца на лаве падсудных. На іх рахунку 100 злачынстваў: крадзяжы, махлярства, вымаганне, выкраданне людзей, пашкоджанне і знішчэнне маёмасці, рабаўніцтва. Па справе праходзяць амаль 60 пацярпелых. Але, зусім верагодна, што колькасць ахвяраў бандытаў значна большая, бо многія «плацельшчыкі даніны» так і не адважыліся прыйсці ў міліцыю і аб усім расказаць.

Вірус страху

Увогуле, ставіць кропку ў справе Рынаса яшчэ рана. І не толькі таму, што не ўсе злачынствы гэтай банды выяўлены і не ўсе ўдзельнікі групоўкі трапілі ў рукі правасуддзя, некаторыя знаходзяцца ў вышуку. Зрэшты, нават калі апошні бандыт з памянёнай злачыннай арганізацыі апынецца за кратамі, гаварыць аб завяршэнні гэтай крымінальнай эпапеі ўсё роўна будзе заўчасна. Яна, на жаль, можа мець працяг. Злачыннае месца звычайна не пустуе. А ўмовы для ўзнікнення аналагічнай «брыгады» на калісьці падкантрольнай Рынасу тэрыторыі засталіся. І самая спрыяльная глеба для вымагальнікаў, якія могуць з'явіцца на месцы Рынаса і яго хеўры, — вірус страху. Ён жыве ў людзях. Нават пасля арышту лідара злачыннай арганізацыі і большасці яе ўдзельнікаў, некаторыя прадпрымальнікі не толькі пабаяліся прыйсці ў міліцыю і выступіць у якасці сведкаў, але... працягвалі плаціць даніну рэкецірам, якія яшчэ знаходзіліся на волі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ГАРАДЧУК

Паэт, празаік і перакладчык Леанід Дранько-Майсюк імкнецца як мага часцей наведваць сваю малую радзіму Давыд-Гарадок. Тут, ля Замкавай гары, на самым беразе Гарыні сярод кветкаводаў, рыбакоў, майстроў лодак і выдатных спецыялістаў па вырабе хромавых ботаў прайшло яго дзяцінства, напоўненае маляўнічымі вобразамі і адметнымі характарамі. Тут, у невялікім драўляным доме жывуць яго бацькі, заклапочаныя спрадвечнымі хатнімі справамі і, як усе гаradчукі, найперш сваім карміцелем-агародам. Васіль Мікалаевіч і Любоў Аляксееўна пенсіянеры і таму кожны прыезд сына для іх сапраўдная падзея. Шчыра радуюцца і ганарацца славутым суседам і моладзь, і старэйшыя. Паэту дарагая кожная сустрэча з землякамі, ён не хавае пачуццяў і з ахвотаю бярэ ўдзел у літаратурных сустрэчах. Сёлета ў самы пік старога Новага года (у Давыд-Гарадку ў гэты час адбываецца традыцыйнае шчодрае святкаванне) Леаніда Васільевіча запрасілі ў родную школу: чытаць вершы, прыгадваць маленства, разважаць пра паэзію, каханне, жыццё. Вучні самі чыталі паэту яго творы, за што атрымлівалі ад удзячнага аўтара цукеркі і... пацалункі. А старэнькія настаўніцы, якія даўно выпусцілі свае апошнія класы, з цеплынёю прыгадвалі час, калі адзін з іх вучняў настойліва і натхнёна рабіў свой незвычайны жыццёвы выбар.

НА ФАТАЗДЫМКАХ: з бацькамі ў роднай хаце; сустрэча на давыд-гарадоцкай вуліцы; паэтычная сустрэча ў другой сярэдняй школе Давыд-Гарадка — роднай школе Леаніда Дранько-Майсюка.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пытальнік

Працягласць тэлефонных размоў для льготнікаў лімітаваная

Паважаная рэдакцыя. Я з'яўляюся адзінокай непрацуючай пенсіянеркай, інвалідам з дзяцінства III групы. Раней я мела льготы па аплаце за тэлефон, як і за некаторыя іншыя пазіцыі камунальных паслуг, а цяпер я гэтай ільготы пазбавілася. У адной з вашых публікацый было напісана, што за інвалідамі з дзяцінства захавалася 50-працэнтная скідка пры аплаце за тэлефон. Дык каму верыць? Вашай газеце ці чыноўнікам, якія кажуць, што ў мяне льгот няма?

А.П. Беляснік, *г. Браслаў.*

Да вас звяртаецца інвалід II групы (пажыццёва) і ветэран працы (мне зараз 67 гадоў). Раней я карыстаўся 50-працэнтнай скідкай пры аплаце за карыстанне кватэрным тэлефонам. Але ў студзені атрымаў пісьмовае паведамленне з раённага вузла сувязі за подпісам яго начальніка, што згодна з новым законам мне прыйдзецца цяпер поўнасцю аплачваць свой тэлефон. У сувязі з гэтым прашу растлумачыць, ці мелі права пазбаўляць мяне гэтай ільготы?

С.М. Кавальчук, *г. Вілейка.*

Як удакладнілі ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Белтэлекам», згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных грамадзян», які ўступіў у сілу 17 студзеня 2007 года, права на аплату кватэрнага тэлефона з 50-працэнтнай скідкай (акрамя міжгародніх і міжнародных тэлефонных размоў) захавалася за Героямі Сацыялістычнай Працы (акрамя маючых права на бясплатнае карыстанне кватэрным тэлефонам), поўнымі кавалерамі ордэна Працоўнай Славы; удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны; інвалідамі вайны; асобамі, якія бралі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах; за асобамі, узнагароджанымі ордэнамі і (або) медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны; за асобамі, якія працавалі на аб'ектах проціпаветранай абароны, мясцовай проціпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог; за членамі экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрніраваных у пачатку ВАВ у партах іншых дзяржаў; за асобамі, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях блакаднага Ленінграда і ўзнагароджаных медалём «За абарону Ленінграда» і асобамі, узнагароджанымі знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».

Права на 50-працэнтную скідку з аплаты за тэлефон маюць таксама непрацуючыя грамадзяне з кола ваеннаслужачых, асобаў кіруючага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў воінскай службы (службовых абавязкаў) і інвалідамі з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў час Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў, які дасягнулі ўзросту, што дае ім права на пенсію па ўзросце на агульных падставах.

Інваліды I, II і III груп, як ні сумна канстатаваць, у пералік асобаў, што маюць права на льготу, не трапілі. Як і інваліды з дзяцінства, калі, вядома ж, іх інваліднасць не была звязана з баявымі і ваеннымі дзеяннямі часоў Вялікай Айчыннай вайны ці з іх наступствамі.

Для асобаў, якія маюць права на бясплатнае карыстанне кватэрным тэлефонам ці на 50-працэнтную скідку пры аплаце за тэлефон, устаноўлены пэўны ліміт, які складае 120 хвілін у месяц. Гэта азначае, што льгота распаўсюджваецца толькі на 120 хвілін тэлефонных размоваў (з іх 60 хвілін аплачваюцца ў складзе абанементнай платы). Калі, скажам, абанент размаўляў за месяц не дзве гадзіны, а тры, то трэцюю гадзіну (ці ўсё, што было нагаворана звыш лімітаваных 120 хвілін) ён будзе аплачваць па 100-працэнтным тарыфе.

Новы год: рыхтуем «пару мандарынаў»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кітайскі Новы год, як і заходні, багаты на розныя традыцыі і рытуалы. Да свята пачынаюць рыхтавацца за месяц, набываюць падарункі, мастацкія ўпрыгажэнні, прадукты і новую вопратку. Напярэдадні Новага года ў хатах праводзяць уборку, аднак яна носіць не столькі санітарна-гігіенічны, колькі рытуальны характар. Лічыцца, што гэта дапамагае вынішчыць усе сляды няўдач і расчысціць дарогу для ўдачы і шчасця.

Асобае месца ў святкаванні кітайскага Новага года займае ежа, дзе кожная страва мае свой сэнс. Традыцыйныя клёцкі jiaozi, якія смажацца на вадзе і знешне нагадваюць старажытнакітайскія манеты, лічацца сімваламі багацця і дабрабыту, прыносяць шчасце кожнаму, хто іх пакаштаваў. У некаторых правінцыях Кітая захаваўся звычай класці ў адну з jiaozi манету. Той, хто яе знойдзе, будзе забяспечаным увесь год. Крэветкі прыносяць шчасце і здароўе, высушаныя ўстрыцы — поспех, салата з сырой рыбы yu sheng — удачу, марскія водарасці «Валасы Анёла» (Fai-Hai) — росквіт. Увогуле, святочны стол на Новы год павінен быць багатым, гэта лічыцца добрай прыметай.

У кітайцаў ёсць цікавы рытуал — провады Бога Кухні — Тсао Чана, які адбываюцца пасля традыцыйнай уборкі дома напярэдадні Новага года. Тсао Чан даў людзям агонь, ён лічыцца апекуном сямейнага ачага, цэнзарам маралі. Выява Тсао Чана вісіць у кожнай хаце. У канцы года Тсао Чан пакідае дом, каб паведаміць нябёсам пра паводзіны сям'і. Натуральна, усе намагаюцца задобрыць бога Кухні, каб «справаздача» была станоўчай (мажуць яму вусны мёдам і цукрам). Потым яго выяву спальваюць, і бог разам з дымам накіроўваецца на нябёсы, да Нефрытавага Імператара. Назад Тсао Чан вяртаецца ў першы дзень Новага года.

Кітайскі Новы год доўжыцца 15 дзён. У першы дзень не дазваляецца есці мяса — лічыцца, што такая ежа можа адвярнуць ад чалавека шчасце на цэлы год. Не варта мыць валасы, каб не змыць удачу, карыстацца нажніцамі і нажамі, каб не адрэзаць удачу. Кітайцы, як і еўрапейцы, вераць, што як Новы год сустрэнеш, так яго і правядзеш, таму ў гэты перыяд імкнуцца радаваць адзін аднаго, дарыць падарункі: чырвоныя канверты з «грашыма ўдачы», навагоднія далікатэсы, пірагі, чай, насенне дыні і іншых пладоў, кветкі, «віно шчасця». Ёсць традыцыя на Новы год абменьвацца пры сустрэчы двума мандарынамі: спалучэнне «пара мандарынаў» па-кітайску гучыць так жа, як і слова «золата».

На другі дзень Новага года кітайцы ўзгадваюць багоў і памерлых продкаў, аддаюць ім даніну памяці. Акрамя таго, гэты дзень з'яўляецца днём нараджэння ўсіх сабак! На трэці і чацвёрты дзень Новага года прынята хадзіць у госці да сваякоў мужа і жонкі. Пяты — праводзіць дома, шанаваць бога Багацця. Сёмы дзень самы важны для фермераў. Яны робяць спецыяльны напой з агародніны, ужываюць сырую лапшу (як сімвал даўгалецця). Сёмы дзень лічыцца днём нараджэння ўсіх людзей. У апошні (15-ы) дзень пачынаецца Фестываль Ліхтароў, з рытуальнымі танцамі і пераапраннямі.

НЕБЯСПЕКА КОЛЬЦАПАДОБНАГА ЗАЦЬМЕННЯ

Сёлета наступленне Новага года, паводле Усходняга календара, супадае з сонечным зацьменнем. З'ява гэта даволі рэдкая, таму мы папрасілі **астролага Кацярыну ФЛІКОП** расказаць, чаго варта чакаць ад такога незвычайнага «спалучэння»:

— Сапраўды, 7 лютага, у 5.44 раніцы нас чакае сонечнае зацьменне, аднак яно будзе не поўным, а кольцападобным. Зямную паверхню перасячэ конус — працяг месяцовага цяню (сам Месяц занадта далёка ад Зямлі, каб цалкам засланяць Сонца). Месяц закрые толькі 0,965 дыяметра сонечнага дыска і пакіне бачным танюткі абадок. Мы з вамі само зацьменне не ўбачым (вобласць найлепшай бачнасці прыйдзецца на прыпалярныя і сярэднія шыроты паўднёвага паўшар'я). Гэта можна будзе зрабіць, знаходзячыся на поўдні Аўстраліі, Новай Зеландыі і ў паўднёвай частцы Ціхага акіяна.

Вышэйазначанае зацьменне можна лічыць незвычайным, бо ў адрозненне ад астатніх, якія праходзяць з захаду на ўсход, яно пачне рухацца з усходу на захад, паступова паверне на поўнач, а пасля зверне на ўсход.

Згодна з астранамічнымі разлікамі працягласць максімальнай фазы гэтага зацьмення — 132 секунды, альбо 2 хвіліны 12 секунд. Для старажытных астролагаў падобная інфармацыя мела вялікі сэнс. Лічылася: колькі хвілін доўжыцца зацьменне, столькі гадоў яно будзе ўплываць на лёс людзей і дзяржаў. Аднак асабліва перажываць нам не варта: сонечныя зацьменні, якія не бачны ў пэўным рэгіёне ці краіне, не аказваюць на іх асабліва моцнага ўплыву. Акрамя таго, было выяўлена, што падчас сонечнага зацьмення найбольшы ўплыў звычайна праяўляецца праз некалькі месяцаў, і чым больш поўным з'яўляецца зацьменне, тым большы яго ўплыў на Зямлю і яе жыхароў. Як мы ўжо казалі, зацьменне 7 лютага будзе частковым, а значыць, яго ўплыў будзе менш выражаным.

У самых розных культурах Сонца лічылася бачнай праявай Бога, духоўнага пачатку ў самім чалавеку. З Сонцам заўсёды звязвалася разуменне жыцця, не толькі фізічнага, але і духоўнага. А вось Месяц — другі ўдзельнік зацьмення — азначаў эмацыянальны і фізічны свет, чалавечыя жаданні, эмоцыі. Атрымліваецца, што момант сонечнага зацьмення сапраўды з'яўляецца неспрыяльным і нават небяспечным для духоўнага развіцця чалавека, бо яго вышэйшы пачатак можа засланіцца жаданнямі, настроем, эмоцыямі. Чалавек можа запусціць шэраг неспрыяльных для сябе падзей, наступствы якіх амаль немагчыма будзе потым змяніць.

Трэба быць асабліва пільнымі, калі абставіны вымушаюць вас актыўна дзейнічаць і прымаць рашэнне менавіта ў гэты дзень (яно можа аказацца лёсавызначальным). Галоўнае — спакойна паставіцца да ўсяго, што адбываецца ў гэты момант, не паддавацца слабасцям, успышкам эмоцый. Варта памятаць, што найбольшая моц зацьмення — у момант яго наступлення (5.44 раніцы) 7 лютага, аднак заўважны ўплыў зацьмення пачынаецца за 3 дні да яго дакладнай даты і дзейнічае яшчэ тры дні пасля наступлення. Улічвайце, што яшчэ 2 гады да вас будуць вяртацца наступствы лёсавызначальных падзей гэтых дзён. Будзьце мудрымі пры прыняцці адказных рашэнняў.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

Добры дзень, родныя словы!

КРАМА НА КАЛЁСАХ...

Жыхар вёскі Гаёўка Дзяржынскага раёна Кастусь Шатас у сваім лісце ў рэдакцыю піша: «Трапіўся на вочы зборнік апавяданняў паважанага аўтара. Чытаю, творы неблагія, цікавыя. І раптам бачу ў ім: аўтал<u>аўка</u>. Сустракаў гэтае слова і ў некаторых газетах. Як усё ж правільней: аўтал<u>аўка</u> ці аўтак<u>крама</u>?»

Вядома ж: **аўтак<u>крама</u>.**

У слова крама (руск. **лавка** — невялікі магазін) даўняя радаслоўная. У нашай мове пісьмова яно засведчана недзе каля 1586 года. А ў вусным ужытку бытуе, пэўна ж, куды раней.

Хоць крама — невялікі магазін, але і яна можа быць меншай, чым звычайна, тады гэта **крамка**. Была і занатаваная ў «Слоўніку» І.І. Насовіча **крамнічка** — крама дробных тавараў (руск. **мелочная лавка**).

А ўжо крама прывяла ў мову іншую грамаду слоў. **Крамнік** — гэта ўласнік крамы або прадавец у ёй. А калі гэта была жанчына, то **крамніца**. Не забудзьма, хай і размоўнае, але таксама вядомае слова **крамнічыха** (гэта ўжо крамнікава жонка).

Памятаю, у сваім маленстве чуў, як суседка, прыехаўшы, скажам, з нядзельнага кірмашу, казала пра сваё местачкоўскія справункі (абновы). «Набрала краму (або крамніны)» — гэта значыць купіла нейкага матэрыялу фабрычнага вырабу — таго, што набываецца ў краме: паркалю, саціну, мультану, корту і падобн. Гэта было **кра́мнае** ў адрозненне ад **самаробнага, уласнай работы, саматкanага, даматкanага, самадзялковага,** што здабывалася, майстравалася ў сялянскай хаце.

Так і памятаецца слова **набраць** у значэнні **купіць**: набраць сукенку або набраць матэрыялу на сукенку і г.д.

Нешта падобнае, як у савецкі час пазней адмыслова адметна ўжываліся і іншыя словы, цяпер, можа, і не вельмі зразумелыя маладзейшаму пакаленню: «**Выкінулі** туфлі (гэта значыць: паявіліся ў продажы)» або: «**Даюць** каўбасу (гэта значыць: можна купіць)». Бо не сённяшні гэта быў час, калі ў гіпермаркетах, супермаркетах, магазінах, крамах усяго-усяго, бяры — не хачу, абы грошы...

Але крыху адхіліліся ад слова крама і яго спадарожнікаў.

Побач з крамнікам у народных гаворках сустракалася ў тым жа значэнні і слова **крамар** (можа, не без украінскага і польскага ўплыву, дзе яно — як літаратурная норма). У нас жа гэтае слова захавалася ў прымаўцы з яшчэ дакастрычніцкіх часоў: «Крамар як камар, дзе сеў, там і п'е». Бо, як казала яе сяброўка, другая прымаўка, «гандлю без ашукі не бывае». Або: «на рынку і бык цельны...».

Але затое як міла гучыць іншая прымаўка: «Няма тае крамкі, дзе прадавалася б мамкі».

Дык вунь які кавалак беларускай гісторыі паўстае за словам **крама**... Дык ці годна беларусу выракацца слова, сагрэтага вуснамі нашых бацькоў, дзядоў, прадзедаў.

А вось ужо і не адно дзесяцігоддзе радуе вяскоўцаў і аўтакрама, крама на калёсах. (Як паведамляе Кастусь Шатас, штопанядзелак яна завітвае ў іх Гаёўку.)

Шкада толькі, што не ва ўсіх рэдакцыях і выдавецтвах ёсць свае ДАІ, якія б давалі дарогу аўтакрамам і спынялі непатрэбныя аўталаўкі.

Анатоль КЛЫШКА.

Ну і ну!

У ДВА ПРЫЁМЫ

У в. Малая Сваротва Баранавіцкага раёна ў двары аднаго гаспадара сабака загрыз трыццаць трусоў.

Зрабіў ён гэтую шкоду ў два прыёмы. У першы дзень правіўся з 15 даўгавухімі, а на наступны дзень зрабіў паўторны набег. Міліцыя спадзяецца знайсці гаспадара сабакі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«А я пішу так...»

Вячаслаў КЕБІЧ:

«Я не хацеў рабіць спакойную кнігу»

Днямі ў мінскім Доме літаратара былы прэм'ер-міністр Беларусі Вячаслаў Кебіч прэзентаваў кнігу сваіх успамінаў. У кнізе, якая мае назву «Спакушэнне ўладай», падрабязна апісваюцца падзеі перад распадам Савецкага Саюза, путч у Маскве 1991 года, падпісанне Белавежскіх пагадненняў, першыя выбары Прэзідэнта Беларусі. Завяршаюцца ж успаміны нашымі днямі.

Паводле слоў Вячаслава Кебіча, на напісанне кнігі яго падштурхнулі пытанні іншых людзей аб тым, чаму ён не хоча ўзгадаць падзеі, сведкам якіх быў. Пры гэтым былы прэм'ер-міністр патлумачыў, што выдаў кнігу толькі праз значны час пасля таго, як пакінуў пасаду кіраўніка ўрада, бо калі б кніга з'явілася раней, то «была б надзвычай эмацыйнай». «Бо былі б свежымі крыўды...»

Цытата з кнігі (пераклад з рускай мовы):

«...Што стала з «золатам партыі»? Значная яго доля, якая аказалася ўжо тады раздробленай на часткі, так і не была запатрабавана яго гаспадарамі, перайшла ва ўласнасць замежных банкаў і прадпрымальных людзей, якія ведалі пра яго існаванне. Астатнія сродкі паслужылі стартавым капіталам для буйных расійскіх банкаў і фінансавых карпарацый. Нехта добра нагрэў на іх рукі.»

Аўтар таксама адзначыў, што назва кнігі не мае адносінаў да яго лёсу. «Многія пытаюцца: дык вы гэта пра сябе? Не. Гэта пра ўсіх тых, хто рвецца да ўлады... Пры Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ты мог рвацца да ўлады, але не атрымаць яе. А мог улады не жадаць, а цябе прымусяць яе ўзяць. Я адносіўся да ліку тых людзей, якія ніколі не імкнуліся да ўлады. Але ў нас быў прынцып: партыя сказала — камсамол адказаў: «Ёсць!» Так было і са мною».

Вячаслаў Кебіч чакае розную рэакцыю на сваю кнігу ад людзей, пра якіх ён піша. «Так, я не хацеў пісаць спакойную кнігу. Я пісаў яе такой, каб выклікаць, мабыць, нават абурэнне некаторых з тых, пра каго я пішу. З іншага боку, выклікаць і добрыя словы тых, хто зразумее кнігу».

Цытата з кнігі:

«...Разумеючы, што частка віны за правал у першым туры на іх сумленні, члены штаба выказваліся за байкот другога тура.

— Грамадская думка да такога выніку выбараў маральна гатовая. Людзі зразумеюць, што вы ідзяце на гэты крайні крок у інтарэсах краіны, — пераконвалі мяне.

...Пэўная логіка ў разважаннях членаў майго штаба была. Аднак я нават у думках не дапускаў магчымасці байкоту і тым больш фальсіфікацыі...».

«Вельмі цяжка быць аб'ектыўным... Тым не менш я стараўся пісаць і пра памылкі...», — дадаў Вячаслаў Кебіч.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



На конкурс апавяданняў

Пісьменніцкая адметнасць пісьма Аркадзя Нафрановіча — веданне да драбніц таго, пра што ён хоча давесці чытачу. І жорсткі аповед пра гэта. Жорсткі, як само жыццё, тым больш жыццё вясковае, гаротнае, сялянскае.

Віктар КАЗЬКО.

УЛАСНЫ КОНЬ

Крочыла па знявечанай зямлі першая пасляваенная вясна.

Антось крыў саломай не «першай маладосці» хату, якую купіў за збожжа, заробленае шавецкай справай. Ён спяшаўся — трэба было да наступлення восеньскіх халадоў усяліцца ў сваё жытло, у чужым куце сядзець не вельмі соладка. І вось хата накрыта: яна выглядала пажылой кабетай, якая надзела новы саламяны капялюш.

Добры Антосеў сусед змураваў у кухні печ, а ў чыстым пакоі — грубку, ды так удала, што з цягі было не нацешыцца. І награвaліся хутка, і цяпло трымалі доўга. У пачатку восені сям'я ўсялілася ў сваю, такую дарагую і доўгачаканую хатку. Яна была далёка не раўня даваеннай хаце. І ўсё ж гэта было шчасце.

Вясной наступнага года каля акна хаты зацвіла груша-дзічка. Мільёны кветак — быццам белае воблачка спусцілася з неба на дрэўца. Груша, на ствале якой бачыліся сляды ад ран, атрыманых ёю падчас пажару, буяла пышным цветам, яна нібы падбадзёрвала Антося і ягоную сямейку: «Будзем жыць, будзем жыць!» А ў бярэзніку заліваліся салаўі — якія толькі ні бралі яны ноты, якія ні высвіствалі складаныя гамы. Зямля пад промнямі памаладзелага сонца глыбока дыхала, паравала, гатовая прыняць у сябе зярняты збожжа, каб потым аддзячыць багатым ураджаем. Усё наўкола радавала сэрца, цешыла вока — жыццё адраджалася на родных прасторах.

А ў думках было адно: як абзавесціся ўласным канём, без яго зямлю не падняць. Нехта падказаў, што ў суседняй вёсцы прадаецца конь. Пайшоў Антось са сваім братам, знайшоў прадаўца і купіў не каня, а каняку. Не з-за хваробы, а з голаду бедная скацінка так аслабела, што самастойна падняцца на ногі не магла. Прыцэл у братоў быў такі: на маладой траве ад'есца, акрэпне, будзе конь. Але як жа прывесці каняку дамоў, дарогі — каля дзесяці кіламетраў. Для яго гэта быў немалы шлях. Ды трэба было весці так, каб, барані божа, не зачапіўся капытом за камень ці грудок, а то панырне, упадзе, рукамі не паднімеш. Ішлі з двух бакоў і трымалі каня за аброць. Выйшлі поўднем, а дабраліся дахаты, калі ўжо вечарэла. Выбеглі з хаты дапамагчы, падзівіцца на новы набытак у сваёй гаспадарцы. Каля плота стаяў высокі конь чорнай масці. Вялікая галава, бакі нібы драбіны, рэбры здалёк можна пералічыць. Ён нясмела і неяк вінавата пазіраў на людзей.

Быў пачатак красавіка, трава і не думала кранацца ў рост. Кармілі каня сенам, зрэдку давалі бульбы, буракоў, цёплае пойла, забеленае мукой. Раніцой не раз даводзілася паднімаць небараку, каб паставіць на ногі. Для гэтага пад бруха прапускалі вяроўкі, перакідвалі канцы праз бэльку і цягнулі. Даводзілася і лазінай падганяць, каб каняка і сам рухаўся. Імкнуўся ўстаць.

Калі жывёліна крыху акрэпла, паспрабавалі прагнаць некалькі баразён. Антось стаў за плуг, жонка ўзялася за аброць, а брат Антося і яго сусед трымалі за канцы жэрдку, якую прапусцілі пад жыватом каля пярэдніх ног, каб Яфрэм — такая ў каня была клічка, — не ўпаў. Адзін крок, другі, трэці — няспешна, памаленьку рухаліся наперад конь і людзі. Плуг рэзаў дзірван і адкідваў пласты парадкам здзічэлай травы. Конь цяжка дыхаў, ногі перастаўляў асцярожна. Прагнаўшы дзесятак нядоўгіх баразён, Антось сказаў:

— Усё, хлопцы, на першы раз хопіць.

Месяц май ужо ладна крочыў па нівах і лугах. Дружна зелянелі травы. Аднае раніцы Агата, жонка Антося, узрушаная, адчыніла дзверы і радасна выгукнула:

— Антоська, конь сам падняўся на ногі!

Антось выбег з хаты, накіраваўся да каня, які спакойна скуб маладую траву на аселіцы. Ён гладзіў яго па шыі, пляскаў па лапатках, прыхінаўся шчакой да галавы і ўсё прыгаворваў:

— Маладзец, канёк, падняўся. Не прападзём, Яфрэмка, не прападзём.

Нанач адвялі каня на лужок, што за нейкія дзвесце метраў ад хаты, каб уволю наеўся сакавітай мурожнай травы.

Раніцой Антось пайшоў па каня. Праз колькі часу з'явіўся ў дварышчы з адной аброццю, паніклы, нейкі пастарэлы.

— А што ж здарылася? — устрывожылася жонка.

— Няма нашага Яфрэма, воўк задавіў. Як цяпер жыць, што рабіць — не ведаю.

Гэта была трагедыя, нават больш чым трагедыя. Усе надзеі адрадзіць жыццё на зруйнаваным хутары, на здзірванелых нівах рухнулі ў адно імгненне. Без каня чалавек на зямлі не гаспадар.

Антось упершыню ў жыцці плакаў. Прысеўшы на ганак, ён па-дзіцячы выціраў слёзы.

Аркадзь НАФРАНОВІЧ.

Вёска Камаі

Пастаўскага раёна.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (2 лютага). Па гарызанталі: Піктаграфія. План. Кат. Барсук. Лета. Рок. Фанза. Сарыч. Вага. Амаці. Юнак. Гар. Рыса. Кашара. Нос. Адамашка. Ралі. Яма. Вадамер. Катэдж. Дума. Шкло. Акра. Агарак. Меню. «Янка». Сверб. Арык. Вір. Мазанка. **Па вертыкалі:** Аэрадынаміка. Сода. Сафа. Аса. Ком. Кон. Астана. Іглу. Экю. Кадр. Явар. Танкер. Юрта. Жаўнер. Атос. Крым. Ітака. Акула. Арабка. Рака. Дым. Шарада. Чага. Амур. Цар. Лема. Ліра. Рэспубліка Ірак.

Усміхнёмся!



Настаўнік матэматыкі з лёгкасцю выйграў у прэферанс трынаццатую зарплату і прэміяльныя ў настаўніка геаграфіі і па яго парадах паехаў адпачыць у месца з вельмі прыгожай назвай. Але, як аказалася, глухое і гіблае.

☺

Фразы, якія немагчыма выгаварыць у п'яным выглядзе:

— Не, не распранайся, ты мне не вельмі падабаешся.

— Не, мне больш не налівайце!

— Не, не буду спяваць, усё роўна ніхто не слухае!

— Добры вечар, таварыш сяржант, я вельмі задаволены, што вы мяне спынілі!

☺

Сучасная дзяўчына перш за ўсё павінна вывучыцца тром навукам: выццю, кулінарыі і стрыгчы валасы. Каб потым, калі яна возьме шлюб з буйным бізнэсменам, з веданнем справы ганяць сваіх швачак, кухавак і цырульніц...

☺

— Ты чаго такі сумны?

— У мяне пашпарт укралі...

— У міліцыю хадзіў?

— Хадзіў... Не яны...

Заручальны пярсцёнак знайшоўся праз 67 гадоў

Пажылая брытанка знайшла заручальны пярсцёнак, які быў згублены ёю 67 гадоў таму. У 1941 годзе Віялета Бус шпульнула пярсцёнак у поле падчас сваркі з жаніхом. Памірыўшыся, маладажоны доўга спрабавалі знайсці яго, але так і не змаглі. Дарагую сэрцу рэч адшукаў унук місіс Бус пры дапамозе металашукальніка.

Кар. БЕЛТА.

Аўтажарт

Немец вярнуўся з аўтападарожжа па Расіі і скардзіцца сябру:

— Вось дык ужо гэтыя рускія дарогі! Пакуль усе ямкі аб'язджаў, зламаўся гідраўзмацняльнік руля.

Аўтаараркестр

РЭКЛАМНЫ «FOCUS»

Галівудскі кампазітар Крэйг Рычы і дызайнер гука Біл Мілброт стварылі музычны аркестр, у якім усе інструменты, а іх больш за 30, зроблены з дэталяў аўтамабіля «Ford Focus».

Неўзабаве ў Вялікабрытаніі адбудзецца і першы канцэрт незвычайнага аркестра. Ён будзе выконваць музыку ў рамках рэкламнай кампаніі новай мадэлі «Ford Focus».

Аўтарэкорд

«МОТА-МОНСТР»

У Аўстраліі створаны самы вялікі ў свеце матацыкл. Вышыня «Monster Motorbike» складае 3 метры, а даўжыня — 9 метраў. Монстр важыць 13,6 тоны. Рухавік у гіганта ад амерыканскага дызельнага грузавіка.

Аўтарарытэты

ЗАХАВАЙЦЕ ДА ЛЕПШЫХ ЧАСОЎ

Да ведама ўладальнікаў серыйных аўтамабіляў наступных марак і мадэляў: «Subaru Impreza WR Sti» «Cadillac XLR-V Roadster» «Lotus Exige S» «Mustang Shelby GT 500 KR» «Audi S5» «Chevrolet Corvette Z06» «Smart» «Pontiac Solstice/Saturn Sky»! Паводле даследавання аўтарытэтнай амерыканскай кампаніі Hagerty, якая спецыялізуецца на продажы рарытэтных машын, менавіта за памянёнымі мадэлямі ўжо праз дзесятак гадоў распачнуць паляванне калекцыянеры. Зразумела, што кошт аўтарарытэтаў узрасце ў некалькі разоў. Таму гаспадарам гэтых аўтамабіляў эксперты раяць не развітвацца са сваімі машынамі, а пачакаць, пакуль яны ператворацца ў рэдкія экзэмпляры.

Аўтаадказчык

ПЛАТА ЗА ПРАВЫ

Чула, што збіраюцца адпусціць цэны на навучанне ў аўташколах. Якім будзе новы памер платы за пасведчанне кіроўцы?

Вольга Шэўская, *г. Мінск*

Сапраўды, Міністэрства транспарту і камунікацый падрыхтавала дакумент, паводле якога прапануецца адмяніць фіксаваную плату за навучанне ў аўташколах. Зараз прапановы Мінтранса вывучаюць у Савеце Міністраў, а канчатковае рашэнне павінен прыняць Прэзідэнт. Такім чынам, новыя кошты за навучанне ў аўташколах з'явяцца толькі пасля ўступлення ў сілу адпаведнага прэзідэнцкага ўказа. У дадзены момант за навучанне кіраванню легкавым аўтамабілем (правы катэгорыі «В») трэба заплаціць 599 тысяч 80 рублёў. Да таго ж, неабходна за свае грошы набываць 60 літраў бензіну. Пакуль цяжка вызначыць дакладна, якой будзе плата за пасведчанне кіроўцы пасля адмены фіксаванай цаны. Усё будзе залежаць ад аўташколы. Напрыклад, у адной з «элітных» аўташкол ужо заявілі, што плануюць павысіць кошты ў два разы. Іншыя аўтакамбінаты маюць намер падняць цану на 200—300 тысяч рублёў. Справа ў тым, што ў больш дарагіх аўташколах для практычнага навучання выкарыстоўваюцца амаль новыя, па нашых мерках, іншамаркі, якія патрабуюць большых выдаткаў на абслугоўванне. А пераважная большасць астатніх навучальных устаноў мае састарэлы парк машын расійскай вытворчасці. У Мінтрансе запэўнілі, што нематываванага павышэння коштаў не будзе. Кожная аўташкола павінна будзе прадаставіць у мясцовыя органы ўлады свае абгрунтаванні.

Варта адзначыць, што павышэнне не ўдарыць па кішэнях курсантаў, якія ўжо праходзяць навучанне. А вось навабранцы павінны будуць раскашэліцца.

Між іншым, у Мінску чарга ў аўташколы складае ад 3 да 9 месяцаў. Магчыма, пасля павелічэння коштаў гэтыя чаргі скароцяцца. І не толькі таму, што многім людзям правы будуць не па кішэні. Некаторыя аўташколы, атрымаўшы магчымасць працаваць з прыбыткам, плануюць павялічыць набор курсантаў.

Аўтабяспека

ПРАФІЛАКТЫКА ДЛЯ ПЕШАХОДА

У Беларусі распачалася акцыя па прафілактыцы дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам пешаходаў.

Як патлумачыў старшы інспектар упраўлення ДАІ МУС краіны Фёдар Гуліцкі, у акцыі задзейнічаны ўвесь асабовы склад міліцыі грамадскай бяспекі, курсанты Акадэміі МУС і міліцэйскіх навучальных цэнтраў. Асаблівая ўвага будзе скіравана на сельскую мясцовасць. Паводле статыстыкі, штодзень у Беларусі пешаходы здзяйсняюць у сярэднім каля 1 тысячы парушэнняў Правілаў дарожнага руху. Прыкладна 700 пешых парушальнікаў прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці за адсутнасць флікера (штраф ад 0,5 да 3 базавых велічынь). Дарэчы, значная частка ДТЗ з удзелам пешаходаў адбываецца ў цёмны час сутак менавіта з-за адсутнасці святлоадбівальных элементаў. За першы месяц гэтага года зафіксавана больш за 270 наездаў на пешаходаў, у выніку якіх 56 чалавек загінулі і амаль 230 — паранены. Увогуле на дарогах краіны ў студзені адбылося 536 ДТЗ, у якіх 126 чалавек загінулі і 560 — атрымалі раненні.

Аўтакірмаш

ДЫНАМІЧНАЕ АБНАЎЛЕННЕ

Другі год запар у нашай краіне назіраецца рост продажу новых аўтамабіляў.

Паводле звестак Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, летась у нашай краіне было зарэгістравана 17 678 новых іншамарак (расійскія машыны не ўлічваюцца), што на 7658 больш, чым у 2006 годзе. Найбольшай папулярнасцю ў беларусаў карыстаюцца мадэлі малога класа і ўсюдыходы. Адметна, што нязменным лідарам на беларускім аўтарынку трэці год з'яўляецца «Volkswagen». Летась у нашай краіне было зарэгістравана больш за 3490 «народных аўтамабіляў».

А вось расійскія аўтавытворцы страчваюць свае колішнія лідзіруючыя пазіцыі ў Беларусі. Летась у нашай краіне было зарэгістравана 7268 расійскіх машын, што на 6 працэнтаў менш, чым у 2006 годзе. І такая негатыўная для расіян тэндэнцыя назіраецца ўжо не першы год.

Спецыялісты адзначаюць, што ў мінулым годзе больш за 40 працэнтаў новых аўто былі куплены ў крэдыт.

Аўтаархіў

6 лютага

1613 год — 395 гадоў таму ў Мінску ў раёне Ніжняга рынку завяршылася будаўніцтва Петрапаўлаўскай царквы, помніка архітэктуры барока.

1708 год — шведскі кароль Карл XII у ходзе Паўночнай вайны са сваім войскам заняў Гродна.

«Цуд — гэта падзея, апісаная людзьмі, якія чулі пра яе ад тых, хто яе не бачыў».

Элберт Хабард.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.49	16.59	9.10
Віцебск —	7.43	16.44	9.01
Магілёў —	7.39	16.49	9.10
Гомель —	7.31	16.51	9.20
Гродна —	8.03	17.15	9.12
Брэст —	7.59	17.21	9.22

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Ксеніі, Герасіма, Івана, Мікалая, Цімафея;*

К. *Аманды, Дароты, Багдана, Ціта.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+5..+7°С	КІЕЎ	+1..+3°С	РЫГА	+4..+6°С
ВІЛЬНЮС	+3..+5°С	МАСКВА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-1..+1°С

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

Сямейны серыял «ЖАНАЦІКІ»

«ГЭТА ШТО НА ПАДЛОЗЕ ЛЯЖЫЦЬ?!»

Наш газетны серыял — пра сямейнае жыццё. Пачалося яно не так даўно, крыху менш за два месяцы, менавіта тады ўзяў шлюб ваш пакорлівы слуга, карэспандэнт «Звязды». І з таго часу ўсё, што адбываецца са мной і маёй жонкай Ганначкай я, не крывячы душой, пераношу на старонкі нашай любімай газеты. Такім чынам, вяселле прайшло, быт пачаў наладжвацца... Пасля святаў прыходзяць будні — без гэтага ніяк. І ў сённяшняй серыі мы сутыкаемся з першым сямейным канфліктам...

Сённяшні каментарый — пенсіянеркі Таццяны Пятроўны АНДРУШЧАНКІ з Мінска, якая ведае прыватнае жыццё маладых і не вельмі жанацікаў у радыусе чатырох пад'ездаў свайго дома і васьмі лавачак двара. Стаж сямейнага жыцця — 52 гады.

— У нас сварак і спрэчак амаль не было. Мы былі занятыя справай, шмат працавалі, і часу, каб лаяцца, не заставалася. Гэта сёння новае пакаленне больш спешчанае, чым нашае. Некаторыя дзяўчаты ставяцца да хлапцоў не як да каханых, а як да кішэні з грашыма. А мужыкі ўсё шукаюць ідэальных жанчын. У сем'ях ставяцца адно да аднаго легкадумна, змяніліся размовы, паводзіны мужа і жонкі.

— Я раю не спрачацца з мужам, пагаджацца з яго думкамі, тады ў сям'і будзе лад. А мужчына павінен паважаць сваю жонку і ніколі не крыўдзіць яе.

Два дні таму мы пасварыліся. Не вельмі гучна, не тое што сур'ёзна, здаецца, і без асаблівай нагоды, але ўсё ж такі... Слова чапляецца за слова, як адбываецца часцей за ўсё, і дробныя дакоры здольныя захапіць розум. І тады наступствы могуць быць зусім непрадказальнымі.

Тым больш што паводзіны нашы ў час сямейных канфліктаў розныя. Вось я ніколі не прызнаюся, што чым-небудзь пакрыўджаны, проста буду дзень і нават два лунаць па кватэры, тоячы прычыну свайго агіднага настрою. І буду маўчаць увесь час. Не так, як рыба, але і паразмаўляць па-людску будзе з вашым аўтарам немагчыма. Такі «змрочны» характар, з тым і жыву. А Ганна наадварот. У ёй, толькі паміж намі, часам прачынаецца сапраўдная бландзінка. Нават нефарбаваная, натуральная. На фатаздымках дзяцінства, ад нараджэння і да дзесяці—дванаццаці гадоў валасы маёй жонкі былі светлымі. Добра яшчэ, што з узростам сталі цямнейшымі. Але, як там па тэорыі псіхааналізу, вобраз жанчыны з белымі валасамі будзе суправаджаць нашу сям'ю, здаецца, усё жыццё. Таму Ганначка ў час спрэчак можа спачатку выказаць імпульсіўныя гнеўныя прамовы, а потым ужо разважаць над тым, як яны ўплываюць на навакольных. Гэта значыць, на мяне. І праз хвілін пяць яна цалкам «астуджаецца», быццам нічога не адбылося.

Наша спрэчка так і пачалася. Прыехаўшы з работы, дзе ёй, відавочна, пакалашмацілі нервы, не распранаючы паліто, яна з парога, прычым на вельмі высокіх нотах і зусім як сапраўдная бландзінка выказала незадаволенасць:

— Гэта што на падлозе ляжыць? Што за смецце? Няўжо цяжка было прыбраць, чым ты тут займаўся, не разумею ўвогуле! — і ўсё гэтак патрабавальна, амаль як у анекдотах. Але не было б так смешна, калі б не было так сумна.

Такой спрытнасці ад жонкі я не чакаў, тым больш што на сцерву яна не падобная. Ну, амаль не падобная, бо ўсе жанчынкі, самі ведаеце... Сітуацыю ўскладніла і тое, што ў гэты час у нашым адзіным пакоі за камп'ютарам сядзеў мой сябра. Не ведаю, як у астатніх прадстаўнікоў мужчынскага роду ўсяго чалавецтва і яго навакольляў, але мне вельмі не падабаецца, што ў прысутнасці іншых са мной размаўляюць загаднымі інтанацыямі. Тым больш, любімая жонка, тым больш, перад сябрам. Глупства, згодзен, юнацкае, але мой аўтарытэт галавы сямейства, я так падлічыў, мог пацярпець. Нават перад катом стала няёмка. Таму ў адказ мая каханая пачула нешта скрозь зубы, з'едлівае і вострае:

— Ты што мне тут, допыт збіраешся наладжваць!? Я не збіраюся адказваць табе, чым я тут займаўся. Мая асабістая справа!

Уласна кажучы, я нічым «такім» не займаўся, і на падлозе ляжала пластыкавая бутэлька з-пад мінералкі. Ну не заўважыў, бывае... Увесь вечар мы правялі ва ўзаемных спаборніцтвах, хто каго лепш «зачэпіць». Прычым уступіць гатовыя абодва, але першы крок я, напрыклад, не хацеў рабіць. І яна таксама. І не трэба, паважаныя чытачы, пасміхацца — тое, што гэта пазіцыя, прабачце, дурняў, мы і так ведаем... З-за такой дробязі можа сапсавацца ўвесь настрой. Упартасць не лепшая якасць. Як бы там ні было, але дараваць адно аднаму трэба, у чым мы пераканаліся яшчэ раз. Памірыліся ў той жа дзень, нават не памірыліся, а адначасова спынілі спрэчкі, і непразуменне быццам бы распалася, а непрыемнае пачуццё ўсё роўна захавалася.

Крыўдна яшчэ, што спрачаемся мы, а тым больш сварымся вельмі рэдка, і заўсёды — па не годных увазе прычынах. Мы з жонкай дамовіліся, будзем трымаць сябе ў руках, каб не зрабіць адно аднаму балюча. Нават калі і не вельмі балюча, але ўсё роўна — будзе адчувацца. Затое ёсць і станоўчыя бакі, бо ў наш прыватны спіс каштоўнасцяў і дасягненняў сям'і занесена першая сварка. Не такая ўжо і ганаровая заваёва, але і без яе амаль немагчыма ўявіць жыццё.

У сварак ёсць свае законы, і гэтыя «кодэксы гонару» трэба спасцігаць самастойна. Сумесных канфліктаў з жонкай за ўвесь час адбывалася няшмат, але адзінае, што мы зразумелі — не трэба апускацца да ўзаемных абраз, а то часам пачуеш на вуліцы з вуснаў незнаёмай пары такія азначэнні, што вушы вянуць. Аж самому неяк соромна. А таксама лепш прыслухоўвацца да меркаванняў іншага. І паважаць яго думкі, нават калі не згодзен з імі.

А яшчэ трэба берагчы адно аднаго. І тады ўсе беды абмінуць сям'ю. Няхай у вас так і будзе!

Дзмітрый АЛЬФЕР.

P.S. *А каб зусім ужо цалкам даследаваць, з-за чаго можна пасварыцца, я засунуў свой цікаўны нос у сямейнае жыццё сваіх знаёмых і сяброў. Такім чынам,* ***ТОП-5 прычын сямейных скандалаў:***

5. Былая аднакурсніца Таня, працуе ў Баранавічах. *Тут без Фрэйда не абысціся:*

— З-за таго, што я нервуюся (часам ён хоча, каб я заўсёды ўсміхалася, інакш ён адчувае сваю віну).

4. Сяргей, літаратар, Мінск. *Прычына — знаўцы зразумеюць:*

— Мой дзед ловіць рыбу за 25 метраў ад хаты, і бабка заўсёды лаецца з ім з-за таго, што ёй даводзіцца насіць абеды на вадаём.

3. Калега Таццяна, бландзінка:

— Футбол па тэлебачанні (хакей, гульня ў камп'ютар, піва з сябрамі). Мужчына злуецца, што яму не даюць займацца любімай справай, а жанчына — не з-за футбола, а таму, што «ты зусім не звяртаеш на мяне ўвагі».

2. Паводле даных розных апытанняў, самая распаўсюджаная прычына для сварак:

— Чаму раніцай пасля таго як пачысціў зубы, люстэрка ў ванне засталося запырсканым?! Я ўжо стамілася з табой змагацца!..

1. Марыя Пятроўна з Мінска, у шлюбе 25 гадоў:

— Абсалютны лідар усіх сямейных скандалаў — вядома ж, яго тапачкі! Вось сёння раніцай (муж сыходзіць на працу раней) яны зноў стаялі на самым выхадзе з пакоя. Чвэрць стагоддзя жывеш з чалавекам і столькі ж натыкаешся на гэтыя тапачкі, якія ну абавязкова павінны стаяць там, дзе праходзіць галоўная траекторыя твайго перамяшчэння па кватэры. Вось і пачынаецца класічнае: колькі разоў я табе казала?! Далей усе ўсё ведаюць.

Беражы сваё!

Ясвіжскія матывы

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 659. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12